Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 23 (28639)

2 ЛЮТАГА 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



**Ад чаго пакутуюць балоты**
СТАР. 3



**Капітальны рамонт ці мадэрнізацыя?**
МС



**Якім будзе аграпарк у Гродне?**
МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Сёння прыватны сектар рэгіёна — гэта 32 тысячы зарэгістраваных юрыдычных і фізічных асоб. У дадзеных арганізацыях працуюць 127 тыс. чалавек — 37 % ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы. Гэта вялікі паказчык. Мы чакаем большай колькасці занятых у прыватным сектары, стварэння новых працоўных месцаў, павелічэння ўкладу ў сацыяльна-эканамічнае развіццё Гродзенскай вобласці. У любой развітой дзяржаве аснова эканомікі — малы і сярэдні бізнес, і мы зараз рухаемся ў гэтым агульным трэндзе. Але трэба памятаць, што з бізнесу не здымаецца і адказнасць за якаснае аказанне паслуг, вытворчасць канкурэнтаздольнага прадукту».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9756 ▼ |
| Еўра | 2,4507 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0351 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0709 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ!

### Асноўная частка беларускіх алімпійцаў адправілася ў Пхёнчхан




Фота БЕЛТА.

Да старту Гульняў-2018 застаецца роўна тыдзень. Напярэдадні ў Пхёнчхане адбылася цырымонія адкрыцця алімпійскай вёскі, у ёй прынялі ўдзел кіраўнік аргкамітэта Лі Хі Бом і прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Карэя Лі Кі Хын. Над алімпійскай вёскай былі паднятыя сцягі ўсіх краін — удзельніц Гульняў. СТАР. 3

■ Сацыяльная ініцыятыва

# «ПЕНСІЯ. НЕБА. САМАЛЁТ»

### Беларускія пенсіянеры змогуць падарожнічаць з маладымі валанцёрамі

**У большасці з нас у галаве сядзіць такі штамп: маўляў, еўрапейскія старыя падарожнічаюць і атрымліваюць асалоду ад жыцця, а ў нашых адна радасць — градкі. І гэта на самай справе падобна на праўду, нягледзячы на тое, што сёння магчымасць паглядзець свет ёсць практычна ў кожнага, у тым ліку і ў нашых пенсіянераў, галоўнае — мець такое жаданне і нічога не баяцца. «Усё гэта казкі! — паціснуць плячыма скептыкі. — А грошы? А як візу атрымаць? Як размаўляць, не ведаючы ніводнай замежнай мовы?» Маладая мінчанка Марыя Мунцян вырашыла даказаць, што ўсе гэтыя цяжкасці можна пераадолець — і стварыла сацыяльны праект па арганізацыі сумесных падарожжаў пенсіянераў і моладзі.** СТАР. 5




■ Нерухомасць

# БЮДЖЭТНЫЯ ЦЭННІКІ «ЗІМОВЫХ» ДАЧ

### Спецыялісты адзначаюць, што найменш кошт магчыма «злавіць» толькі ў міжсезонне



**У мінулыя гады эксперты рынку загараднага жылля раілі займацца пошукам такой нерухомасці выключна ў незімовы час. Бадай, раней такая парада была дарэчы: любыя недахопы нерухомасці схаваюцца пад снегам. Але сёлетняя еўразіма стабільным снегам і маразамі нас не цешыць. Так што на календары адно, а на дварэ — амаль вясна. Самы час гаварыць пра цэны на дачы, вырашылі мы і задалі адпаведныя пытанні начальніку аддзела «Дамы. Дачы. Катэджы» агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Алене АКУЛІЧ.**

***— Якая загарадная нерухомасць цяпер карыстаецца папулярнасцю ў пакупнікоў?***

— Існуе памылковае меркаванне, што попыт на загарадную нерухомасць (зямельныя ўчасткі, дачы і жылыя дамы) узнікае ў кліентаў толькі ў цёплы час года, і асабліва вясной і восенню. Але гэта не так. Попыт ёсць заўсёды, проста ў залежнасці ад сезона ён вагаецца па цалкам зразумелых прычынах — загарадныя аб'екты значна камфортней аглядаць, калі цёпла. У той жа час сваім кліентам мы рэкамендуем не чакаць прыходу цяпла, а пачынаць пошукі менавіта тады, калі прымаецца рашэнне аб неабходнасці набыцця.

Па-першае, таму, што ў халодную пару года выяўляюцца ўсе недахопы: дзесьці цячэ дах, дзесьці прамярзае або задзімае, дзесьці падтапляе і г. д. Калі зялёныя насаджэнні без лістоты, то і сам аб'ект успрымаецца больш аб'ектыўна. У той час як увесну і ўлетку эмоцыі ад квітнеючай прыроды могуць схаваць ад вачэй недахопы прапанаванага варыянта. СТАР. 4

# ДЗЕЛЯ ЗАКОННАСЦІ І БЯСПЕКІ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў дзве рабочыя сустрэчы з прадстаўнікамі праваахоўных структур. На іх была абмеркавана дзейнасць Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і Камітэта дзяржаўнай бяспекі.**

### Празрыстасць у расследаваннях

Кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да старшыні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэя Шведа, адзначыў, што ў апошні час цікавіўся расследаваннем розных крымінальных спраў. «Што граху таіць, у нас яшчэ грамадства такое, што страшных крымінальных спраў дастаткова. Я маю на ўвазе звязаных перш за ўсё з забойствамі людзей, згвалтаваннямі, здзекамі з людзей, ды і іншымі цяжкімі крымінальнымі справамі. І нашы судмедэксперты — гэта цэнтральныя людзі пры расследаванні такіх крымінальных спраў. У вас на ўзбраенні самая сучасная тэхніка», — заўважыў Прэзідэнт.

Беларускі лідар падзякаваў за тое, што ў свой час была аператыўна расследавана справа на выбуху ў метро. Пры гэтым ён нагадаў, што эксперты павінны быць сумленнымі. «Не дай бог нам памыліцца пры высвятленні абставін. А яшчэ горш — сфальсіфікаваць экспертызу. Гэта катастрофа. Мы зараз удзелім гэтаму асаблівую ўвагу, кантралюючы работу вашага ведамства».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, як сам меў непасрэднае дачыненне да раскрыцця забойства, якое адбылося некалькі гадоў таму. Да Прэзідэнта звярнуўся бацька забітай дачкі з Магілёўскай вобласці. «Я папрасіў яго даслаць усе матэрыялы, якія ў яго на руках, — тлумачыць кіраўнік дзяржавы. — Ён мне даслаў. Я сеў і сам за суткі вывучыў. І даў каманду пракурору і старшыні КДБ, чаго б ні каштавала, расследаваць гэту крымінальную справу. Нягодніка знайшлі ў Расіі, прывезлі ў Мінск, распачалі зноў крымінальную справу, пачалі расследаваць. Прытым я кантраляваў увесь гэты працэс. І аказалася, што ён забойца, а яго фактычна апраўдалі». Прэзідэнт адзначыў, што цяпер знойдуць тых, хто вёў следства, хто вынесіў апраўдальны прысуд, бок абвінавачання і спагоняць з іх.

Штогод Дзяржаўным камітэтам выконваецца больш за 340 тысяч судовых экспертыз і даследаванняў. Дарэчы, у разы павысілася эфектыўнасць базы ДНК — у выніку летась гэта паспрыяла раскрыццю 2,2 тысячы злачынстваў. Акрамя таго, на сустрэчы з Прэзідэнтам абмеркавалі прапанову зрабіць 22 красавіка прафесійным святам — Днём судовага эксперта. Менавіта ў гэты дзень пяць гадоў таму Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб стварэнні ведамства.

### «Народ цярпець карупцыю не будзе»

На гэта Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на сустрэчы са старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерыем Вакульчыкам. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў за плённую працу ў гэтым кірунку. «Карупцыя — гэта страшная ржа, супраць якой трэба змагацца. Вельмі шкада, што некаторыя ведамствы, якія гэтым займаюцца, не выйшлі на ваш узровень. Але гэта ўжо маё пытанне. Я ўжо дацягну іх да ўзроўню эфектыўнай барацьбы, як у вас гэта функцыянуе, — падкрэсліў беларускі лідар і дадаў: — Вы працуеце і з пракуратурай, МУС, Следчым камітэтам, але ўсё-такі ў вас гэтая праца ідзе больш сумлення, з вамі не дамовішся. З вамі ні адзін злачынец — я так мяркую — не дамовіцца».

Беларускі лідар закрануў і тэму назвы ведамства. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што многія крытыкуюць тое, што захавалася старая назва КДБ. Але саромецца няма чаго: «Мы былі часткай сістэмы, і тым не менш бязладдзя у нас у Беларусі заўсёды было менш». На думку Прэзідэнта, Камітэт дзяржаўнай бяспекі — гэта зараз самая дакладная назва. Да таго ж вельмі важная лінія дзейнасці ведамства — разведка і контрразведка. «Гэта самыя важныя напрамкі дзейнасці Камітэта дзяржбяспекі. Вельмі востра стаіць сёння пытанне барацьбы з тэрарызмам — найважнейшы напрамак процідзеяння». Да таго ж дзяржаўная бяспека для Беларусі — эканамічная бяспека. Асноўны дзеяч у гэтай галіне — Камітэт дзяржкантролю, але КДБ таксама ўдзяляе ўвагу гэтаму кірунку.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Вынікі і задачы

# ТРАНСФАРМАВАЦЬ ТЭРАПЕЎТА,

## зменшыць кошты на лекі і зрабіць дыягностыку цалкам бясплатнай для вяскоўцаў

### Шэраг задач у гэтым годзе ставіць Міністэрства аховы здароўя

**Працягласць жыцця ў Беларусі складае заraз 74,3 года. З такім паказчыкам наша краіна годна выглядае на фоне як еўрапейскіх краін, так і краін СНД.**

Пра гэта заявіў **міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА**, падводзячы вынікі работы галіны на выніковым пасяджэнні калегіі міністэрства. Ён адзначыў, што летась асноўныя мэтавыя паказчыкі выкананы, індыкатары дзяржаўных праграм і сацыяльныя стандарты дасягнуты.

— Мы здолелі захаваць на мінімальным узроўні дзіцячую смяротнасць і смяротнасць дзяцей да 5 гадоў, — адзначыў Валерый Малашка. — І гэта вельмі важны паказчык — як дзейнасці сістэмы аховы здароўя ў цэлым, так і эфектыўнасці асобных сацыяльных праграм, якія працуюць у нашай дзяржаве. Адной з праблем з'яўляецца значнае падзенне нараджальнасці. Апошнія дзесяць гадоў, дзякуючы сацыяльнай падтрымцы, удавалася захоўваць яе на неблагім узроўні, нягледзячы на скарачэнне колькасці жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту. Цяпер іх колькасць упала да гістарычнага з 1991 года мінімуму, што істотна паўплывала на нараджальнасць. У 2017 годзе дзяцей на свет з'явілася на 15 тысяч менш. У наступным годзе будзем вырашаць шэраг задач у гэтым кірунку, у тым ліку актывізуем перадабортнае кансультаванне і працу па планаванні сям'і, а таксама будзем прымаць шэраг рашэнняў па экстракарпаральным апладненні. У прыватнасці, будзем разглядаць, як зрабіць такія тэхналогіі для сем'яў больш фінансава даступнымі.

Сярод задач на гэты год Валерый Малашка вылучыў рэфармаванне пярвічнага звяна сістэмы аховы здароўя. Роля ўрача-тэрапеўта будзе паступова пашырацца.

— Мы ставім задачу да 2020 года трансфармаваць тэрапеўта ва ўрача агульнай практыкі, — расказаў міністр. — Ён будзе цэнтральнай фігурай сістэмы аховы здароўя. У яго з'явяцца і дадатковыя паўнамоцтвы, істотна зменіцца і нагрузка. Урач будзе працаваць у камандзе. Будзе ўведзена такая штатная адзінка, як памочнік урача. Такім чынам, урач, памочнік і медыцынская сястра змогуць забяспечваць працу першаснага звяна. Зменіцца аснашчэнне кабінета ўрача, яго дапоўніць дадатковы набор медыцынскага абсталявання, што дапаможа персаналу быць кампетэнтным у некаторых вузкіх медыцынскіх спецыяльнасцях.

Ужо ў 2018-м характэрнай асаблівасцю першаснай медыцынскай дапамогі стане спалучэнне лячэбнай і прафілактычнай працы — дыспансерызацыі і скрынінгавых праграм па анкалагічных хваробах. У адной з паліклінік быў праведзены хранаметраж, які пацвердзіў прычыны страты часу пацыентам. Найперш гэта адсутнасць аптымальнага маршруту для праведзення ўсяго комплексу неабходных медыцынскіх мерапрыемстваў. Акрамя таго, што ў бягучым годзе ва ўстановах папрацуюць над стварэннем такіх маршрутаў, таксама разглядзець пытанне аб арганізацыі на прадпрыемствах адзінага дня дыспансерызацыі. Плануецца стварыць цэласную сістэму праведзення скрынінгу ў рэгіёнах. Кіраўнікі ўсіх узроўняў сумесна з РНПЦ анкалогіі пачнуць арганізацыю скрынінгавых цэнтраў на базе міжраённых дыспансераў і буйных устаноў.

Асаблівая ўвага ў 2018-м будзе ўдзяляцца даступнасці дыягнастычных паслуг для сельскага насельніцтва. Платныя паслугі для такой катэгорыі грамадзян павінны стаць выключэннем. Не плануецца ўводзіць дадатковую плату за медыцынскую дапамогу і тым, хто не працуе.

— У Беларусі павінен быць забяспечаны роўны доступ усіх грамадзян да атрымання медыцынскай дапамогі, — падкрэсліў Валерый Малашка, адказваючы на пытанне пра магчымае поўнае пакрыццё выдаткаў працаздольнымі грамадзянамі, якія не працуюць. — Гэта і задача сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы, і даручэнне Прэзідэнта. Таму гутаркі пра пакрыццё выдаткаў ніколі не вялося.

Шэраг задач на бягучы год ставіць перад сабой Міністэрства аховы здароўя ў напрамку развіцця нацыянальнай фармацэўтычнай прамысловасці — у прыватнасці, забеспячэння поўнага кантролю за сістэмай абароту лекавых сродкаў. Заданні ліквідавання пасярэдніцкаў, зніжэння кошту лекавых прэпаратаў пастаўлены ў тым ліку і перад недзяржаўнымі ўстановамі, якіх сёння дастаткова на айчынным фармацэўтычным рынку.

— На працягу першага паўгоддзя мы павінны выпрацаваць тыя механізмы, якія знізяць фінансавую нагрузку на спажыўца, — падкрэсліў міністр. — У другой палове мінулага года мы выдзелілі групу з 200 лекавых прэпаратаў, цэны на якія былі вышэйшыя ў параўнанні з суседнімі краінамі. І на 117 прэпаратаў цэны ўжо зніжаныя: нам удалося дасягнуць дамоўленасці з пастаўшчыкамі. Сёння яны ёсць у аптэчнай сетцы, і спажыўцы адчулі, што гэтыя лекі сталі таннейшыя.

Міністр падкрэсліў, што абсалютна выключыць пасрэдніцтва не ўдасца, бо гэта можа прывесці да лекавага голаду ў аптэках. Спажывец у праве выбіраць з прадстаўленай лінейкі прэпарат як айчынны, так і замежнай вытворчасці.

Валерый Малашка падкрэсліў, што летась экспарт медыцынскіх паслуг склаў 43 мільёны долараў. Нядрэнна папрацавалі на экспарт і медыцынскія адукацыйныя ўстановы, якія дадалі ў бюджэт яшчэ каля 20 мільёнаў долараў.

**Алена КРАВЕЦ** ■

## РАСКАЗАЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ

**Традыцыйныя прамыя лініі пройдуць па ўсёй краіне ў суботу, 3 лютага. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах. Вынік — аператыўнае вырашэнне надзённых праблем. Дарэчы, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.**

Прамыя лініі, як заўсёды, будуць працаваць з 9 раніцы да поўдня, на званкі адкажуць:

наместнік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

наместнік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Віктар Віталевіч АСКЕРКА. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблсавета дэпутатаў Алег Леанідавіч БАРЫСЕНКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы наместнік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы наместнік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы наместнік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;

наместнік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЕЎРАСАЮЗ РАСПАЧАЎ НОВУЮ МІГРАЦЫЙНУЮ АПЕРАЦЫЮ Ў МІЖЗЕМНАМОР'І

Еўрасаюз запусціў новую аперацыю «Феміда» па супрацьдзеянні нелегальнай міграцыі і выратаванні людзей. Яна змяніла аперацыю «Трытон», якая дзейнічала з 2014 года, паведаміла прадстаўнік Еўракамісіі па ўнутраных справах і міграцыі Наташа Берта. Яна адзначыла, што «Феміда» закліканая змяніць аператыўны план міграцыйнай аперацыі па запыце італьянскіх улад. Паводле інфармацыі Frontex, аперацыя будзе не толькі ўключаць выратавальны кампанент, але і ажыццяўляць праваахоўныя функцыі. Акрамя таго, «Феміда» будзе займацца зборам даных аб перамяшчэнні замежных баевікоў і іншых тэрарыстычных пагрозах на знешніх межах ЕС.

### У АРГЕНЦІНЕ СВАЯКАМ НАЙВЫШЭЙШЫХ ЧЫНОЎНІКАЎ ЗАБАРАНІЛІ ПРАЦАВАЦЬ НА ДЗЯРЖСЛУЖБЕ

У Аргенціне ўступіла ў сілу забарона для высокапастаўленых чыноўнікаў прызначаць сваякоў на дзяржаўныя пасады. Дакумент, падпісаны прэзідэнтам Маўрысіа Макра і апублікаваны ў афіцыйным выданні ўрада, вызначае, што апошнім тэрмінам для сыходу з пасад для такіх людзей з'яўляецца 28 лютага. Новая норма забараняе на любых падставах прымаць на працу ў дзяржсектары любых людзей, якія маюць родныя сувязі — як прамыя, так і непрамыя, аж да другой ступені сваяцтва, — з прэзідэнтам і віцэ-прэзідэнтам краіны, кіраўніком урада, міністрамі і іншымі кіраўнікамі ведамстваў. Гэтая забарона распаўсюджваецца таксама на тых, хто жыве ў грамадзянскім саюзе. Па даных канала Telesur, ужо падалі заявы аб сыходзе са сваіх пастоў на дзяржслужбе сёстры міністра працы Хорхэ Трыякі, брат кіраўніка кабінета міністраў Маркаса Пены і сын міністра бяспекі Патрысіі Булрыч.

### У ЯПОНІІ Ў ВЫНІКУ ПАЖАРУ Ў ДОМЕ САСТАРЭЛЫХ ЗАГІНУЛІ 11 ЧАЛАВЕК

Буйны пажар адбыўся ў доме для састарэлых людзей у горадзе Сапара на паўночным японскім востраве Хакайда, загінулі не менш за 11 чалавек. Да месца здарэння былі накіраваны 40 пажарных разлікаў, але пазбегнуць трагедыі не ўдалося. У будынку пражывалі 16 чалавек. Усе жыхары былі пажылыя і атрымлівалі сацыяльную дапамогу для малазабяспечаных грамадзян. Ратавальнікам удалося вывесці пяць чалавек — трох мужчын і дзвюх жанчын — ва ўзросце ад 50 да 80 гадоў. Яшчэ 11 чалавек — восем мужчын і тры жанчыны — загінулі.

### КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ТУРЦЫІ ПЕРАВЫСІЛА 80 МІЛЬЁНАЎ ЧАЛАВЕК



Колькасць насельніцтва Турцыі ў 2017 годзе склала 80,81 мільёна чалавек, адзначаецца ў паведамленні Інстытута статыстыкі краіны (TUIK). Колькасць грамадзян Турцыі павялічылася больш чым на 995 тысяч чалавек у параўнанні з 2016 годам. 50,2 % насельніцтва Турцыі складаюць мужчыны (40,54 мільёна), 49,8 % — жанчыны (40,3 мільёна). Доля гарадскога насельніцтва ўзрасла да 92,5 %. У 2016 годзе тэмпы прыросту насельніцтва Турцыі склалі 13,5 %, летась яны скараціліся да 12,4 %.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне родным і блізкім былога начальніка ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ВОБЛІКАВА Аляксандра Аляксандравіча ў сувязі з яго смерцю.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога начальніка ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ВОБЛІКАВА Аляксандра Аляксандравіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

# СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ!


Фота БЕЛТА.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

**Прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах** адзначыў, што алімпійская вёска ў Пхёнчхане — адна з найлепшых, калі не найлепшая ў гісторыі Алімпійскіх гульняў. *«Гэта не толькі месца, дзе будуць жыць спартсмены, гэта месца, дзе яны могуць адчуць дух Алімпійскіх гульняў, знайсці сяброў»*, — заявіў Бах на адкрыцці.

Большасць нашых спартсменаў ужо там, першымі з алімпійцаў у вёсцы з'явіліся біятланісты. Учора ў Паўднёвую Карэю адправіўся гарналыжнік Юрый Данілачкін, канькабежцы, каманда па лыжных гонках у поўным складзе, прадстаўнік шорт-трэка — Максім Сяргееў, а таксама трэнерскі склад, адміністрацыйная і медыцынская групы. Гарналыжніца Марыя Шканава адправіцца ў алімпійскі Пхёнчхан з Аўстрыі, дзе цяпер праводзіць трэніроўкі. Апошнімі ў вёску прыбудуць фрыстайлісты, якія да 8 лютага рыхтуюцца да стартаў у японскім горадзе Біфук.

Адзначым, што нашы спецыялісты таксама ўжо завяршылі падрыхтоўку медыцынскага блока, які знаходзіцца ў Алімпійскай вёсцы. Ён займае тры прасторныя пакоі, з тым каб члены беларускай дэлегацыі змогуць аператыўна атрымліваць неабходныя кансультацыі, фізіятэрапеўтычныя працэдуры, масаж, а таксама псіхалагічную дапамогу. *«Па вопыце ведаю, падчас Алімпіяды спартсмены нярэдка звяртаюцца да нашых спецыялістаў. І не толькі таму што дзесьці кальнула, але і для прафілактыкі захворванняў, а таксама для аднаўлення пасля фізічных нагрузак. Прыходзяць і для таго, каб проста расслабіцца, адарвацца ад трывожных думак, пачытаць, пагаварыць па душах — для гэтага ў складзе групы ёсць псіхолаг»*, — расказаў **кіраўнік медыцынскай групы, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту Генадзь ЗАГАРОДНЫ.**

На калегіі Міністэрства спорту і турызму, якая прайшла на гэтым тыдні, **кіраўнік ведамства Аляксандр ШАМКО** адзначыў, што беларусам у камандным заліку па сілах увайсці ў лік 25 лепшых краін на зімовай Алімпіядзе і Параалімпіядзе ў Пхёнчхане. Міністр падкрэсліў, што праграма падрыхтоўкі да галоўных стартаў зімовага сезона была цалкам выкананая і цяпер слова за атлетамі і іх трэнерамі. Галоўныя надзеі беларускіх балельшчыкаў звязаны з выступленнем біятланістаў і майстроў лыжнай акрабатыкі, ёсць нядрэнныя перспектывы і ў прадстаўнікоў канькабежнага спорту.

Чакаецца, што ў Пхёнчхан прыбудзе 2943 спартсмены з 92 краін, што з'яўляецца самай вялікай колькасцю атлетаў у гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў. Раней рэкорд быў усталяваны ў Сочы — 2800 спартсменаў з 88 краін свету.

Нагадаем, што ў Пхёнчхане ўпершыню будуць уключаны ў праграму Алімпійскіх гульняў спаборніцтвы па сноўбордзе ў катэгорыі біг-эйр, мас-старт у канькабежным спорце, камандныя спаборніцтвы ў гарналыжным спорце і дабл-мікст у кёрлінгу. Усяго будзе разыграна 102 камплекты медалёў, што таксама з'яўляецца рэкордам.

Арганізатары адзначылі, што ўжо рэалізавана каля 74 % білетаў на спаборніцтвы Гульняў, у продажы засталося 278 тысяч з 1,07 мільёна, у тым ліку білеты на ўрачыстую цырымонію адкрыцця. Пры гэтым на спаборніцтвы першых трох дзён Алімпіяды прададзена амаль 80 % білетаў.

Раней Нацыянальны алімпійскі камітэт Карэі паведаміў, што амаль цалкам распрададзены ўсе месцы на спаборніцтвы фігурыстаў (мужчынскае адзіночнае катанне), па кёрлінгу і матчы з удзелам аб'яднанай жаночай хакейнай каманды КНДР і Рэспублікі Карэя.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## Надвор'е

# Зіма яшчэ вернецца...

**У нядзелю па паўднёвым усходзе краіны чакаецца месцамі моцны мокры снег, а ў панядзелак падмарозіць**

**У першыя лютаўскія дні прырода працягвала дэманстраваць свой капрызны нораў, але ўжо на наступным тыдні цёплае з ападкамі надвор'е зменіцца пахаладаннем. І ў Беларусі ўсталюецца зімовы характар надвор'я, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца мокры снег і дождж, месцамі магчымы слабыя туман і галалёд. Максімальная тэмпература паветра будзе ад нуля да плюс 5 градусаў. І ў суботу захаваецца цёплае з ападкамі надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць мокры снег і дождж. У асобных раёнах чакаецца галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў па поўначы да плюс 3 градусаў па поўдні, удзень прагназуецца ад 3 марозу да 3 цяпла.

У нядзелю тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам цыклону, што перамяшчаецца праз паўднёва-ўсходнія раёны, у тыл якому пачне паступаць халодная паветраная маса са Скандынавіі. На большай частцы Беларусі пройдзе кароткачасовы снег, месцамі ён будзе суправаджацца моцным парывістым ветрам. Па паўднёвым усходзе краіны пад уплывам актыўных атмасферных франтоў цыклону чакаюцца працяглыя ападкі (мокры снег, дождж), месцамі моцны мокры снег, наліпанне мокрага снегу, галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 1—7 марозу, толькі па паўднёвым усходзе краіны будзе ад нуля да плюс 3.

Але ў панядзелак пачнецца пахаладанне. У асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 2—8 марозу, па поўначы краіны будзе да мінус 10 градусаў (уначы пры праясненнях па паўночным усходзе краіны паветра астудзіцца да мінус 14 градусаў).

**Сяргей КУРКАЧ**

## Новыя кнігі

# БІБЛІЯТЭКА ПРА НАШЫХ СУЧАСНІКАЎ

У пярэдадзень XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, якая будзе працаваць з 28 лютага па 4 сакавіка ў беларускай сталіцы па праспекце Пераможцаў, 14, выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» зрабіла выдатны падарунак чытачам. Выйшла чарговая кніга ў серыі «Асобы».




Гэтым разам зборнік прысвечаны афіцэру-«афганцу» Уладзіміру Гаркаваму. Пад адной вокладкай — аповесць Уладзіміра Гаркавага «Афганістан: без грыфа «сакрэтна» і нарысы, выказванні калег, знаёмых савецкага разведчыка і нашага земляка, які ўжо ў мірным жыцці стаў паспяховым банкірам. У прадмове да кнігі дырэктар «Адукацыі і выхавання» Мікалай Супрановіч піша: «Асобай прынята называць чалавека, унутраныя якасці і ўчынкі якога робяць яго вартым павагі многіх людзей. Гэта, як правіла, чалавек унутрана моцны, глыбокі, з багатым духоўным светам, чалавек, які ўмее спачуваць і суперажываць, надзелены многімі талентамі, чалавек, які здольны быць паспяховым...» Усе гэтыя словы датычацца героя кнігі «Уладзімір Гаркавы: жыццё і лёс разведчыка». Не будзем пераказваць яе змест. Заўважым адно: праз аповеды самога Уладзіміра Гаркавага і праз выказванні розных знакамітых, вядомых нашых суайчыннікаў паўстае чалавек неардынарны, дзеяздольны. Тым кніга і цікавая, што літаральна кожная з яе старонак становіцца прадметам сур'ёзных разваг, прадметам захаплення ад таго, што ёсць сярод сучаснікаў годныя людзі, чый жыццёвы прыклад варты пераймання. Тым самым кніга павінна быць цікавая моладзі.

Некалькі слоў пра кніжную серыю «Асобы», заснавальнікамі якой у свой час выступілі Мікалай Супрановіч і Уладзімір Ліпскі. Усяго пабачыла свет шэсць кніг-біяграфій, прысвечаных вядомым людзям Беларусі. Сярод герояў серыі — акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Віктар Парфёнаў, лідары аграрнага сектара нашай краіны Аляксей Скакун, Рыгор Бабчонак, двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Пётр Клімук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь пісьменнік Уладзімір Ліпскі. Відавочна, што такая своеасаблівая бібліятэка будзе мець працяг. Ужо сёння можна смела гаварыць пра тое, што без кніг такога кшталту не абыйсціся ў арганізацыі выхаваўчай работы ў агульнаадукацыйнай школе. І сярод нашых сучаснікаў ёсць з каго браць прыклад.

**Сяргей ШЫЧКО.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Прыродныя рэсурсы

# БАГНА ПРАБЛЕМ

**Ад чаго пакутуюць беларускія балоты і як з дапамогай міжнародных праектаў атрымліваецца аднавіць іх натуральны стан**

**Беларусь ужо шмат гадоў трымае планку адной з найбагацейшых краін Еўропы на рэсурсы водна-балотных угоддзяў. Нягледзячы на маштабную асушальную меліярацыю ў другой палове XX ст., у нашай краіне ўдалося захаваць у натуральным стане 863 тыс. га балот (агульная плошча тарфянікаў складае 2,39 млн га). Беларускія адкрытыя нізінныя балоты і моцна абводненыя поймы раўнінных рэк — найбуйнейшыя ў Еўропе. Яны ж з'яўляюцца важным рэгіёнам для захавання рэдкіх відаў жывёл і раслін.**

Сёння для захавання і аднаўлення водна-балотных угоддзяў краіны працуюць вучоныя, спецыялісты прыродаахоўнай галіны, а таксама міжнародныя партнёры.

— Наша краіна далучылася да Канвенцыі аб водна-балотных угоддзях, якія маюць міжнароднае значэнне галоўным чынам у якасці месца пражывання вадаплаўных птушак, — Рамсарскай канвенцыі, у 1999 годзе. За гэты час 26 водна-балотных угоддзяў Беларусі (іх агульная плошча — 778,9 тыс. га) былі ўключаны ў спіс водна-балотных угоддзяў міжнароднага значэння, — расказаў **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Сёння большая частка рамсарскіх угоддзяў аб'яўлена асаблiва ахоўнымі прыроднымі тэрыторыямі ці з'яўляецца прыроднымі тэрыторыямі, якія падлягаюць спецыяльнай ахове і на якіх устаноўлены рэжымы аховы і выкарыстання.

Сёлета пачнецца распрацоўка праекта закона «Аб ахове і выкарыстанні балот (тарфянікаў)», а ў 2019 годзе плануецца атрымаць закончаны нарматыўны дакумент.

**Загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і суправаджэння прыродаахоўных канвенцый НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Аляксандр КАЗУЛІН** адзначыў, што розныя нормы, якія датычацца балот, прапісаны ў розных заканадаўчых актах, трэба аб'яднаць у адзін дакумент і выключыць супярэчнасці, што сустракаюцца. «Магчыма, гэта першы закон аб балотах у свеце», — заўважыў вучоны.

Па словах Аляксандра Казуліна, за апошнія гады спецыялісты падышлі да вырашэння праблемы зарастання нізінных балот трыснягом і хмызнякамі. Была распрацавана тэхналогія ўстойлівага выкарыстання біямасы на нізінных балотах, у межах міжнародных праектаў закуплена спецыялізаваная тэхніка. Добрыя вынікі рэалізаваных праектаў даюць падставу больш шырока прымяняць распрацаваныя тэхналогіі. Усё гэта, спадзяецца вучоны, дапаможа захаваць унікальныя нізінныя балоты Палесся, а разам з імі і рэдкія водна-балотныя віды жывёл і раслін.

Наступныя па чарзе — пойменныя лугі, якія таксама актыўна зарастаюць хмызнякамі. Асабліва пакутуе ад гэтага пойма Прыпяці. Некалі самыя прадуктыўныя лугі і самая рыбная рака Еўропы сёння здаюць свае пазіцыі. Шматгадовая расліннасць назапашваецца ў рацэ, што пагаршае ўмовы для нерасту рыбы, змяншаецца колькасць насякомых і вадаплаўных птушак.

НПЦ па біярэсурсах пры падтрымцы ПРААН/ГЭФ плануе ажыццявіць пілотны праект сумесна з ААТ «Тураўшчына» па ўзнаўленні пойменных лугоў каля вёскі Пагост і Тураўскага луга (Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці). Там плануецца разводзіць мясную жывёлу, выпас якой на гэтых тэрыторыях (вызваленых ад кустоўя) будзе праходзіць па спецыяльным графіку.

— Мы хочам паказаць, як гэтыя тэрыторыі можна ўстойліва выкарыстоўваць, — падкрэсліў вучоны.

Пакуль нявырашанай застаецца праблема дэградацыі азёрных экасістэм. Многія беларускія вадаёмы сёння зарастаюць расліннасцю, пагаршаецца кармавая база для рыб, парушаецца відавы склад іхтыяфаўны.

Па словах Аляксандра Казуліна, адна з прычын гэтай сітуацыі — засілле ў беларускіх вадаёмах такіх рыб, як лешч і карп (апошні трапляе ў азёры праз зарыбленне). Гэтыя рыбы выядаюць увесь корм і запускаюць незваротныя працэсы забалочвання.

Каб вырашыць гэтыя праблемы, у НАН Беларусі плануюць пры падтрымцы Глабальнага экалагічнага фонду распрацаваць і выпрабаваць на некалькіх азёрах тэхналогіі іх выратавання.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛЮТЫМ

| | |
|---|---|
| 3, субота, 9.00 – 23.30 | 16, пятніца, 0.00 – 4.30 |
| 5, панядзелак, 19.30 – 24.00 | 17, субота, 23.30 – 24.00 |
| 6, аўторак, 0.00 – 6.00 | 18, нядзеля, 0.00 – 14.00 |
| 8, чацвер, 8.30 – 16.00 | 20, аўторак, 13.00 – 20.30 |
| 10, субота, 19.00 – 24.00 | 22, чацвер, 12.30 – 24.00 |
| 11, нядзеля, 0.00 – 4.30 | 24, субота, 22.00 – 24.00 |
| 13, аўторак, 7.30 – 17.00 | 25, нядзеля, 0.00 – 5.00 |
| 15, чацвер, 22.30 – 24.00 | 26, панядзелак, 23.00 – 24.00 |
| | 27, аўторак, 0.00 – 6.30 |

# БЮДЖЭТНЫЯ ЦЭННІКІ «ЗІМОВЫХ» ДАЧ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




Па-другое, нягледзячы на стабільны попыт на загарадную нерухомасць, цяпер прапанова на продаж значна пераўвышае колькасць пакупнікоў. І для таго каб выбраць прыдатны варыянт, неабходна шмат часу. Асабліва калі пошукамі займаецеся самастойна. Гэта пры пошуку кватэр усе варыянты можна паглядзець за адзін-два дні, а загарадныя аб'екты знаходзяцца на адлегласці ад горада і шляхі да іх не супадаюць. Нярэдка да нас па дапамогу звяртаюцца пакупнікі, якія за некалькі гадоў так і не змаглі знайсці прыдатнага варыянта і ўжо стаміліся ад безвыніковых пошукаў. Але і па здзелках, якія суправаджаюцца нашым агенцтвам, сярэдні тэрмін продажу/куплі складае парадку 45—60 дзён.

***— Можа, зімой шукаюць нешта асаблівае, супертаннае ці, наадварот, — элітнае?***

— Казаць пра змены сезонных прыярытэтаў у пакупнікоў не даводзіцца, бо структура здзелак непасрэдна залежыць ад структуры прапановы — г. зн. таго, з чаго выбіраюць пакупнікі ў той ці іншы перыяд часу.

Набываюць зусім розныя па якасці і фармаце аб'екты: ад маленькіх шчытавых домікаў на чатырох сотках (ад 5 тысяч долараў) да прасторных асабнякоў з акультуранай зонай рэкрэацыі ў асяроддзі. Сёння ёсць вельмі цікавы аб'ект — сядзібны комплекс з некалькіх дамоў, асноўнага і двух гасцявых для пражывання вялікай сям'і і вядзення сямейнага бізнесу. Тут цэны, вядома, нямалыя.

**Маленькія шчытавыя домікі на чатырох сотках зямлі зімой можна адшукаць пад Мінскам за 5 тысяч долараў.**

Ці, напрыклад, у спецыяльную групу можна вылучыць жылыя дамы і капітальныя дачы, якія набываюць у якасці альтэрнатывы асобнаму пакою ці кватэры ў Мінску. Кошт падобных аб'ектаў стартуе ад 15—20 тысяч долараў.

Так, у найбліжэйшым прыгарадзе Мінска для прадаўцоў аднапакаёвай кватэры ў сталіцы прапануецца пераезд з пашырэннем жылой плошчы без даплаты ў населены пункт з выдатна развітой інфраструктурай (па гарадскім тыпе), ёсць магчымасць дабудоўвання і прыбудовы. Усе выгады, прысядзібны ўчастак з магчымасцю вядзення падсобнай гаспадаркі.

Таксама асобнай катэгорыяй пакупнікоў запатрабаваныя дамы пад рэстаўрацыю або зусім пад знос і будаўніцтва на ўчастку новага дома. Але самымі запатрабаванымі ў апошнія гады былі гатовыя да пражывання жылыя дамы, катэджы і таўнхаусы.

**Актуальныя цэны за $м^2$ у загараднай нерухомасці — снежань 2017**

- **Лагойскі напрамак — $870\ \$/м^2$**
- **Ракаўскі напрамак — $668\ \$/м^2$**
- **Маладзечанскі напрамак — $585\ \$/ ^2$**
- **Мядзельскі напрамак — $652\ \$/м^2$**
- **Магілёўскі напрамак — $576\ \$/м^2$**
- **Слуцкі напрамак — $513\ \$/м^2$**
- **Маскоўскі напрамак — $565\ \$/м^2$**
- **Брэсцкі напрамак — $591\ \$/м^2$**
- **Пухавіцкі напрамак — $428\ \$/м^2$**

Калі казаць пра кошты на загарадную нерухомасць у цэлым, то яны залежаць ад наступных асноўных фактараў:

— фармат і якасць дома;

— аддаленасць ад МКАД;

— плошча ўчастка.

Да прыватных фактараў, якія ўплываюць на цэнаўтварэнне, можна аднесці зручнасць пад'язных шляхоў, блізкасць трасы, даступнасць грамадскага транспарту і г. д. Па аддаленасці ад Мінска найбольш запатрабаваная 50-кіламетровая зона. Чым бліжэй да Мінска, тым большая цана.

***— Як змяніліся цэны за апошні час? Ці ёсць бюджэтныя домікі, недарагія катэджы?***

— Апошні пік цэн на загарадную нерухомасць назіраўся ў перыяд з 2006 года па 2009-ы. У наступныя гады яны пакрысе, але зніжаліся. Гэта наглядна відаць не па цэнах прапановы, а па кошце рэальных здзелак, які ў працэсе гандлю з кожным годам становіцца ўсё ніжэйшым. Таму прадаўцам мы паказваем цэны рэальных здзелак і раім кіравацца менавіта імі пры вызначэнні пачатковага кошту. У адваротным выпадку продаж можа зацягнуцца на вельмі доўгі час.

Асноўная прычына зніжэння цэн — у пастаянным павелічэнні прапановы на фоне зніжэння попыту. А попыт зніжаецца ў выніку таго, што цяперашняе пакаленне патэнцыйных пакупнікоў замест загараднага адпачынку аддае перавагу адпачынку за мяжой, а замест доміка ў вёсцы — кватэры ў асяроддзі сацыяльнай інфраструктуры.

Калі да дачнага доміка не прад'яўляецца патрабаванняў прыдатнасці да круглагадовага пражывання, то цалкам рэальна набыць невялікую акуратную дачу на ўчастку плошчай 4-5 сотак за 5-8 тысяч долараў. І ўсё гэта ў межах Мінскага рэгіёна — да 50 кіламетраў ад МКАД.

***— Ці мэтазгодна менавіта цяпер шукаць сабе загараднае жыллё? Можа, яно вясной патаннее? Вашы прагнозы па цэнах, па колькасці прапаноў?***

— Увесну, магчыма, аб'ём прапановы стане крыху шырэйшым, але не істотна, бо ў сітуацыі канкурэнцыі прадаўцы, не прадаўшы аб'ект у цёплы час года, ужо не здымаюць на зіму яго з продажу. Магчыма, некаторыя з прадаўцоў дагэтуль лічаць, што вясной і летам шанцаў на продаж у іх больш, і разлічваюць так павялічыць кошт, — але па факце ўзнікшую цэну яны толькі адсунуць продаж да таго часу, пакуль цана не апусціцца да рынкавай. У адрозненне ад кватэр, па аб'ектах загараднай нерухомасці вывесці сярэднюю цану немагчыма, таму што ўсе яны індывідуальныя і адрозніваюцца па вялікай колькасці паказчыкаў. Таму пры вызначэнні пачатковай цаны неабходна адштурхоўвацца ад рэальнага кошту здзелак па аналагічных аб'ектах.

***— Ці паўплываюць танныя крэдыты на цэны гэтай нерухомасці?***

— Крэдыты дапамогуць цэнам запаволіць зніжэнне і нават на пэўны час стабілізавацца на адным узроўні. Але не больш за тое. І вядома, пра рост кошту гаворка не ідзе, паколькі дысбаланс паміж прапановай і попытам занадта вялікі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Падрабязнасці

# ГРОШЫ ВЕРНУЦЬ НА ПРАЦЯГУ МЕСЯЦА З ДНЯ ПАДАЧЫ ЗАЯВЫ

**Дэкрэтам № 1 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» прадугледжана вызваленне плацельшчыкаў збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў ад выплаты гэтага збору. Вяртанне збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў грамадзянам будзе ажыццяўляцца на падставе іх заяў у парадку, установленым заканадаўствам, паведамілі ва Упраўленні перспектыўнага развіцця і інфармацыйнай адкрытасці Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.**

Згодна з інфармацыяй падатковага ведамства, такую заяву ў сваю падатковую інспекцыю павінен падаць сам плацельшчык збору, прадставіўшы пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу грамадзяніна. Падача заявы можа быць таксама ажыццёўлена прадстаўніком зацікаўленай асобы, які дзейнічае на падставе даверанасці, афармленай ва ўстаноўленым парадку.

Вяртанне збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў ажыццяўляецца адным з двух спосабаў, якія называюцца ў заяве:

— на рахунак у беларускім банку (пры ўмове пазначэння рэквізітаў бягучага (разліковага) ці іншага банкаўскага рахунку: нумар і тып рахунку, найменне банка, код банка, код валюты);

— наяўнымі грашовымі сродкамі з касы адасобленага (структурнага) падраздзялення адкрытага акцыянернага таварыства Беларусбанк.

Тэрмін ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры — 1 месяц з дня падачы заявы. З адрасамі і рэжымам працы падатковых органаў можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах www.nalog.gov.by

**Сяргей КУРКАЧ**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 412/С-24196 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), площадью 745,2 кв. м, расположенное по адресу г. Мосты, ул. Советская, 14 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424050100015000129, (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (эксплуатация и обслуживание зданий)), площадью 0,0816, расположенный по адресу г. Мосты, ул. Советская, 14 |
| **Начальная цена продажи** | 112 000 руб. (сто двенадцать тысяч рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 11 200 руб. (одиннадцать тысяч двести рублей) |
| **Продавец** | Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8 01515 325-22 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 6 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 1 марта 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32*
*http://grodnoino.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вишневка – 2010» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом** имущество в составе:

**коровник** инв. № **600/С-128566** общей площадью **2 199,9 кв. м, навозохранилище (сооружение)** инв. № **600/С-128988,** площадь застройки – 916 кв. м, объем (емкость) – 1850 куб. м, **силосная яма (сооружение)** инв. № **600/С-128588,** площадь застройки – 808 кв. м, объем (емкость) – 1420 куб. м **(далее – объекты)**.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **623600000001004394** площадью **1,1958 га** (право постоянного пользования) по адресу: **Минский район, Юзуфовский с/с, район д. Угляны.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: ограничения прав на земельные участки, расположенные на мелиорируемых (мелиорированных) землях, площадью 0,0075 га.*

**Начальная цена объектов с НДС (20 %) – 212 880,00 бел. руб.**

**Задаток 10 % от начальной цены (21 288,00 бел. руб.) перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **14.03.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.03.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8 017) 207-71-34, (8 029) 102-21-17**

**Антикризисный управляющий ЧП «Правовая компания «БелПрофКонсалт» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже** имущества **ООО «Бирерия»** (дата торгов: **16.02.2018 г.** в 10.00), имущества **ООО «Биогранпром»** (дата торгов: **16.02.2018 г.** в 11.00), дебиторской задолженности **ООО «ЛимкорБасар»** (дата торгов: **01.03.2018 г.** в 10.00), дебиторской задолженности **ООО «Кузница Рекламы»** (дата торгов: **01.03.2018 г.** в 10.00), имущества **ООО «ТрейдМаркСтар»** (дата торгов: **09.02.2018 г.** в 11.00), имущества **ООО «Викди-М»** (дата торгов: **26.02.2018 г.** в 15.00), **ОАО «ПМК-8»** (дата торгов: **20.02.2018 г.** в 11.00).

**Место проведения торгов: г. Минск, пр. Победителей, 127 оф. 312.**

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещена в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by

УНП 191875692

І так бывае

# ОРДЭН ЯК ПАМЯЦЬ

## Магілёўскія пошукавікі знайшлі і перадалі дачцэ франтавіка яго згубленую баявую ўзнагароду

Выпадак наогул унікальны. Летась мясцовы пошукавік Дзяніс Іваноў знайшоў на полі каля вёскі Быстрык Магілёўскага раёна баявы ордэн. Пачалі шукаць яго гаспадара, рабіць запыты, маніторыць расійскія архіўныя сайты і нарэшце атрымалі інфармацыю, што ўзнагарода належыць Кузьму Куксянкову, жыхару вёскі Нядашава ў тым жа Магілёўскім раёне. На жаль, ветэран ужо пайшоў з жыцця, цяпер па гэтым адрасе жыве яго дачка — Аляксандра Станкевіч. Яна ўжо не маладая і мае праблемы са здароўем. Таму дэлегацыя ў складзе пошукавікоў, ваеннага камісара і старшыні сельсавета завітала да яе дамоў, каб з усімі належнымі для такога моманту ўрачыстасцямі перадаць баявую ўзнагароду. З гэтай нагоды прыехалі і двое сыноў жанчыны, каб разам з маці перажыць хвалюючыя моманты гонару за свайго геравічнага продка.



Просты селянін і адважны салдат Кузьма КУКСЯНКОЎ (пасля вайны).

Ордэн Славы III ступені наводчык узвода 45-міліметровых гармат 1-га стралковага батальёна 1113 Стралковага Чырванасцяжнага палка 330-й стралковай Магілёўскай Чырванасцяжнай дывізіі Кузьма Куксянкоў атрымаў у чэрвені 1945-га. Ва ўзнагародным лісце напісана, што чырвонаармеец здзейсніў некалькі баявых подзвігаў — знішчаў нямецкую гармату разам з яе разлікам і кулямёт, які перашкаджаў руху савецкіх салдат.

Для дачкі героя паведамленне пра ордэн было нечаканым. Бацька ёй нічога пра яго не расказваў. Старэйшы сын Аляксандры Кузьмінічны Сяргей успамінае, што дзед быў вельмі сціплы, расказваў пра сваё жыццё на фронце без усялякага там гераізму.

Наогул ваенная біяграфія простага селяніна Кузьмы Куксянкова вельмі насычаная. Спачатку яго, бацьку чацвярых дзяцей, прызвалі на фінскую вайну. Усе яго таварышы, з кім ваяваў, загінулі, а ён вось выжыў, дадому вярнуўся. У 1941-м зноў накіравалі на фронт, але пад Масквой ён трапіў у палон. Разам з земляком змог уцячы і неяк па акупаванай ворагам тэрыторыі дабрацца да роднай вёсачкі. Таварыш, як убачыў родную хату, не стрымаўся, пабег, хацеў хутчэй жонку абняць. І нарваўся на немцаў. Кузьма Куксянкоў чуў стрэлы і не стаў рызыкаваць, адразу падаўся да партызан. А калі раён вызвалялі, зноў трапіў на фронт. «Расказваў, што толькі 70 кіламетраў не дайшоў да Берліна, — успамінае Сяргей Станкевіч. — Меркаваў, што павінен быў атрымаць медаль за вызваленне Германіі. А вось пра тое, што страціў ордэн, нічога не казаў. Магчыма, саромеўся. Хутчэй за ўсё, выпаў гэты ордэн, калі ён ішоў чарговы раз да сваякоў у вёску Быстрык. Гэта ж побач з намі. Там у нас было шмат радні, мы туды вельмі часта хадзілі».



Дачка нічога не ведала пра гэтую ўзнагароду.

Родныя спадзяюцца, што атрымаецца нешта яшчэ даведацца пра свайго геравічнага дзеда. А можа, яшчэ і іншыя ўзнагароды адшукаць. Той жа медаль «За перамогу над Германіяй». Чаму б і не?

— Зараз архіўная інфармацыя стала больш даступная, чым раней. Лягчэй стала ўстанавіць уладальніка ўзнагароды. Раней для гэтага прыходзілася ехаць у архіў Мінабароны Расійскай Федэрацыі ў Падольск, — кажа **гісторык, ваенны пісьменнік, старшыня магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Нам у пошуках вельмі дапамагае наш таварыш з Мінска, пошукавік Аляксандр Дударонак. Калі мы знаходзім медальён, нумарную ўзнагароду, кацялок з надпісам, мы звяртаемся да яго, каб ён праз свае сувязі аператыўна ўстанавіў уладальніка. Гэта неацэнная дапамога, бо з 325 тысяч пахаваных на тэрыторыі Магілёўшчыны чырвонаармейцаў і камандзіраў на сённяшні дзень вядомы імёны толькі 75 тысяч.



Узнагароды ветэрана.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

# «ПЕНСІЯ. НЕБА. САМАЛЁТ»



**Можа, для вас гэта шанц ажыццявіць паездку мары...**

Моладзь ужо навучылася падарожнічаць па свеце з мінімумам грошай у кішэні. Многія арганізоўваюць паездкі сваімі сіламі: шукаюць у інтэрнэце танныя білеты на аўтобусы і самалёты, зніжкі гатэляў, а здараецца, начуюць у чужой краіне і зусім бясплатна — дзякуючы рэгістрацыі на сайце каўчсёрфінгу, дзе людзі з розных краін прапануюць турыстам начлег у сваім доме.

А вось пажылыя людзі часцяком нічога не ведаюць пра такія магчымасці. Таму Марыя Мунцян і вырашыла стварыць платформу, якая аб'яднала б рознаўзроставых беларускіх падарожнікаў. «Каб дапамагчы пажылым людзям, якія не страцілі духу авантурызму, ажыццявіць паездку іх мары і не адчуваць сябе выкінутымі за борт жыцця, — тлумачыць яна. — А яшчэ каб зблізіць прадстаўнікоў розных пакаленняў».

Сказана — зроблена. У «Фэйсбуку» была створана спецыяльная група для падарожнікаў трэцяга ўзросту, а нядаўна пачаў працаваць і афіцыйны сайт у інтэрнэце pensianebosamolet.com, дзе могуць каапераваца для сумесных бюджэтных падарожжаў пажылыя і маладыя турысты. Любы пенсіянер можа заявіць там пра сваё жаданне адправіцца ў паездку і запоўніць анкету. Там жа рэгіструюцца і маладыя людзі, якія хочуць стаць валанцёрамі.

Падарожнічаць мяркуецца на недарагіх аўтобусах і лаўкостах, начлег шукаць праз каўчсёрфінг. Такім чынам забіваюцца адразу некалькі зайцоў: турысты начуюць у мясцовых гасцінных людзей бясплатна і, акрамя таго, маюць магчымасць цікавых стасункаў з жыхарамі краіны.

Пакуль што пажылому чалавеку прыходзіцца самастойна аплачваць кошт візы і, магчыма, пакрываць дарожныя выдаткі, калі не будзе знойдзены спонсар. Але, як лічыць Марына Мунцян, для пенсіянераў, а пажадана і валанцёраў, такія паездкі павінны быць бясплатнымі. І збіраецца для гэтых мэт шукаць сродкі — гранты, спонсараў, магчыма, неабходныя сумы будуць збірацца на краўдфандынгавых платформах.

### Два погляды на адну вандроўку

Ужо адбыліся і першыя падарожжы. Так, дзякуючы гэтаму праекту 76-гадовая мінчанка Адэльгейда Стрыгалёва змагла пабачыць у снежні польскі горад Гданьск. Кампаньёнкай для яе ў падарожжы стала 33-гадовая Кацярына Іванова. Уражанняў у абедзвюх засталося мора!

***Адэльгейда Стрыгалёва, 76 гадоў:***

— Я прачытала пра такую магчымасць у газеце. Дачка сказала: «Мама, паспрабуй!» А я чалавек рашучы, нават, можна сказаць, авантурыстка па натуры. Патэлефанавала і, калі мне прапанавалі злётаць у Польшчу, — адразу пагадзілася! Тым больш што да гэтага ні разу там не была. Падарожнічала з Кацяй, студэнткай медуніверсітэта. Да гэтага мы не былі знаёмыя, упершыню ўбачылі адна адну толькі на аўтавакзале, калі ад'язджалі з Мінска. Мы з ёй на аўтобусе прыехалі ў Вільнюс, потым у аэрапорт, а там самалётам — ужо ў Гданьск.

На начлег спыніліся ў польскай сямейнай пары, якую арганізатары паездкі знайшлі праз каўчсёрфінг. Каця добра ведае англійскую мову, на ёй і размаўляла з гаспадарамі. Смешна, але калі ўжо ў Гданьску мы шукалі дарогу да людзей, якія пагадзіліся даць нам прытулак, Каця спытала не ў мужчыны, а гэта аказаўся наш гаспадар! Так што ён сам і прывёў нас да сябе дадому. Ён сам музыкант, а яго жонка працуе ў музеі. Мы ім прывезлі падарункі: цукеркі, вялікую прыгожую кнігу пра Мінск і гарбату, аж чатырох гатункаў, якую падарыла кампанія «Аптэкарскі сад». Яна аказалася вельмі дарэчы на нашых вячэрніх сяброўскіх чаяваннях!

Наступным днём мы раненька падхапіліся і пайшлі знаёміцца з Гданьскам. Цэлы дзень хадзілі па горадзе! Зайшлі ў рэстаран, пілі гарачы глінтвейн... Надвор'е было выдатнае, як на заказ, сонца свяціла ўвесь дзень! Мне вельмі спадабаўся горад, асабліва яго гістарычная частка, і спадабаліся палякі — яны такія ветлівыя, спакойныя людзі, шмат хто размаўляе па-англійску...

А ў апошні дзень мы таксама ранічкай прачнуліся і пабеглі ў музей Другой сусветнай вайны. Вельмі цікавы! Велізарны — тры паверхі — і яшчэ ў падземеллі экспазіцыі... А потым — адразу ў аэрапорт.

...Дарэчы, сама Адэльгейда Мікалаеўна да гэтага часу вядзе актыўны лад жыцця, займаецца спортам — ходзіць у клуб аматараў бегу «Аматар». Чатыры разы ўдзельнічала ў забегу па Ладазе «Дарога жыцця». Усё яшчэ працуе. Кажа, што не можа сядзець у чатырох сценах... Паездка ёй абышлася ў 60 еўра — гэта кошт візы, якую прыйшлося зрабіць. Усе астатнія расходы ўзялі на сябе арганізатары праекта.

***Валанцёр Кацярына Іванова, 33 гады:***

— Для мяне гэтая паездка аказалася вельмі спантаннай. Павінна была ехаць мая сяброўка, але яна нечакана захварэла. А я чалавек даволі заняты па жыцці: вучоба ў медыцынскім універсітэце, праца на хуткай дапамозе, дзіця... Але на той момант у мяне якраз мелася віза, сесія яшчэ не пачалася, а сын быў у бабулі. Таму я пагадзілася. І, як аказалася, з Адай Мікалаеўнай нават прасцей падарожнічаць, чым з некаторымі маімі сябрамі. Мае сябры часта ставяць ультыматумы: гэтага я не ем, туды не хаджу, гэтага не люблю... А тут — ніякіх праблем! І я не магу нават успомніць у сваім асяроддзі больш лёгкага на пад'ём і жывога чалавека, чым яна! Таму паездка прайшла вельмі добра, мы да гэтага часу не прыпынілі свайго знаёмства.

**«Людзі, у якіх у запытах — ідэальнае надвор'е, дакладны маршрут і камфартабельнае пражыванне, хай звяртаюцца ў турфірмы».**

І ведаеце, што мне яшчэ вельмі спадабалася? У мяне, як і ў кожнага чалавека, ёсць сваё сфарміраванае кола зносін — у асноўным гэта мае сябры-равеснікі — і там усё такое звыклае... А, пазнаёміўшыся з Адай Мікалаеўнай, я паглыбілася ў зусім іншы свет, з іншымі ўяўленнямі пра жыццё, іншымі гісторыямі... У мяне ёсць бабуля, я вельмі яе люблю, у дзяцінстве кожнае лета ў яе праводзіла. Але тут я ўбачыла, наколькі рознымі і непадобнымі адно на аднаго могуць быць пажылыя людзі. У Ады Мікалаеўны як быццам прапелер унутры! Увогуле, на тыя два дні я быццам вынырнула з свайго звыклага жыцця і трапіла ў іншае вымярэнне. І з задавальненнем паехала б у такім фармаце яшчэ! Можна нават арганізоўваць такія падарожжы для невялікай кампаніі: два-тры пенсіянеры і валанцёр...

### Каму тут будуць рады?

Дарэчы, напрыканцы лютага арганізатары праекта плануюць паездку ў Рым. Гэта будзе паездка па двух кірунках — свецкая праз Універсітэт трэцяга ўзросту ў Рыме і паломніцкая хрысціянская. Плануецца, што паедуць дзве міні-групы па чатыры чалавекі і два гіды адпаведна. Праграма будзе прапрацоўвацца і абмяркоўвацца сумесна. І зразумела, што для таго, каб рашыцца так падарожнічаць, трэба мець пэўны склад характару.

— Нават напярэдадні падарожжа ў Гданьск, у якое ўрэшце паехала Адэльгейда Мікалаеўна, было вельмі шмат тэлефанаванняў, — кажа Марына Мунцян. — Але, калі я тлумачыла людзям фармат падарожжа, згадвала, што трэба самастойна заплаціць за візу і, магчыма, пакрыць іншыя свае выдаткі, калі не ўдасца атрымаць фінансавую падтрымку, многія гублялі цікавасць. А вось Ада Мікалаеўна не спалохалася ні шматгадзінных паходаў па горадзе, ні начлегу ў доме ў агульнай гасцёўні. Калі яна сказала, што дагэтуль бегае марафоны, а на зборах спіць у спартзале на падлозе і што заўсёды марыла пабачыць свет, я зразумела: гэтая ўнікальная жанчына — наш чалавек!

Хачу адзначыць, што нашымі патэнцыйнымі падарожнікамі змогуць стаць толькі тыя пажылыя людзі, у каго ўсё ў парадку з прыязнасцю, цярпеннем і аптымізмам. Бо ў дарозе часам здараюцца неспадзяванкі, даводзіцца чакаць самалёт, стаяць у чэргах пры праходжанні мяжы. Цярпенне тут няўлішняе. А пры бясплатным пражыванні ў гасцінных мясцовых жыхароў трэба мець зносіны з імі і іншымі людзьмі ў краіне знаходжання. Гэта робіць паездку насычанай, цікавай і вясёлай, але толькі пры адной умове — калі вам падабаецца знаёміцца з іншымі людзьмі.

Таксама нашым удзельнікам павінен падабацца актыўны адпачынак. Зразумела, ім не трэба бегаць марафоны. Але чалавеку, які вядзе сядзячы лад жыцця, наўрад ці даставіць задавальненне доўгія прагулкі. І яшчэ вельмі важна, каб тыя, хто звяртаецца да нас, не мелі спажывецкай жыццёвай пазіцыі. Мы валанцёрская ініцыятыва, і акрамя маральнага задавальнення, не атрымліваем нічога. Людзі, у якіх у запытах — ідэальнае надвор'е, дакладны маршрут і камфартабельнае пражыванне, хай звяртаюцца ў турфірмы. А мы — дапамагаем убачыць свет пры мінімальных выдатках.

Святлана БУСЬКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Информационное извещение о проведении Ивацевичским районным исполнительным комитетом повторного открытого аукциона по продаже в частную собственность граждан Республики Беларусь и негосударственных юридических лиц Республики Беларусь земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Ивацевичи

Характеристика земельного участка, выставляемого на аукцион

| | |
|---|---|
| **Местонахождение (адрес земельного участка)** | Брестская область, г. Ивацевичи, улица Виктора Кононовича, 26 |
| **Площадь участка, га** | 0,10 |
| **Виды земель** | Земли под застройкой |
| **Вещное право на земельный участок** | Частная собственность |
| **Целевое назначение земельного участка (назначение участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), код 10902) |
| **Кадастровый номер участка** | 123450100001003983 |
| **Начальная (стартовая) цена земельного участка, рублей** | 7540,00 (семь тысяч пятьсот сорок рублей 00 копеек) |
| **Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории** | Сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения |
| **Состояние дорожной сети улиц** | С гравийным покрытием |

Повторный аукцион состоится 5 марта 2018 года в 15.00 в малом зале райисполкома по адресу: Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, д. 44, каб. 116.

Для участия в аукционе граждане, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляют комиссии следующие документы:

заявление об участии в аукционе;

копию платежного поручения с отметкой банка о внесении суммы залога за участие в аукционе в размере 1000,00 руб. (одна тысяча рублей 00 копеек) на р/с № BY72AKBB36411006500341300000 в ЦБУ № 111 филиала № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Барановичи, БИК AKBBBY21802, получатель платежа – Ивацевичский райисполком, УНП 200100489;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

а также заключают с исполкомом соглашение.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводятся при условии наличия не менее двух участников аукциона.

Предоставление земельного участка в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона производится без изменения его целевого назначения с условиями:

внесения платы за предмет аукциона;

возмещения Ивацевичскому райисполкому затрат на организацию и проведение аукциона в размере 906 руб. 00 коп. (девятьсот шесть рублей 00 копеек), в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протоколов о результатах аукциона;

обращения победителем аукциона либо единственными участником несостоявшегося аукциона за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона;

получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки, утверждения проектной документации на объект в срок, не превышающий 1 года со дня государственной регистрации прав на земельный участок;

занятия земельного участка (начала строительства) в течение одного года для граждан и шести месяцев для юридических лиц со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на объект;

снятия на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования его для благоустройства участка;

Результаты аукциона оформляются протоколом, копия которого выдается победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в день проведения аукциона либо в день признания аукциона несостоявшимся.

Предварительное ознакомление с земельным участком на местности проводится при подаче заявления.

Заявления на участие в аукционе принимаются с 5 февраля 2018 г. по адресу: 225291, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44, каб. 422, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 2 марта 2018 года включительно.

Контактные телефоны в г. Ивацевичи: (801645) 9-13-69, 2-54-76, 3-00-94.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** Бешенковичское районное потребительское общество, 211361, г. п. Бешенковичи, ул. Коммунистическая, д. 7/11, тел. (02131) 4-23-49

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 231/С-10224 площадью 98,8 кв. м, наименование: здание склада, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Бешенковичский р-н, г. п. Бешенковичи, ул. Матросова, 20, на зем. участке с № 220555100001002473 площадью 0,1851 га. **Нач. цена:** 2 912,40 руб. с НДС. **Задаток:** 291,24 руб.

**Лот № 2.** Капитальное строение с инв. № 231/С-10225 площадью 65 кв. м, наименование: здание склада, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Бешенковичский р-н, г. п. Бешенковичи, ул. Матросова, 20/1, на зем. участке с № 220555100001002473 площадью 0,1851 га. **Нач. цена:** 1 915,80 руб. с НДС. **Задаток:** 191,58 руб.

**Лот № 3.** Капитальное строение с инв. № 231/С-10226 площадью 223,3 кв. м, наименование: здание склада, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Бешенковичский р-н, г. п. Бешенковичи, ул. Матросова, 20/2, на зем. участке с № 220555100001002473 площадью 0,1851 га. **Нач. цена:** 6 129,60 руб. с НДС. **Задаток:** 612,96 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 05.03.2018 в 12.00 по адресу: г. п. Бешенковичи, ул. Коммунистическая, д. 7/11 в Бешенковичском районном потребительском обществе. Срок внесения задатка и подачи документов: с 02.02.2018 с 8.30 по 02.03.2018 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: возместить затраты по оценке имущества, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Ранее опубликованные извещения: газеты «Звязда» 14.11.2017 г., 23.12.2017 г.; «Витебские вести» 14.11.2017 г., 28.12.2017 г.; «Зара»14.11.2017 г., 27.12.2017 г.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 20.09.2011 № 301. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа, подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр. лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц – нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ, подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Организатор аукциона вправе не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информация по тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже имущества ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика». Торги проводятся в форме открытого аукциона. Торги состоятся 19 февраля 2018 года в 12.00 по адресу: Гомельская область г. Ветка, ул. Батракова, 38

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| лот № 106 | Единый объект недвижимого имущества (котельная инв. № 12) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38293, площадью 276 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000125, площадью 0,1554 га; котел КСБТ инв. № 7452, котел универсальный – 6М инв. № 161; №158; №156; №157 емкость 25 м/куб инв. № 29; №30, дымосос ДН-6,3 лев 5,5/1500 инв. № 966, бордюр – 95 м, асфальтированная площадка – 286,6 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт, инв. № 36, трубопровод заполнения резервуаров – 10,7 м, противопожарный водопровод – 36,1 м, сети ливневой канализации – 37,9 м, теплотрасса – 96,4 м, канализация – 47 м, хозпитьевой водопровод – 41 м, ограждение бетонное – 50,6 м | 35 843,02 | 358,43 | 5 | **1 623,86** |
| лот № 107 | Единый объект недвижимого имущества (насосная станция инв. № 28) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38624, площадью 48,9 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/6; единый объект недвижимого имущества (здание бани инв. № 578) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38623 площадью 57,1 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/5; единый объект недвижимого имущества в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39094 площадью 0 $м^2$. наименование – пожарный резервуар – 250 куб. м инв. № 578а, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, все объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000121, площадью 0,2635 га, бордюр – 83,7 м, асфальтированная площадка – 361,1 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт. инв. № 36, плитка цементно-песочная – 27,6 $м^2$, трубопровод заполнения резервуаров – 185,3 м, противопожарный водопровод – 135,8 м, сети ливневой канализации – 68,1м, теплотрасса – 126,4 м, канализация – 61,8 м, ограждение бетонное – 62 м | 38 271,99 | 382,72 | 5 | **2 379,52** |
| лот № 108 | Единый объект недвижимого имущества (здание насосной для подачи ГСМ инв. № 16) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39020, площадью – 19,1 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, корп. 4; единый объект недвижимого имущества (склад для хранения ГСМ инв. № 14) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39021, площадью 20,6 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 38, корп. 3; единый объект недвижимого имущества (канализационная насосная станция инв. № 577) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39097 площадью 0 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/9; единый объект недвижимого имущества (блок очистки дождевых вод инв. № 576,) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39095 площадью 0 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, все объекты расположены на участке с кадастровым номером 320850100004000122, площадью – 0,1579 га, асфальтированная площадка – 187,6 $м^2$; бордюр – 4 м; кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, сети ливневой канализации – 39,8 м, сети хозбытовые напорные канализационные – 52,5 м, теплотрасса – 108,2 м, канализация – 31,2 м, ограждение бетонное – 43 м, ограждение кирпичное – 40,3 м | 18 088,51 | 180,89 | 5 | **2 173,92** |
| лот № 109 | Единый объект недвижимого имущества (здание по ремонту деревянных конструкций инв. № 1089) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-30614, площадью 125,5 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000124, площадью – 0,1222 га, бордюр – 17,5 м, асфальтированная площадка – 322,1 $м^2$; кабельная сеть 0,4 инв. № 36, противопожарный водопровод – 37,6 м, сети ливневой канализации – 52,5 м, канализация – 38,3 м, ограждение деревянное – 12,7 м | 12 252,51 | 122,53 | 5 | **1 271,52** |
| лот № 110 | Единый объект недвижимого имущества (склад инв. № 13, склад достройка № 13а, здание трансформаторной подстанции инв. №521, зарядное здание инв. № 575) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38292, площадью 749 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000120 площадью – 0,1771 га, силовой трансформатор ТМ-1000 инв. № 39; № 40, высоковольтный щит КСО-366 инв. № 84, шкаф распределительный инв. №№ 69, 98, 94, низковольтный щит инв. № 85, конденсаторная установка VEB инв. № 66; № б/н, конденсаторная установка УКБН-0,38-200 инв. № 83, № 82, конденсаторная установка Шальтанлагенбау Галле инв. № 67, электрораспределительный пункт инв. № 695, № 694, № 696, высоковольтная линия инв. № 38, асфальтированная площадка – 633,1 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, противопожарный водопровод – 50,3 м, сети ливневой канализации – 68,9 м, канализация – 110,2 м, хозпитьевой водопровод – 62,6 м, ограждение бетонное – 44,6 м, ограждение кирпичное – 12,7 м | 67 932,42 | 679,32 | 5 | **1 792,13** |
| лот № 111 | Единый объект недвижимого имущества (здание проходной инв. № 19) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38289, площадью 28,1 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/2, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000118, площадью – 0,1854 га, автостоянка инв. № 11, бордюр – 4 м, асфальтированная площадка – 260,8 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, хозпитьевой водопровод – 87 м, ограждение бетонное – 29,8 м, ограждение кирпичное – 6,3 м | 11 473,94 | 114,74 | 5 | **1 301,85** |
| лот № 112 | Единый объект недвижимого имущества (механическая мастерская инв. № 7) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-3829 площадью 257 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000126 площадью – 0,0689 га, бордюр – 24,5 м, асфальтированная площадка – 98,0 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, противопожарный водопровод – 25,4 м, сети ливневой канализации – 25,3 м, канализация – 34,9 м, хозпитьевой водопровод – 63 м | 15 396,13 | 153,96 | 5 | **1 249,98** |
| лот № 113 | Единый объект недвижимого имущества (здание гаража инв. №№ 20; 20а; 20б) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38625 площадью 211,4 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/8, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000123,площадью – 0,1445 га, бордюр – 12,5 м, асфальтированная площадка – 729,8 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, противопожарный водопровод – 37,3 м, сети ливневой канализации – 38,8 м, теплотрасса – 124,2 м, канализация – 37,7 м, ограждение бетонное – 53,8 м | 23 875,62 | 238,76 | 5 | **1 449,90** |
| лот № 114 | Единый объект недвижимого имущества (столовая инв. №№ 18; 18а) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-28338 площадью 262,6 $м^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/1, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000119 площадью 0,1257 га, бордюр – 36,5 м, асфальтированная площадка – 388,9 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, сети хозбытовые напорные канализационные – 105,2 м, теплотрасса – 35,4 м, канализация – 71 м, хозпитьевой водопровод – 36,4 м, ограждение бетонное – 26,2 м, ограждение кирпичное – 3,5 м, плитка цементно-песочная – 9,4 $м^2$ | 21 359,37 | 213,59 | 5 | **1 372,64** |
| лот № 115 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/С-8395, площадью 67,1 $м^2$, расположенное по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38-2, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000117 площадью 0,0746 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания административного здания, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36 | 19 944,74 | 199,45 | 5 | **585,73** |
| лот № 116 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11683 общей площадью 217,4 $м^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000117 площадью – 0,0746 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания административного здания, по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38-1, плата KX-TE82461 инв. № 983, плата КХ-ТГ 824 80 X инв. № 975, шкаф распределительный ШР-МегаМ-24 УЗ инв. № 2100, сервер инв. № 64, базовый блок KX-TEM 824 RU инв. № 974, бордюр – 17,45 м, асфальтированная площадка – 116,2 $м^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, сети хозбытовые напорные канализационные – 39,2 м, канализация – 13,4 м, ограждение кирпичное – 6 м, плитка бетонная – 8,5 $м^2$ | 29 381,01 | 293,81 | 5 | **1 052,72** |
| лот № 118 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11698 общей площадью 5214,7 $м^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008, площадью – 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/7-3, вентиляционно-увлажнительная установка ВУУ-60 инв.№ 701; № 700; № 699, воздухонагреватель ЗИГЗАГ инв. № 874; № 873; № 872а; № 875, вращающийся распылитель воды ВРВ-100 инв. № 880; № 879; № 878; № 877, бордюр – 183,5 м, асфальтированная площадка – 2760,9 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, противопожарный водопровод – 67,5 м, теплотрасса – 55,6 м, канализация – 154,3 м, хозпитьевой водопровод – 243,7 м, ограждение бетонное – 22 м, ограждение деревянное – 6,6 м, ограждение кирпичное – 42,7 м, плитка цементно-песочная – 6 $м^2$ | 262 447,59 | 2 624,48 | 5 | **2 208,18** |
| лот № 119 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-88 общей площадью 1026,6 $м^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008 площадью – 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл. Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, бордюр – 38,9 м, асфальтированная площадка – 310,6 $м^2$, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, канализация – 60 м, хозпитьевой водопровод – 49,9 м | 55 892,12 | 558,92 | 5 | **543,77** |
| лот № 120 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11695 общей площадью 6822,1 $м^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008, площадью – 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/7-1, лифт грузовой ПГ-297 инв. № 854; № 853, преобразовательная установка «Уза» инв. № 706, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, асфальтированная площадка – 112,3 $м^2$, канализация – 61,7 м, хозпитьевой водопровод – 223,1 м, ограждение бетонное – 92,8 м | 282 267,83 | 2 822,68 | 5 | **1 751,42** |
| лот № 121 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11696 общей площадью 404,2 $м^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008, площадью – 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/7-1а, кабельная сеть 0,4 кВт инв. № 36, ограждение бетонное – 34,1 м | 23 714,08 | 237,14 | 5 | **1 444,85** |
| лот № 67 | Установка компрессорная ВК20Е-8-500Д, инв. № 985 | 4 956,00 | 495,60 | 5 | **81,43** |
| Лот № 71 | Компрессор Atlas Copso AIRGA 18P, инв. № 8 | 4 387,20 | 438,72 | 5 | **63,23** |
| лот № 83 | Пресс АРО-1, инв. № 753 | 2 436,00 | 243,60 | 5 | **81,43** |
| лот № 85 | Смеситель для угаров СН-3-У, инв. № 750 | 2 436,00 | 243,60 | 5 | **81,43** |
| лот № 90 | Гидравлический литьевой пресс, инв. № 922 | 1 848,00 | 184,80 | 5 | **81,43** |
| лот № 91 | Грузонесущий цепной конвейер ЦПК-80Р, инв. № 840 | 4 788,00 | 478,80 | 5 | **81,43** |
| лот № 95 | Шлифовальная машина, инв. № 54 | 26 544,00 | 265,44 | 5 | **81,43** |
| лот № 96 | Телевизионная система видеонаблюдения, инв. № 88 | 21 252,00 | 2 125,20 | 5 | **81,43** |
| лот № 98 | Мотальная машина МТ-2, инв. № 87 | 2 814,00 | 281,40 | 5 | **81,42** |
| лот № 99 | Мотальная машина МТ-2, инв. № 86 | 2 200,80 | 220,08 | 5 | **81,42** |
| лот № 102 | Электропогрузчик ЕВ-687-33-10 (2-й этаж), инв. № 312 | 1 092,00 | 109,20 | 5 | **81,42** |
| лот № 105 | Форд «Транзит», инв. № 000125 | 10 800,00 | 1 080,00 | 5 | **303,55** |
| лот № 122 | Тепловая пушка ЭК 36 П, инв. № 1204 | 295,80 | 29,58 | 5 | **124,82** |
| лот № 123 | Тепловая пушка ЭК 36 П, инв. № 1205 | 295,80 | 29,58 | 5 | **124,82** |
| лот № 124 | Агрегат электронасосный К80-65-160, инв. № 3 | 367,20 | 36,72 | 5 | **124,82** |
| лот № 125 | Станок механический ножовочный, инв. № 338 | 703,80 | 70,38 | 5 | **124,82** |

Имущество расположено по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.

Для участия в торгах необходимо:

1. Оплатить задаток в размере, указанном в объявлении, от начальной цены лота на р/с BY30BAPB30122102900130000000 в РКЦ № 8 филиала ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление г. Ветка, ул. Чапаева, 6, БИК BAPBBY23912, УНН 400052674.

2. **По 15 февраля 2018 года** включительно в рабочие дни с 9.00 до 15.00 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Ветка, ул. Батракова, 38.

Со всей информацией по проведению аукциона можно ознакомиться на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве: **https://bankrot.gov.by/ManagerSection/ManagerMessages.aspx.**

С дополнительной информацией о торгах можно ознакомиться по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38, тел.: 8 (02330) 2-11-06, 2-12-03. Выходные дни: суббота, воскресенье.




## СУСТРАКАЮЦЬ ПА АДЗЕННІ

У кожным населеным пункце ёсць свае славутасці і свае знакамітасці. У нашай невялічкай вёсцы гэта Пётр Іванавіч Пачынчук (светлай памяці!) — сярэбраны прызёр XXII летніх Алімпійскіх гульняў па спартыўнай хадзьбе.

Тады, на Алімпіядзе-80, яны разам з цяжкаатлетам Леанідам Тараненкам праславілі нашу Маларытчыну, родную Беларусь і нават увесь Савецкі Саюз. Што ўжо казаць пра вёску!

У ёй, такой далёкай ад Масквы, жылі бацькі знакамітага спартсмена — дзядзька Іван і цётка Мар'я, працавітыя, шчырыя людзі. Пётр Іванавіч, калі была такая магчымасць, ляцеў да іх нібыта на крылах, дапамагаў па гаспадарцы, бо ўмеў літаральна ўсё. Ды і спрыту было не пазычаць. Але ж пры гэтым ён ніколі не закідваў трэніровак: штодзённыя і шматкіламетровыя кросы былі для яго надзённай патрэбай, а ў родных мясцінах — яшчэ і асалодай.

...У той яго прыезд якраз паспелі чарніцы. Дзеці, жанчыны з самага ранку кіравалі ў бліжэйшы лес, а самыя руплівыя ды заўзятыя — шыбавалі нават далей, да бароў. Ягад там было — хоць засыпся! Ну яшчэ б — ніхто не таптаў, не збіраў. Дзве збіральніцы, можна сказаць, дарваліся: дайшлі да сваіх любімых мясцін, парадаваліся ўраджаю, сталі збіраць, як раптам... Што гэта? Нарастаючы тупат ног...

Разагнуліся, задралі галовы і як не памлелі: па ледзь прыкметнай сцяжынцы да іх (?!) бег мужчына (слова «маньяк» тады не «хадзіла») у адных трусах ды майцы.

Па тым часе і для вясковых кабет гэта было б нечаканым паўсюль... А ўжо ў лесе...

Таму *што* канкрэтна крычалі перапалоханыя цёткі, якія праз карчы «ламануліся» да балотца, ведама толькі Богу і... нашаму алімпійскаму прызёру. Менавіта ён, Пятро Іванавіч, у тую раніцу, у сваёй прывычнай спартыўнай форме выйшаў на ранішні забег...

Перапуджаных кабет ён потым пазнаходзіў, як мог супакоіў, пазбіраў па лесе іх параскіданыя рэчы, нават па жменьцы чарніц дадаў — для маральнай кампенсацыі.

Аднак форму адзення з той пары змяніў: свае праходкі ды забегі стаў рабіць выключна ў глухім трыко.

**Генадзь Мішчук,**
*в. Вотчына, Маларыцкі раён.*

## ДОБРЫ ЗЛОДЗЕЙ

...Люблю, калі да мяне прыходзіць суседка. Мы з ёй абедзве пенсіянеркі, час вольны маем, так што любім пасядзець за кубачкам гарбаты, пагаварыць.

Родам Тамара з Віцебшчыны, раней часта ездзіла туды да бацькоў, а калі маці — пасля смерці бацькі — засталася адна, забрала яе да сябе. Расказвала, як тая спачатку не магла дачакацца цёплых дзён, каб вярнуцца дамоў, як непакоілася за сваё дабро і хату, што пакінула там, і як па прыездзе старанна правярала, ці не пашасталі якія злодзеі, ці не забралі што.

На жаль, не без таго: і залазілі, і забіралі. «Вось, каб я была дома, то не адважыліся б», — казала Максімаўна ў свае амаль 90. «Ага, пабаяліся б, — смяялася Тамара і пытала, — а помніш, як спужалася сама?»

Матуля, вядома ж, помніла.

Аднойчы вечарам, выключыўшы святло, яна глядзела тэлевізар і раптам пачула, як па дзвяры нехта ходзіць.

Што было рабіць? Прысела ля сцяны — схавалася... Вельмі баялася, каб ёй не пастукалі ў дзверы, бо ведала, што адчыняць нельга, што чужыя там (сваіх у вёсцы мала было, ды і позна ўвечары на сяло ніхто не хадзіў)...

Назаўтра, калі развіднела, Максімаўна рушыла да хлеўчыка. Здалёку ўбачыла, што замок валяецца на зямлі, прабой вырваны «з мясам», а з чатырнаццаці курачак засталося толькі сем. «Ну, дзякуй і за гэта», — падумала гаспадыня, і ўсім потым хвалілася, які ж добры ёй трапіўся злодзей: пароўну падзяліў курэй — і сабе сем узяў, але ж і ёй пакінуў.

...З расказаў Тамары і вось гэты кароткі эпізод.

Паехала яна неяк на пахаванне дальняга сваяка. Чалавек ён быў, мякка кажучы, не зайздросны, не такі, каб па ім дужа гаравалі: і выпіваў, і не шкадаваў нікога ніколі... Пасля смерці такога гаспадара ўдаве, як людзі казалі, мо лягчэй нават будзе.

Але ж гэта — потым. А тады сабраліся суседзі, прыехалі сваякі, паселі ў зале. Да іх, да труны выйшла гаспадыня, акінула вокам прысутных, апусцілася на крэсла каля нябожчыка і заплакала: які-ніякі, але ж быў чалавек, а вось зараз — не будзе...

Удава шкадавала і яго, і сябе, яна плакала, а потым стала галасіць. Галоўнае — словы знаходзіла...

Яны не маглі не крануць прысутных. Глядзіш — адна з жанчынак заплакала, за ёй — другая, захлюпала носам трэцяя. «А мой жа ты сакоолік», — зацягнула ўдава...

У гэты момант да гаспадыні падышла адна з жанчын, што ладзілі памінальны стол.

— ...А ты ж вось ляжы-ы-ыш, — не зважала на яе гаспадыня, хоць тая ўжо нахілілася да вуха, спытала, дзе яйкі для салатаў?

— ...А яйкі на паліцы стая-я-яць, — не змяніўшы танальнасці, завяршыла сваю фразу гаротніца.

Хата скаланулася ад смеху.

Вось так спалучаецца ў жыцці добрае і дрэннае, камічнае і трагічнае.

**Леакадзія Кавальчук,**
*г. Жодзіна...*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Пацвярджанне апошняй выснове — аказалася... у тым жа канверце: спадар Леанід Кавальчук паведамляў, што гэтыя суседчыны гісторыі для «Звязды», для любімай рубрыкі запісала ягоная жонка. Яна ўжо і канверт купіла, каб адправіць ліст, але... На вялікі жаль, не паспела...

Гісторыі даслаў удавец, Леанід Нічыпаравіч, адданы падпісчык «Звязды». «Буду ўдзячны, калі надрукуеце», — папрасіў ён.

Друкуем, як бачыце. Смуткуем разам і...

Яшчэ раз нагадаем, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» друкуюцца не проста так, а ў рамках конкурсу — на найлепшую. Летась пераможцамі ў ім сталі **Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Кацярына Будзіловіч са Скідзеля,** а таксама жыхары сталіцы **Валянціна Палікаміна, Любоў Чыгрынава і Іван Гаральчук.** Па просьбе чытачоў (а потым рэдакцыі) кожны з іх расказаў пра сябе. У некага атрымалася карацей, у некага...

Таму зараз толькі два «партрэты».

*«Па-першае, мой віват усім, хто чытаў і чытае па-беларуску, у тым ліку — маю «Звязду», —* піша **спадар Іван Гаральчук.** *— Па-другое, шчыры дзякуй тым, каму спадабаліся мае гісторыі. Усе яны, вядома ж, былі, бо жыву ўжо досыць даўно (нарадзіўся ў часы Мікіты Хрушчова). У школу пайшоў на год раней, бо ўмеў чытаць (навучыўся ад сястры) і не хацеў адставаць ад старэйшых сяброў.*

*Пасля школы атрымаў спецыяльнасць экскаватаршчыка, адслужыў у войску, адвучыўся ў легендарным інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі. Займаў інжынерныя пасады ў сістэме Дзяржсельгастэхнікі, завода штучных крышталёў, аўтамабільнай камплектацыі. Заўсёды любіў і люблю друкаванае слова. Калі няма чытва (што рэдка бывае), — «ломка»: не ведаю, куды сябе дзець...*

*А да ўдзелу ў конкурсе на найлепшую гісторыю мяне падштурхнула жонка, —* прызнаецца спадар Іван. *— У рубрыцы «Алё, народ на провадзе!» яна першай расказала пра казла, які аднойчы «праводзіў» яе на электрычку з нашага дачнага пасёлка. А далей — пайшло-паехала: на мой погляд, дык кожнаму ёсць што расказаць...».*

*...«Я павінна была нарадзіцца ў мястэчку Маляцічы Крычаўскага раёна, —* піша пра сябе **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска,** *— але яго немцы спалілі. Наша сям'я з сямі чалавек апынулася ў бежанцах у вёсцы Лапаціна, што на Мсціслаўшчыне. Там за два тыдні да майго нараджэння памёр тата. Мама моцна хварэла. У сястры Жэні быў свой маленькі сынок, а муж яе загінуў на фронце. Так што я ў гэтым горы была непатрэбнай, але ж чамусьці жыла і ў дзетдом мяне аддаваць не збіраліся, нават пасля смерці мамы...*

*Усе турботы пра сям'ю ўзвалила на сябе дваццацігадовая сястра Жэня. Вясной мы вярнуліся ў свае Маляцічы, выкапалі зямлянку і толькі праз два гады згарусцілі нейкую хацінку.*

*Сястра была ўмелай гаспадыняй, трымала нас у дысцыпліне, прывучала да працы. Гаспадарку трымалі вялікую, бо дапамагалі яшчэ адной сястры: яны з мужам, маючы траіх дзяцей, будавалі жытло ў Крычаве.*

*...Пасля дзесяцігодкі вучыцца не было за кім. Я паехала ва Уладзімірскую вобласць, скончыла вучылішча і працавала б прадзільшчыцай, але стала балець ногі.*

*Вырашыла вярнуцца дамоў. Тут скончыла тэхнікум, выйшла замуж і такім чынам апынулася ў вёсцы Забалацце Вілейскага раёна. Муж працаваў эканамістам, я — бібліятэкарам... Завочна скончыла педінстытут і на працу ў школу хадзіла як на свята.*

*...Выгадавалі з мужам траіх дзяцей, увесь час трымалі гаспадарку. Словам, жылі і працавалі як людзі, як трэба (ва ўсякім разе было на вёсцы).*

*Змалку не любіла, каб мяне шкадавалі, спадзявалася толькі на сябе. З мужам усё жыццё стараліся дапамагаць іншым, жылі па сродках, без даўгоў і крэдытаў.*

*Па натуры — я аптыміст, —* у давяршэнне «аўтапартрэта» прызнаецца Любоў Міхайлаўна. *— Люблю родную мову, «Звязду», трапны жарт, кнігі, добрую музыку, радуюся кожнаму дню. А чаго не люблю, дык гэта сварак і здрадніцтва».*

Вось такія яны — падпісчыкі «Звязды» і аўтары найлепшых гісторый.

Пра іншых пераможцаў конкурсу, а таксама пра новы склад журы — у наступных выпусках рубрыкі.

Чытайце нас па пятніцах.

■ Неасабісты суб'ектыў



# ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ

## Пакуль на зямлі стаіць твая школа, да таго часу ты адчуваеш сябе вучнем

ЗАЎТРА ў нашай школе, як і шмат-шмат гадоў было ў першую суботу лютага, — вечар сустрэчы выпускнікоў. Запаляцца ўсе вокны двухпавярховага ружовага будынка, завзвіняць рэхам па калідорах галасы — радасныя, усхваляваныя, здзіўленыя. Пасля кожны клас збярэцца асобна, і будуць успаміны, і жарты, і доўгія, крыху сумныя погляды адзін на аднаго, і пачуццё лёгкай няёмкасці ад гэтай незваротнай даросласці і ад таго, што за школьнай партай цесна... Добра, што хтосьці прыдумаў калісьці гэту традыцыю — у слотным галалёдна-завейным лютым, калі зіма ўжо абрыдла, а да вясны яшчэ далёка, праводзіць такое цёплае, кранальнае мерапрыемства. Нават калі ты (ну па вельмі ўважлівай, канешне ж, прычыне) на яго не трапляеш, усё роўна пачатак апошняга месяца зімы напоўнены светлымі ўспамінамі, ад якіх хораша становіцца на душы і весялей глядзіцца на гэты адубелы і засівералы свет.

Мне, напрыклад, прыгадваецца наша старая школа (у новай наш клас паспеў адвучыцца апошнія паўтара года, дагэтуль найактыўнейшым чынам папрацаваўшы на яе будоўлі). Старая школа — доўгі, у форме перавернутай літары «г», будынак — была не што іншае, як ксяндзоўскі дом. Самы сапраўдны — «за польскім часам» тут жыў пробашч касцёла. Касцёл стаяў тут жа на высокай гары і быў відаць здалёк. Пасля вайны ён быў і складам, і спортзалай, і клубам, пакуль яго ўвогуле не сцерлі бульдозерам з твару зямнога. (Цяпер усё вярнулася на кругі свая — новы касцёл на старым фундаменце горда ўзвышаецца на высокай гары, а ў колішняй школе жыве ксёндз).

У старой школе былі невялікія ўтульныя класы з абавязковымі грубкамі (хоць ужо даўно было праведзена паравое ацяпленне), якія перад верасням фарбавалі ў серабрысты колер. У некаторых класах яшчэ стаялі парты з адтулінамі для чарніліц, бліскуча-слізкія ад шматлікіх слаёў бледна-зялёнай фарбы. З выгод цывілізацыі ў школе быў электрычны званок, але ён вельмі часта ламаўся, і тады прыбіральшчыца цётка Вікця даставала з ёй адной вядомай схованкі «званок для апошняга званка» і, трасучы яго ў руцэ, абходзіла ўсе калідоры. А пад капяжамі ў той школе былі ўкапаныя ў зямлю ёмістасці, куды збіралася дажджавая вада. У непагадзь вучні і настаўнікі боўталі там нагамі, мыючы гумавыя боты.

А яшчэ ў школе было сапраўднае сутарэнне. Трапіць у яго можна было толькі з кладоўкі, дзе захоўваўся рыштунак прыбіральшчыц, — праз адмысловую дзірку ў падлозе, закрытую вечкам з цяжкім металічным кольцам. Пацягнуўшы за кольца ўверх, спусціўшыся па лесвіцы, трапляў у халодную і цёмную прастору, пра якую старшакласнікі складалі страшныя байкі — пра замучаных людзей і шкілеты. Станавілася вусцішна, асабліва калі з цемры пачынала адсвечваць цьмяна-белае, і мы стрымгалоў імчалі ўверх, выбягалі з той кладоўкі, варочаючы вёдры ды швабры. (Насамрэч там паблісквалі храсткі прарослай бульбы — у сутарэнні захоўваўся ўвесь сабраны са школьнага агарода для школьнай жа сталоўкі ўраджай).

Быў час, калі месца ў школе ўсім не хапала і малодшыя класы вучыліся ў другую змену. Узімку пляцоўка перад школай вечарамператваралася ў стаянку для запрэжаных саней — бацькі з іншых вёсак клапаціліся аб дастаўцы нашчадкаў дадому. Гучаў званок з апошняга ўрока — і мы, расхрыстаныя, на хаду зашпіляючы партфелі, навыперадкі ляцелі, каб заняць у тых санках лепшае месца...

А вясной і ўвосені на пляцоўцы перад школай праходзілі ўрачыстыя лінейкі. Настаўнікі, запрошаныя госці і ветэраны вайны размяшчаліся на крытай верандзе перад галоўным уваходам. Мы ж, пастроеныя ўсёй школай «у каробку», стаялі на пляцоўцы. Вялікай бяды ў тым не было: абапал яе раслі векавыя ліпы, шаты якіх ахоўвалі і ад сонца, і ад дажджу. Толькі вось... у гэтых самых шатах вельмі любілі гнездавацца і весці свой рэй вароны і іншыя іх гарластыя сваякі. Аднойчы дурныя птушкі зняважылі дзеяннем сцяг нашай піянерскай дружыны і ўсю «знамённую групу», у якой на галовах былі чырвоныя пілоткі. Спачатку лінейка ціхенька пырскала і ўздыхала, але праз колькі хвілін над школай лунаў проста грандыёзны рогат.

А яшчэ ў старой школе, седзячы каля акна, можна было ўцячы з класа проста пасярод урока. Асабліва вясной, калі старая чаромха, ківаючы ля шыбы белымі ад кветак галінкамі, завабліва клікала: выходзь! Для гэтага трэба было ціхенька адсунуць на акне зашчапку, прыадкрыць фортку, згледзець, калі настаўнік трывала паверненецца да дошкі, злаўчыцца і скокнуць цераз падаконнік. Некаторыя, асабліва спрытныя, маглі да канца ўрока і назад вярнуцца, цягнучы за сабой цяжкі ахапак чаромхі. Клас задаволена гудзеў, а настаўнік, адвярнуўшыся ад дошкі, здзіўлена лыпаў вачыма, не разумеючы, адкуль раптам з'явіўся гэты цяжкі дурманны водар, ад якога зусім не хочацца ў маі месяцы працаваць...

СТАРУЮ школу любілі ўсе — і вучні, і настаўнікі. І калі нам пабудавалі новую — ружовую, двухпавярховую, з усімі выгодамі і адмысловымі кабінетамі, мы не хацелі туды перазджаць. Будынак на гары застаўся стаяць, прыгаломшаны, асірацелы, з цёмнымі пустымі вокнамі. Ён быў бачны здалёк і адусюль, і мы ўсе адчувалі сябе крыху здраднікамі.

Цяпер і ў новай школе — амаль пуста, яшчэ пару гадоў, і яе зачыняць, а нешматлікіх вучняў будзе вазіць у іншую вёску вясёлы жоўты аўтобус. Не стане і вечароў сустрэчы — каму ў той чужой аб'яднанай школе за дзясятак і больш кіламетраў, справа да тых, хто з заміраннем чакаў апошняга званка ў цені векавых ксяндзоўскіх ліп?

ЗАСТАНЕЦЦА толькі тое, што, як і ўласнае неба, усё жыццё носім з сабой.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by ■

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ



***2 лютага, пятніца.*** Атрымаецце задавальненне ад стрыжкі, зробленай сёння. Вынік афарбоўкі будзе выдатны, прынясе ўдачу.

***3 лютага, субота.*** Стрыжка дадасць здароўя і сіл. Афарбоўка спрыяльна паўплывае на структуру валасоў.

***4 лютага, нядзеля.*** Сёння атрымаецца выдатная стрыжка, якая будзе спадарожнічаць поспеху. Прыдатны дзень для аздараўленчых працэдур і афарбоўвання ў натуральны колер.

***5 лютага, панядзелак.*** Спрыяльны дзень для эксперыментаў з прычоскай. Афарбоўванне не апраўдае чакання.

***6 лютага, аўторак.*** Не варта стрыгчы валасы сёння, яны стануць ломкімі і слабымі. Афарбоўка валасоў будзе вельмі ўдалай.

***7 лютага, серада.*** Няўдалы дзень для стрыжкі, яна не атрымаецца. Выдатны дзень для зафарбоўвання сівізны.

***8 лютага, чацвер.*** Сёння не варта стрыгчы валасы, лепш зрабіць маску, якая іх умацуе. Афарбоўка ў цёмны тон дапаможа прыцягнуць да сябе ўвагу.

***9 лютага, пятніца.*** Нейтральны дзень для стрыжкі. Таніраванне зробіць валасы мацнейшымі і ярчэйшымі.

***10 лютага, субота.*** Дзень падыходзіць для класічных стрыжак. Афарбоўванне дрэнна адаб'ецца на ўзаемаадносінах з процілеглым полам.

***11 лютага, нядзеля.*** Сёння лепш адмовіцца ад любых салонных працэдур. Дзень можа прынесці шкоду валасам, а вам дрэннае самаадчуванне.

***12 лютага, панядзелак.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі. І ад афарбоўвання лепш адмовіцца, можна наклікаць канфлікты ў калектыве.

***13 лютага, аўторак.*** Не лепшы варыянт для стрыжкі: новая прычоска можа стаць прычынай дэпрэсіі. Удалымі адценнямі для афарбоўкі будуць светлыя і рудыя.

***14 лютага, серада.*** Выдатны перыяд, каб задзейнічаць фантазію пры стварэнні прычоскі. Афарбоўванне дапаможа ў кар'ерным росце.

***15 лютага, чацвер.*** Выдатны дзень для стварэння як звычайных стрыжак, так і шэдэўраў цырульніцкага мастацтва. Удалым будзе рызыкоўнае афарбоўванне ўсіх або часткі валасоў.

***16 лютага, пятніца.*** Правільна падабраная стрыжка дапаможа не толькі падняць настрой, але і ўзмоцніць прыток матэрыяльнай энергіі. Афарбоўка паспрыяе з'яўленню актыўнасці, смеласці і бадзёрасці.

***17 лютага, субота.*** Паход да цырульніка добра адаб'ецца на стане валасоў. Пры афарбоўванні варта пазбягаць яркіх колераў, бо гэта можа прыцягнуць нядобразычліўцаў.

***18 лютага, нядзеля.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, можна нацкаваць на сябе нячыстую сілу. Не варта фарбаваць валасы: фарба дрэнна замацуецца і валасы набудуць недагледжаны выгляд.

***19 лютага, панядзелак.*** Любыя маніпуляцыі з валасамі зробяць іх больш моцнымі і шаўкавістымі.

***20 лютага, аўторак.*** Пастрыгацца сёння не варта. А вось аздараўленчыя працэдуры зробяць валасы больш прыгожымі.

***21 лютага, серада.*** Нейтральны дзень. Стрыгчыся вам ці не, вырашайце самі. У афарбоўцы самы прыдатны перыяд для таго, каб паспрабаваць хну або басму.

***22 лютага, чацвер.*** Стрыгчыся і фарбавацца сёння не варта, лепш прысвяціць дзень догляду за валасамі.

***23 лютага, пятніца.*** Дзень падыходзіць для стрыжкі валасоў. Гэта дазволіць зняць з сябе назапашаную негатыўную энергію. Можна заняцца асвятленнем валасоў.

***24 лютага, субота.*** Вынік наведвання цырульні вас абавязкова парадуе. Для догляду можна выкарыстоўваць адцянняльныя мусы, шампуні.

***25 лютага, нядзеля.*** Выдатны дзень, каб зрабіць завіўку. Для афарбоўкі валасоў можна выкарыстоўваць толькі натуральныя фарбавальнікі.

***26 лютага, панядзелак.*** Стрыжка сёння непажаданая, таксама як і іншыя маніпуляцыі з валасамі.

***27 лютага, аўторак.*** Сёння можна на падстрыгчы грыўку або абнавіць канцы валасоў. Афарбоўка валасоў павысіць працаздольнасць і актывізуе лагічнае мысленне.

***28 лютага, серада.*** Пасля стрыжкі валасы будуць прыгожымі і здаровымі. Афарбоўваць валасы можна, але толькі ў выпадку, калі гэта робіць прафесіянал.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.55 | 17.52 | 8.57 |
| Віцебск — | 8.49 | 17.38 | 8.49 |
| Магілёў — | 8.45 | 17.43 | 8.58 |
| Гомель — | 8.36 | 17.45 | 9.09 |
| Гродна — | 9.09 | 18.08 | 8.59 |
| Брэст — | 9.04 | 18.14 | 9.10 |

## Месяц

*Поўня 31 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

***Пр.*** *Рымы, Яфіма.*
***К.*** *СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЯЕ, Марыі, Карнеля, Міраслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 2 ЛЮТАГА




**1838** год — нарадзіўся Кастусь Каліноўскі, беларускі публіцыст, рэвалюцыянер-дэмакрат, кіраўнік паўстання 1863—1864 гадоў у Беларусі і Літве. Вясной 1861 года стварыў рэвалюцыйна-дэмакратычную арганізацыю на Гродзеншчыне для падрыхтоўкі паўстання супраць царызму. У 1862—1863-м сумесна з В. Урублеўскім і іншымі паплечнікамі выдаваў першую беларускую газету «Мужыцкая праўда», падпісваючы яе матэрыялы псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні». У студзені 1864 года арыштаваны. У турме напісаў на беларускай мове і здолеў перадаць на волю «Лісты з-пад шыбеніцы» — цыкл яркіх публіцыстычных твораў. У 1864 годзе публічна павешаны ў Вільні на гандлёвай плошчы Лукішкі. Як родапачынальнік беларускай рэвалюцыйнай дэмакратыі аказаў уплыў на беларускую культуру і літаратуру, садзейнічаў паглыбленню ў літаратуры і мастацтве прынцыпаў служэння народу, замацаванню ў грамадскай думцы ідэалаў барацьбы за свабоду. У гады Вялікай Айчыннай вайны яго імем былі названы партызанская брыгада і атрады ў Беларусі. У многіх гарадах імем Каліноўскага названы вуліцы.



**1903** год — нарадзіўся (в. Кайкова Мінскага раёна) Іосіф Васілевіч Матрунчык, Герой Савецкага Саюза (1940). Камандзір эскадрыллі бамбардзіроўшчыкаў капітан Матрунчык вызначыўся ў савецка-фінляндскай вайне (1939—1940). Здзейсніў больш як 60 баявых вылетаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны на Заходнім, Волхаўскім, Ленінградскім, 2-м Украінскім, 1-м Прыбалтыйскім і 1-м Беларускім франтах — камандзір асобнага авіяпалка бамбардзіроўшчыкаў. Загінуў у 1945 годзе.

**1938** год — нарадзіўся Уладзімір Феліксавіч Багінскі, беларускі вучоны ў галіне лесаводства, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па лесаводстве, лесаўпарадкаванні, лесааднаўленні, эканоміцы і арганізацыі лясной гаспадаркі, экалогіі раслін.




**1885** год — нарадзіўся Міхаіл Васілевіч Фрунзэ, рэвалюцыянер, ваенны і дзяржаўны дзеяч, ваенны тэарэтык, адзін з арганізатараў савецкіх Узброеных Сіл. З 1916 года на Заходнім фронце, вольнанаёмны артылерыйскай часці ў мястэчку Іванец, затым у Мінску, у камітэце Усерасійскага земскага саюза на Заходнім фронце. Стварыў у Мінску падпольную бальшавіцкую арганізацыю. Вёў рэвалюцыйную агітацыю на фронце, выступаў на мітынгах і падпольных сходах. Адзін са стваральнікаў Мінскага Савета, член яго выканкама, начальнік народнай міліцыі Мінска. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў наркамам па ваенных і марскіх справах СССР, начальнікам Ваеннай акадэміі РСЧА. Аўтар навуковых прац, якія аказалі ўплыў на развіццё савецкай ваеннай навукі і фарміраванне ваеннай дактрыны.

**1918** год — СНК зацвердзіў дэкрэт «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных таварыствах» (дэкрэт аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы).

**1943** год — савецкія войскі атрымалі гістарычную перамогу ў Сталінградскай бітве, якая ўнесла вырашальны ўклад у дасягненне карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне.

## УСМІХНЕМСЯ

**Як казаў у пятніцу Архімед: «Дайце мне бутэльку віскі, і я перавярну тут усё».**

— Ха-ха, ды як увогуле машыны могуць кіраваць людзьмі, створанымі з наймагутнейшым інтэлектам?

— Зялёны загарэўся, паехалі.

**Мужчыны, калі ў вас павялічваецца лысіна і расце жывот, не адчайвайцеся.**

**Проста лічыце, што з адважнага рымскага палкаводца вы ператвараецеся ў заможнага рымскага сенатара.**

— Мужчыну выбірае жанчына. Значыць, у яго няма выбару?

— Чаму ж. У мужчыны таксама поўная свабода выбару: хочаш цябе абяруць з тваёй згоды, не хочаш — без тваёй.







ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 391.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 лютага 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

2 лютага 2018 г. № 5 (438)



стар. 3

**Які клімат прыдатны для інвестара?**



стар. 4

**Ці любіць карова камфорт?**



стар. 15

**Шукаем прычыну або работу?**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ВЯЛІКАЕ ПОЛЕ ДЛЯ ДЗЕЙНАСЦІ



## АПК патрэбен фонд падтрымкі і тэхнічнае абнаўленне

Фота БЕЛТА.

**ШТОГОД у зводках навін мы чытаем пра рэкордныя ўраджаі і дасягненні ў аграпрамысловым комплексе. Значна менш — аб стратных прадпрыемствах і аб праблемах у сельскай гаспадарцы, якія, нягледзячы на ўсе намаганні дзяржавы, нікуды не зніклі. На семінары-нарадзе «Аб развіцці вёскі і павышэнні эфектыўнасці аграрнай галіны», які адбудзецца ў хуткім часе з удзелам кіраўніка дзяржавы, плануецца падвесці вынікі і закрануць самыя вострыя пытанні. У цэнтры ўвагі будуць як поспехі, якіх сёння нямала, так і праблемы, якія трэба вырашаць хутка і зараз жа. Аб некаторых з іх карэспандэнт «МС» пагаварыў з дырэктарам Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандрам ШПАКОМ, навукоўцам, які фундаментальна даследуе аграрную сферу краіны.**

стар. 4, 13

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# Капітальны рамонт ці мадэрнізацыя?

**За мінулы год у Гродзенскай вобласці адрамантавана 260 тысяч кв. м жылля, у тым ліку з мадэрнізацыяй. Гэта азначае, што дом прайшоў працэс цеплаізаляцыі, а аб такім рамонце мараць, бадай што, усе. Але ж шчасціць не ўсім. Мадэрнізацыя будзе весціся толькі за сродкі жыхароў.**

### Дачакаліся...

Гэты дзівосны будынак у цэнтры Гродна нагадвае стары карабель, які быццам прыплыў з мінулага. Так яно і ёсць на самай справе. Дом адлічвае сваю гісторыю з канца XIX стагоддзя. Від з боку двара ўражвае старымі цаглянымі сценамі, на якіх бачны трэшчыны. Пенсіянерка Тамара Шабан не адзін год ходзіць па інстанцыях, каб дабіцца рамонту ў сваім доме. Над яе кватэрай дах правіс і пачаў працякаць. Вада сцякала са столі, лілася па сценах. Жыхар суседняй кватэры спрабаваў дзіркі залатаць, але аказалася, што прагнілі кроквы. Вось так і пакутавалі жыхары аднаго з самых старых жылых дамоў у Гродне.

Некалькі месяцаў таму дом агарадзілі, сюды прыйшла прыватная будаўнічая фірма, але трохі пагрымкалі і... зніклі. Кажуць, што падрадчыкі спачатку не ўяўлялі аб'ёму работ, які аказаўся значна большы і не ўкладваўся ў каштарыс. Але дом усё ж не кінулі. Эстафету падхапіла адно з галоўных гарадскіх будаўнічых прадпрыемстваў, і працэс зрушыўся з месца. Бачна, як вядуцца работы па даху. Прараб расказаў, што будзе фальцавае пакрыццё барвовага колеру. Затым дойдзе чарга да сцен, іх спачатку атынкуюць, затым афарбуюць. Нарэшце ў доме пазбавяцца ад газавых калонак. У кватэрах правядуць газ і заменяць водаправод. Можна сказаць, што стары будынак мадэрнізуецца, але не хапае асноўнага элемента — цеплаізаляцыі. Хоць цэгла з часам крышыцца, танчэе.

стар. 16



ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# КАПРАМОНТ — ПА СПРАВЯДЛІВАСЦІ

*Спікер верхняй палаты беларускага парламента правёў сустрэчу з насельніцтвам*

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, наведаў сярэднюю школу № 51 г. Мінска і правёў сустрэчу з насельніцтвам Ленінскага раёна сталіцы. Падчас падзеі ён азнаёміўся з умовамі навучання школьнікаў, новымі тэхналогіямі, якія асвоены ва ўстанове адукацыі: электроннай «картай навучэнца», анлайн-сэрвісам «электронны журнал», сэнсарным пакоем, інтэрактыўнай пляцоўкай, гімнастычнай залай са скаладромам. Усяго ў сярэдняй школе каля тысячы навучэнцаў, з іх 37 % — дзеці са шматдзетных сем'яў.**

Падчас наведвання абмяркоўваліся пытанні бюджэтнага фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Так, усе мінскія школы плануецца перавесці на нарматыўнае фінансаванне ў 2019 годзе. Міхаіл Мясніковіч лічыць правільным укараненне нарматыўнага фінансавання па прынцыпе «грошы ідуць за вучнем», калі сродкі з бюджэту выдзяляюцца ў залежнасці ад колькасці вучняў. Адпаведны эксперымент арганізаваны ва ўстановах адукацыі ў розных рэгіёнах Беларусі. Пры гэтым базавы нарматыў на аднаго навучэнца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у гарадах, устаноўлены ў памеры 1,4 тыс. рублёў у год, у сельскіх населеных пунктах — у памеры 3,1 тыс. рублёў у год.

У школе Міхаіл Мясніковіч правёў сустрэчу з насельніцтвам Ленінскага раёна Мінска. Падчас яе старшыні Савета Рэспублікі былі адрасаваныя пытанні, якія датычаццa будаўніцтва жылля, работы службы 115, ЖЭС і інш. Многіх хвалявала пытанне капітальнага рамонту жылых дамоў. «Нам трэба ўважліва падыходзіць да капітальнага рамонту жылфонду, — заявіў Міхаіл Мясніковіч. — Бо цалкам справядлівы будуць зусім людзей пра грошы, якія яны адлічвалі на капрамонт раней. Адпаведныя прапановы ўжо ўнесены ў Саўмін: павінен быць распрацаваны як мінімум пяцігадовы план капітальнага рамонту жылога фонду». Пры гэтым на кожным доме неабходна прыняць індывідуальнае рашэнне: якая частка капрамонту будзе зроблена за кошт жыхароў, а якая за кошт бюджэту.

# ПРЫВІТАННЕ З ГЕРМАНІІ

*Беларуская дэлегацыя наведала ФРГ*

**З 28 студзеня па 1 лютага адбываўся візіт у Германію беларускай дэлегацыі пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Савета Рэспублікі, Нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яны Шчоткінай.**



Візіт ажыццяўляецца з мэтай наладжвання ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і ФРГ, абмену вопытам у сферы дасягнення Мэт устойлівага развіцця і пашырэння парламенцкіх кантактаў пры садзейнічанні Праграмы развіцця ААН і Праграмы падтрымкі Беларусі Федэратыўнай Рэспублікі Германія. Беларускі бок правёў шэраг сустрэч з прадстаўнікамі міністэрстваў і грамадскіх аб'яднанняў.

# КАРЭЙСКІ ВЕКТАР

*Узаемадзеянне ў прыярытэтных сферах*

**У верхняй палаце беларускага парламента адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея Рахманава з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Карэя ў Рэспубліцы Беларусь Кім Ёнг Хо.**

Бакі падрабязна абмеркавалі стан і перспектывы пашырэння беларуска-карэйскага палітычнага, гандлёва-эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням узаемадзеяння ў прыярытэтных сферах — інфармацыйных тэхналогіях, мікраэлектроніцы, робататэхніцы, хімвытворчасці, а таксама ўдзелу карэйскіх кампаній у стварэнні сумесна з беларускімі суб'ектамі гаспадарання прадпрыемстваў і вытворчасцяў. Дасягнута дамоўленасць аб наведванні карэйскім дыпламатам УП «Адані», СТАА «Гейм Стрым».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

ГАЛАСУЕМ

# ТЭЛЕФОН У ДАПАМОГУ

## БРСМ і Цэнтральны раён сталіцы распрацавалі мабільныя праграмы да выбараў

**Як зацікавіць моладзь прыйсці прагаласаваць? Вядома, даць усю інфармацыю ў рукі, а дакладней — у тэлефон. Напярэдадні выбараў з'явілася дзве праграмы, якія, як гавораць распрацоўшчыкі, дапамогуць разабрацца, дзе ваш участак. Пратэсціруем?**

Першая, код да якой напісаў студэнт другога курса БДУІРа, называецца «Голосую!». Адкрыўшы яе, неабходна ўвесці сваю вуліцу і нумар дома. Далей — убачыце (адразу з фота), колькі кандыдатаў зарэгістравана на вашым участку. (Напрыклад, на маім — чатыры). На старонцы кожнага з кандыдатаў можна даведацца год нараджэння, месца працы і жыхарства, членам якой партыі з'яўляецца. На Яндэкс.Картах паказана месца, дзе размешчаны ўчастак для галасавання. Калі ёсць неабходнасць звярнуцца да больш дэталёвай інфармацыі пра выбары, праграма вас перанакіруе на сайт ЦВК, укладку «Выбары-2018». Акрамя таго, ёсць зваротная сувязь з распрацоўшчыкам.

З маім адрасам усё працуе добра, але вось на спробу ўвесці, напрыклад, вуліцу Петруся Броўкі, праграма не адгукаецца, не паведамляе пра памылку, а калі ўводзіш з кропкай (П. Броўкі), проста «вылятаеш». Вядома, праграмістам ёсць над чым тут папрацаваць. У цэлым жа штука карысная. Асабліва, калі дэпутаты не праяўляюць актыўнасці на месцах — дапамагае хоць бы пазнаёміцца з імі.

Каб палепшыць яе, можна было б дадаць, напрыклад, час работы ўчастка. У ідэале — яшчэ і тэзісы кандыдатаў, каб выбаршчык, зазірнуўшы ў тэлефон, мог адразу пачытаць і вырашыць, за каго ён галасуе.

Другая праграма — «Голосуй в Центральном». Ад раёна Мінска, які актыўна вядзе «твітар» і адказвае сваім падпісчыкам, можна было чакаць нешта сучаснае. І сапраўды праграма даволі простая, карысная, працуе анлайн. На этапе ўводу дамашняга адраса — калі ён няправільны ці праграма яго не распазнае — прапануе праверыць яшчэ раз ці звярнуцца да спіса, дзе ўказаны нумары і адрасы ўсіх участкаў для галасавання раёна і адпаведна тэрыторыі, да якіх яны адносяцца. Далей адразу паказвае карту з маршрутам. Калі неабходна, па спасылцы можна перайсці на Яндэкс.Карты і паглядзець, як праехаць.




Праграма добра вырашае сваю задачу: паказаць, дзе знаходзіцца ўчастак для галасавання. Але ўсё ж такі хацелася б ад яе большага — пашыраных функцый і інфармацыі, пра кандыдатаў (фота, месца працы і г. д.).

Абедзве праграмы на Google Play Market ужо маюць каментарыі і адзнакі. Першая — 3,9, другая — 4,2. Ёсць і добрыя, і негатыўныя. Напрыклад, па запісе: «Простая і зразумелая праграма. Аказваецца, мой участак пераехаў, а я і не ведала. Дзякуй распрацоўшчыкам!» — зразумела, што гэты накірунак можна развіваць, бо ён запатрабаваны. У ідэале хацелася б бачыць праграму, якая змога даць адказ аб сваім участку не толькі мінчанам, але і ўсім беларусам. Пры гэтым было б карысна, каб, напрыклад, яна абнаўлялася да кожных выбараў: спампаваўшы аднойчы, карыстальнік заставаўся б заўсёды ў курсе.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ВЫБАРЫ–2018: ПЫТАННЕ З НАГОДЫ

# ХТО ЁН — АБРАННІК НАРОДА?

**18 лютага адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Мы пацікавіліся ў нашых чытачоў, якімі якасцямі, на іх думку, павінен валодаць дэпутат мясцовых Саветаў і якія праблемы яму неабходна вырашаць?**

**Іван САВЕРЧАНКА, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар:**

— Па-першае, дэпутат павінен быць актыўным і энергічным. Галоўнае, каб ён меў унутранае памкненне, каб гэта былі яго жаданне і мара. Калі так, то ён здолее выконваць свае абавязкі ў поўнай меры. Менавіта жаданне з'яўляецца вызначальным у маім разуменні. Дэпутацкіх месцаў хапае, таму я лічу, што ўсе неабыякавыя трапяць на гэтыя пасады.

Дэпутаты павінны вырашаць праблемы мясцовага парадку: напрыклад, каб своечасова адбываўся капітальны рамонт будынкаў, каб у дварах было прыбрана. Гэта штодзённыя чалавечыя клопаты, таму дэпутат не можа проста «сядзець». Мне здаецца вельмі добрым, што ў нас ёсць такая форма народаўладдзя — мясцовыя Саветы дэпутатаў. Мы абавязаны выбраць найлепшых.

Сам я не звяртаўся да дэпутатаў — і гэта вельмі добра: калі людзі ўладу не турбуюць, значыць, яна робіць усё неабходнае для іх. Галоўнае — не дэманстрацыя дасягненняў, а спакойная сістэмная праца.

Ці паверыце, раней я сам хацеў стаць дэпутатам, але зразумеў, што гэта занадта клопатны занятак, на які патрэбны час і энергія. У дэпутаты трэба ісці моладзі: калі хлопцы і дзяўчаты будуць задзейнічаны ў розных грамадскіх працэсах, то яны змогуць хутчэй рэалізаваць свае таленты і жаданні, зрабіць нашу краіну лепшай.

**Дар'я КУЛАЙ, аператар машыннага даення ААТ «Агра-сад Рассвет» Брэсцкага раёна:**

— Па-мойму, дэпутат мясцовага Савета павінен быць менавіта са сваіх, мясцовых, каб ведаў нашы праблемы, гэта значыць, быў кампетэнтны. А яшчэ меў смеласць выступіць на любым дэпутацкім форуме і тыя самыя праблемы альбо пытанні агучыць. Ну і, вядома, народнаму абранніку неабходна быць аўтарытэтным сярод аднавяскоўцаў. Калі патэнцыйнага кандыдата паважаюць у калектыве па месцы яго працы, то і ў вёсцы пра гэта ўсе ведаюць. Значыць, яму належыць быць добрым работнікам.

Дэпутат сельскага Савета павінен вырашаць жыццёвыя, бытавыя праблемы сваіх выбаршчыкаў. Скажам, трэба добраўпарадкаваць кавалак дарогі ў нейкім канкрэтным завулку. Дэпутат можа, па-першае, узняць гэтае пытанне на сесіі сельскага Савета, а па-другое, арганізаваць жыхароў. Іншым разам бывае дастаткова правесці суботнік, падправіць агароджу, падсыпаць яму талакой. А калі спатрэбіцца тэхніка, тады ўжо сельвыканкам дапаможа.

**Андрэй БОРКА, старшыня жыллёва-будаўнічых кааператываў, г. Гродна:**

— Дэпутат павінен быць ініцыятыўны і разам з тым адкрыты для людзей, павінен ведаць праблемы сваіх выбаршчыкаў і даводзіць іх да адпаведных службаў. А сваім выбаршчыкам даваць справаздачу аб ходзе работы і рашэнні гэтых праблем.

Дэпутат — гэта медыйная персона, мы павінны бачыць яго ў тэлевізійным эфіры, чуць па радыё, чытаць аб ім на старонках газет. Дрэнна, калі мы не ведаем сваіх дэпутатаў, а бачым іх прозвішчы толькі падчас выбараў. І ўжо зусім нікуды не варта, калі дэпутат мае зносіны толькі праз свайго памочніка, а яго нумар увесь час недаступны. З такім фактам прыйшлося таксама сутыкнуцца.

Што датычыцца гродзенскіх дэпутатаў, ім трэба звярнуць увагу на турыстычны патэнцыял горада. Зараз Гродна стаў бязвізавым, сюды прыязджае шмат турыстаў, таму трэба шукаць шляхі паляпшэння ўмоў іх знаходжання. Не пакідаць без увагі гістарычныя помнікі, якія могуць знікнуць, падтрымліваць людзей у імкненні да захавання нашай спадчыны. І ўвогуле, дэпутат павінен быць неабыякавы да горада, да той акругі, якая абрала яго сваім прадстаўніком. Ён павінен разумець, што калі стаў на гэту прыступку, то становіцца сапраўды абаронцам тых людзей, у інтарэсах якіх працуе. Каб людзі не гублялі спадзяванняў пры звароце да дэпутата і не лічылі гэту сустрэчу марна патрачаным часам.

**Марыя ВОЛКАВА, жыхарка г. п. Янавічы Віцебскага раёна, пенсіянерка, былая работніца сістэмы ЖКГ:**

— Народны абраннік павінен быць сумленным чалавекам. І, калі нешта абяцае, няхай стараецца выканаць, дапамагчы людзям вырашыць пэўныя праблемы. Якія?

Напрыклад, з якасцю вады. Чаму цячэ ржавая вада з кранаў кватэр шматпавярховых дамоў у населеным пункце? Я жыву на трэцім паверсе трохпавярховага дома ў двухпакаёвай кватэры, у гэтак званай хрушчоўцы. Ёсць яшчэ два трохпавярховыя дамы, чатыры двухпавярховыя, інтэрнат... І ва ўсіх з кранаў цячэ ржавая вада са спецыфічным пахам... Наколькі я ведаю, земляки звярталіся да прадстаўнікоў мясцовай улады. У адказ ім растлумачылі, што трэба замяніць абсталяванне для ачысткі вады, але грошай на гэта няма... А яшчэ ў маім жыллі холадна нават у ацяпляльны сезон.

КАМПЕТЭНТНА

# ІТ, ФАРМАЦЭЎТЫКА, ЗЯЛЁНАЯ ЭКАНОМІКА

## Да якіх сфер маюць інтарэс замежныя інвестары?

**Спецыяльна для «МС» Міхаіл ДАШУК, намеснік дырэктара Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Беларусі, расказаў, калі нам чакаць росту прывабнасці айчыннага інвестклімату.**



***— Якія сферы эканомікі краіны найбольш прывабныя для замежных інвестараў і чаму?***

— Гэта — інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, машынабудаванне, фармацэўтыка, аграпрамысловы комплекс, банкаўская сфера. У свеце значны попыт на прафесійныя паслугі ў сферы высокіх і інфармацыйных тэхналогій. І вось тут Беларусь па-сапраўднаму змагла праявіць сябе: у 2016 годзе экспарт ІТ-паслуг на душу насельніцтва склаў 100,76 долара ЗША. Па гэтым паказчыку мы пераўзыходзім такіх гігантаў, як ЗША (52,84), Індыя (39,24), Карэя (46,25).

Безумоўна, у гэтым дапамагае Парк высокіх тэхналогій — прэферэнцыйны рэжым, які дзейнічае на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Гэта дазваляе замежным інвестарам значна эканоміць і робіць беларускую ІТ-індустрыю прывабнай для прытоку замежных інвестыцый.

Нядаўна быў прыняты Дэкрэт № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі», які стварае беспрэцэдэнтныя ўмовы для развіцця ІТ-галіны і дае сур'ёзныя канкурэнтныя перавагі краіне ў стварэнні лічбавай эканомікі, па сутнасці, ператвараючы Беларусь у адну з самых камфортных краін у свеце для вядзення ІТ-бізнесу. Думаю, гэты дэкрэт выкліча значны рост цікавасці патэнцыйных партнёраў да работы ў Беларусі.

Традыцыйна інтарэс інвестараў засяроджаны на галіне машынабудавання. Тут мы можам казаць аб стварэнні сумесных з транснацыянальнымі карпарацыямі прадпрыемстваў, міжнародных альянсаў у сектары вытворчасці аўтакампанентаў, сельскагаспадарчага машынабудавання, зборачных вытворчасцяў грузавога аўтамабільнага транспарту. Сёння тавары гэтай галіны пастаўляюцца ў 90 краін свету.

Працягвае расці і цікавасць замежных інвестараў да беларускай банкаўскай сістэмы. У краіне створаны сур'ёзны зачын у развіцці патэнцыйна новых, высокатэхналагічных напрамкаў: атамнай энергетыкі, касмічнай, біятэхналагічнай галін.

Апошнім часам замежныя інвестары праяўляюць усё большую цікавасць да зялёнай эканомікі. Гаворка ідзе пра супрацоўніцтва ў развіцці электратранспарту і гарадской мабільнасці, рэалізацыю канцэпцыі «разумных» гарадоў, будаўніцтва энергаэфектыўных жылых дамоў і павышэнне энергаэфектыўнасці жыллёвага фонду.

> Адкрываючы вытворчасць у Беларусі, замежны інвестар мае беспераашкодны выхад і на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза, а гэта каля 182 мільёнаў спажыўцоў.

Таксама назіраецца цікавасць інвестараў да фармацэўтычнай галіны, што абумоўлена вялікай ёмістасцю рынку збыту ў краінах ЕАЭС, кваліфікаваным персаналам, а таксама навуковым патэнцыялам біятэхналагічнай галіны. Гаворка ідзе аб распрацоўках у галіне геномных біятэхналогій, ветэрынарыі, аграрных біятэхналогій.

***— Якія краіны з'яўляюцца найбольш актыўнымі інвестарамі ў беларускі капітал?***


Фота БЕЛТА.
На заводзе «Мінскінтэркапс».

— Сёння больш за 60 краін інвестуюць у Беларусь. Гістарычна склалася, што нашым асноўным гандлёвым і інвестыцыйным партнёрам з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Бізнесмены названага рэгіёна не сустракаюць лінгвістычных і камунікацыйных бар'ераў падчас работы ў нашай краіне.

Таксама на працягу апошніх гадоў актыўнымі прамымі інвестарамі ў Беларусь з'яўляюцца і краіны Еўрапейскага саюза: на іх долю ў розныя гады прыпадала па 45—55 % ад агульнага аб'ёму прамых замежных інвестыцый.

***— Наколькі актыўныя замежныя інвестары сёння прыходзяць у Беларусь і калі, на ваш погляд, можна чакаць росту інвестыцый у беларускую эканоміку?***

— Сёння для актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці на заканадаўчым узроўні зроблена шмат. У Беларусі створаны і паспяхова функцыянуюць прывабныя для інвестараў падатковыя рэжымы, гарантуюцца бяспека і абарона інвестыцый.

Ствараючы сумесныя кампаніі, адкрываючы вытворчасць у Беларусі, замежны інвестар мае беспераашкодны выхад і на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза, а гэта каля 182 мільёнаў спажыўцоў і сур'ёзны чалавечы, рэсурсны і навукова-тэхнічны патэнцыялы.

Магу сказаць, што апошнім часам у інвестыцыйнай сферы адбываецца ажыўленне. Думаю, што ўжо ў гэтым годзе можна чакаць рост інвестыцый у беларускую эканоміку. Калі параўноўваць з 2016 годам, то толькі за студзень—верасень 2017-га рост аб'ёму прамых замежных інвестыцый у нашу краіну склаў 108,6 % да аналагічнага перыяду мінулага года.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# КЛІМАТ, ПРЫДАТНЫ ДЛЯ ІНВЕСТАРА

**У апошнія гады інвестыцыі ў беларускую эканоміку, як замежныя, так і ўнутраныя, крыху запаволіліся. Як падысці да гэтай праблемы парламентарыям? Зразумела ж, адаптаваць пэўныя законы да патрэб дня. Так, Пастаянная камісія па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прапанавала ўнесці змены ў Закон «Аб інвестыцыях». Законапраект быў падрыхтаваны і ўнесены дэпутатамі Аляксеем Сокалам і Уладзіславам Шчэпавым.**



На думку **старшыні Камісіі Уладзіслава ШЧЭПАВА**, праблема прыцягнення інвестыцый для Беларусі вельмі актуальная. «У сваім Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 21 красавіка 2017 года кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на сённяшні дзень наша жыццёвая неабходнасць — гэта нарошчванне экспарту і прыцягненне інвестыцый. Замежныя інвестыцыі — рэальны прыток недаўгавога знешняга фінансавання, які мог бы быць накіраваны на стварэнне новых высокапрадукцыйных працоўных месцаў для зніжэння напружанасці на рынку працы, скарачэння беспрацоўя і павелічэння занятых у эканоміцы. Кіраўнік дзяржавы адзначыў таксама ў сваім выступленні, што для прыцягнення інвестыцый неабходна мяняць стаўленне да інвестараў», — нагадаў дэпутат.

Адным з ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы ўрада і Нацыянальнага банка з'яўляецца прыцягненне прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове. На 2017 год было запланавана 1,4 млрд долараў. Па стане на студзень—верасень прыцягнута каля 900 млн долараў. «І такія запланаваныя і фактычныя аб'ёмы інвестыцый для эканомікі Рэспублікі Беларусь недастатковыя», — упэўнены парламентарый. Пры гэтым у структуры крыніц інвестыцый больш за 90 % займаюць уласныя крыніцы фінансавання, а таксама крэдытныя рэсурсы, а не прамыя (у тым ліку замежныя) інвестыцыі. Па аб'ёме назапашаных прамых замежных інвестыцый на душу насельніцтва за 20 гадоў Беларусь больш чым у пяць разоў адстае ад Еўрапейскага саюза і больш чым у два разы — ад Казахстана.

Фактарамі, якія ўплываюць на аб'ёмы інвестыцый, з'яўляюцца іх прыбытковасць і рызыкоўнасць, агульны інвестыцыйны клімат. На паляпшэнне апошняга і накіраваны прапанаваны законапраект «Аб інвестыцыях».

«Законапраектам прапануецца дапоўніць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях» артыкулам 12. Ён вызначае **ўмовы кампенсацыі кошту маёмасці**, якая з'яўляецца інвестыцыямі або якая ўтвараецца ў выніку ажыццяўлення інвестыцый, на аснове аналагічных нормаў, якія змяшчаюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь. Дзейны закон замацоўвае, што маёмасць, якая з'яўляецца інвестыцыямі або ўтвараецца ў выніку ажыццяўлення інвестыцый, не можа быць бязвыплатна нацыяналізавана або рэквізавана. Аднак у ім не раскрываюцца крытэрыі і ўмовы такой кампенсацыі», — тлумачыць старшыня камісіі.

Разам з тым большасць міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь аб садзейнічанні ажыццяўленню і ўзаемнай абароне інвестыцый, заключаных з іншымі дзяржавамі, змяшчаюць нормы, якія прадугледжваюць выплату інвестару адэкватнай і эфектыўнай кампенсацыі ў выпадку нацыяналізацыі, экспрапрыяцыі або прымянення іншых мер, дзеянне якіх непасрэдна ці ўскосна эквівалентна нацыяналізацыі або экспрапрыяцыі, а таксама вызначаюць крытэрыі такой кампенсацыі.

> Па аб'ёме назапашаных прамых замежных інвестыцый на душу насельніцтва за 20 гадоў Беларусь больш чым у пяць разоў адстае ад Еўрапейскага саюза і больш чым у два разы — ад Казахстана.

Таму было прапанавана ўвесці ўніверсальную норму для любых інвестараў, незалежна ад краіны паходжання інвестыцый і наяўнасці двух- або шматбаковых дагавораў. Акрамя таго, у цэлым шэрагу міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь аб садзейнічанні ажыццяўленню і ўзаемнай абароне інвестыцый прадугледжваецца магчымасць узаемнай адмовы дзяржаў, якія іх заключылі, ад імунітэту ў дачыненні да спрэчак з прыватнымі асобамі іншай дзяржавы.

Аналіз заканадаўства Рэспублікі Беларусь сведчыць аб тым, што пытанні, звязаныя з формамі адмовы дзяржавы ад імунітэту, урэгуляваны толькі часткова. У той жа час наяўнасць у нацыянальным інвестыцыйным заканадаўстве палажэнняў аб магчымасці адмовы дзяржавы ад юрысдыкцыйнага імунітэту заклікана павысіць інвестыцыйную прывабнасць краіны.

У сувязі з гэтым праектам прапануецца ўключыць у закон аб інвестыцыях норму аб магчымасці замацавання ў дагаворах з інвестарамі адмовы дзяржавы ад юрысдыкцыйнага імунітэту ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Але гаворка ідзе не пра безумоўную аўтаматычную адмову ад імунітэту. У кожным канкрэтным выпадку пры заключэнні канкрэтнага дагавора інвестар можа прапанаваць унесці ў дагавор такую норму, а дзяржава ў асобе адпаведных органаў можа, але не абавязана пагадзіцца з такой прапановай інвестара.

Але Уладзімір Шчэпаў лічыць, што гэтых мер недастаткова. Неабходна і надалей уносіць прапановы па паляпшэнні інвестыцыйнага заканадаўства.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

УЗРОВЕНЬ

# З КАМФОРТАМ ДЛЯ КАРОВЫ

## У Кіраўскім раёне Магілёўскай вобласці будуецца ферма новага пакалення з выкарыстаннем перадавых тэхналогій



Кіраўнік гаспадаркі Аляксандр БАГЕЛЬ.

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Світанак» імя К. Арлоўскага — гаспадарка шматпрофільная. Вырошчваюцца яблыкі, агуркі, бульба, буракі, збожжавыя, кукуруза, нават рыбу разводзяць. Але акцэнт зроблены на жывёлагадоўлю. Ужо сёння тут надойваюць па 6,5 тысячы тон малака на карову, але гэта не мяжа. Новая ферма дасць магчымасць павысіць гэты паказчык як мінімум на тысячу. А заадно яшчэ больш загрузіць біягазавую ўстаноўку, якая тут працуе. Гэта будзе магутны комплекс з замкнутым цыклам. Да пачатку верасня ферму ўжо збіраюцца ўвесці ў эксплуатацыю. У нашага карэспандэнта была добрая магчымасць пагутарыць з кіраўніком гаспадаркі, а заадно паназіраць за ходам будаўніцтва.**

### ВІДАВОЧНАЯ ВЫГАДА

Задумка стварыць у вобласці ферму, на прыкладзе якой будуць дэманстравацца найлепшыя дасягненні ў сферы сельскай гаспадаркі, даўно лунала ў паветры. «Світанак» падышоў для гэтага з усіх бакоў. І ў першую чаргу дзякуючы біягазавай установцы, якая тут функцыянуе. Але зараз яе магутнасці выкарыстоўваюцца на 75 %. Новая ферма будзе пастаўляць на ўстаноўку каля 30 % арганічных угнаенняў, якія па тэхналогіі адпавядаюць усім існуючым патрабаванням. З кароўнікамі ўстаноўка будзе злучацца спецыяльнымі калектарамі.

— Выгада відавочная, — запэўнівае дырэктар гаспадаркі Аляксандр Багель. — Ферма разлічана на 768 галоў дойнага статка, але з улікам цялят там будзе знаходзіцца больш чым 1000 галоў. Увесь гной ад статка пойдзе на перапрацоўку, а ўзамен ферма атрымае цяпло, якое ўтвараецца ад работы рухавікоў установы. Нам не прыйдзецца будаваць для абагрэву даільнага аддзялення спецыяльную кацельную.

> Больш цывільнымі стануць і ўмовы працы для абслугоўвання персаналу. Самы галоўны плюс кіраўнік бачыць у тым, што атрымаецца, нарэшце, пазбавіцца ад нязручнай даільнай ямы, у якую даяркам прыходзілася спускацца, каб падаіць карову. Пра гэта на новай ферме можна будзе канчаткова забыць.

—Такой даільнай залы ў Магілёўскай вобласці адназначна нідзе пакуль няма, — кажа Аляксандр Іванавіч. — У ёй абсалютна ўсё будзе аўтаматызавана. Абсталяванне самае перадавое, еўрапейскай фірмы «ДэЛаваль».

Першая чарга МТФ уводзіцца ўжо ў лютым, у канцы сакавіка — пачатку красавіка — другая, цалкам комплекс будзе здадзены ў ліпені—жніўні. Але камплектацыя жывёламі пачынаецца ўжо з лютага.

Аб'ект будуецца з дапамогай дзяржавы, яго кошт больш за 10,5 мільёна рублёў. Акрамя двух кароўнікаў, узводзіцца даільна-малочны блок, радзільнае аддзяленне, блок дапаможных памяшканняў, адкрыты і крыты прафілакторыі для маленькіх цялят, станцыя перапампоўвання сцёкаў, дапаможныя памяшканні.

### ВОПЫТ ПЕРАЙМАЛІ ЗА МЯЖОЙ

— Што датычыцца фермы, то мы збіраемся выкарыстаць тут самыя сучасныя тэхналогіі, якія бачылі і ў Беларусі — на перадавых комплексах, і за мяжой, — расказвае Аляксандр Багель. — Я разам з нашымі спецыялістамі і будаўнікамі некалькі разоў выязджаў у Польшчу, Калінінградскую вобласць, Рыгу, глядзелі прынцып дзеяння, асноўныя элементы, якія на падобных фермах выкарыстоўваюць. Гэта зусім іншы ўзровень! Тут табе і цёплая падлога, і новыя падыходы ў даенні, і зусім іншыя ўмовы ўтрымання жывёл.

> «Калі мы хочам павысіць вытворчасць малака, нам трэба гэта ўкараняць паўсюдна. Наша ферма стане пляцоўкай, дзе будуць адпрацоўвацца найноўшыя тэхналогіі. Каб усе бачылі, у якім кірунку трэба рухацца. У Горках на базе вучэбнай гаспадаркі таксама ёсць перадавая ферма. Але ў нас будзе частка новых момантаў, якіх там няма».

Кадравае пытанне ў гаспадарцы прапрацавалі загадзя: падрыхтаваны спецыялісты, якія ўжо цалкам гатовы прыступіць да работы ў новых умовах. У асноўным гэта свае работнікі, якія ў сельскай гаспадарцы не першы год і вопыту ім не займаць. Дадаткова ствараюцца і новыя працоўныя месцы. Стаўка робіцца на маладых спецыялістаў, але найбольш перспектыўных. Праца на новай ферме прэстыжная, трэба, каб і кадры былі на ўзроўні. Умовы для іх тут таксама ствараюцца — па суседстве з новай фермай поўным ходам ідзе будаўніцтва трох новых жылых дамоў.

### ПРАЦУЕМ У ТРЫ ЗМЕНЫ

Работа на будаўнічай пляцоўцы кіпіць, будаўнікі з Магілёва і Кіраўска не прыпыняюць яе нават ноччу. Усё павінна быць здадзена ў тэрмін. Вялікія ангары, траншэі, горы пяску — да завяршэння будаўніцтва яшчэ некалькі месяцаў, але ўжо можна ўявіць сабе, якой будзе новая ферма. Знаёміцца з аб'ектам дапамагаюць **намеснікі дырэктара Аляксандр СУХАДОЛЬСКІ і Наталля ШАПАВАЛАВА.** Насупраць ангара, дзе будзе кароўнік № 1, агароджаныя пляцоўкі. «Гэта сіласныя ямы для закладкі корму для кароў, — тлумачыць Аляксандр Мікалаевіч. — Побач размесціцца кормапрыгатавальная. Цагляны будынак з боку кароўніка — радзільнае аддзяленне. У перспектыве пабудуем цялятнік — для маладняку да 90 дзён».

Намеснік дырэктара ўводзіць у курс, як будуць функцыянаваць дапаможныя памяшканні, адкуль і куды павінны перамяшчацца каровы, як праводзіцца поўны цыкл узнаўлення статка. Яшчэ адзін цагляны будынак — гэта той самы малочны блок, дзе паставяць сучаснае еўрапейскае абсталяванне. З яго дапамогай ёсць магчымасць яшчэ вышэй падняць якасць малака і яго аб'ёмы. Наогул, тут прадумана ўсё да дробязяў. Робіцца так, каб сэканоміць сродкі і паскорыць працэс.

— Пляцоўка для новай фермы выбрана з такім разлікам, каб была сувязь не толькі з біягазавай установай, але і з астатнімі аб'ектамі гаспадаркі, — кажа Аляксандр Сухадольскі. — Адсюль бліжэй і да фермаў далучанага да «Світанка» некалькі гадоў таму калгаса імя Кірава. За кошт іх цялят і кароў таксама будзем камплектаваць тутэйшы статак. З другога боку — тэхналагічная дарога яшчэ да адной фермы. Адным словам, новы аб'ект сюды напрошваўся з самага пачатку. Яшчэ калі працавалі над біягазавай устаноўкай, немцкі праекціроўшчык казаў, што нам тут абавязкова трэба будаваць ферму. Працай будзе «біягаз» папаўняць, энергію забіраць, цяпло размяркоўваць.

### І НАВАТ ДУШ

Кароўнік № 1 зараз камплектуецца ўсім неабходным. Выглядае ён сапраўды па-сучаснаму. Аляксандр Сухадольскі звяртае ўвагу на прыступку перад кармушкамі. Яна зроблена для таго, каб карова пярэднімі нагамі стаяла на ўзвышшы. Па словах спецыяліста, карысць двайная. Па-першае, гной застанецца ўнізе і яго працай будзе прыбраць. Па-другое, карове не прыйдзецца перамяшчацца ўсім корпусам, калі па зале будзе рухацца прыстасаванне для прыбірання гною.

— Каб падняць вытворчасць малака, жывёлу трэба менш турбаваць, — тлумачыць намеснік дырэктара. — На фермах гноевыдаленне звычайна ажыццяўляецца трактарам, што вельмі нервуе кароў. Лічыцца, што пры гэтым губляецца малако. У нас замест трактара будзе выкарыстоўвацца дэльта-скрэпер — невысокая планка, якая рухаецца з хуткасцю 4 метры ў хвіліну. Каровы пры гэтым менш палохаюцца.

Стойла вельмі прасторнае, за кошт арачнай формы тут канцэнтруецца больш паветра і цыркулюе яно лепш — для жывёлы гэта таксама вельмі важна. З «ноу-хау» — вялікі светлавы «ліхтар» — акно ўздоўж столі. Зноў жа вельмі правільны падыход. Каровы любяць больш святла — гэта раз, а заадно эканоміцца электрычнасць — гэта два. Хутка ўздоўж кармавога стала з'явіцца сістэма арашэння, каб у спякоту асвяжаць кароў паветрана-водным шляхам. Сістэма, дарэчы, ужо закуплена, засталося змангціраваць.

У даільнай зале каровы таксама будуць адчуваць сябе больш камфортна. Накіроўваць іх на «працоўнае» месца, а потым назад у кароўнік будзе аўтаматычны падгоншчык жывёлы вытворчасці кампаніі «ДэЛаваль». Вельмі карыснае прыстасаванне, якое не траўмуе псіхіку каровы.

> — Для жывёлы ствараюцца спрыяльныя ўмовы: нічога яе не пужае, яна не хварэе, вольна дыхае. У выніку надоі растуць, гаспадарка, а з ёй і дзяржава багацеюць. Гэта тое, да чаго мы ўсе імкнёмся, — кажуць у агрогаспадарцы «Світанак».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Яўгенія ПІШЧАЛІНА.**



У кароўніку № 1 ідзе камплектацыя абсталявання.

# ВЯЛІКАЕ ПОЛЕ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

***— Учым, Аляксандр Пятровіч, на вашу думку, заключаюцца асноўныя складанасці работы сельскагаспадарчай галіны нашай краіны?***

— У сельскай гаспадарцы сёння назіраецца шэраг праблем сістэмнага характару. Гаворка ідзе пра тое, што згаданая галіна залежыць ад дзяржаўных датацый і, нягледзячы на сваю вялікую значнасць, усё яшчэ працуе ў рэжыме нізкай рэнтабельнасці. Патэнцыял аграрнай сферы павінен быць раскрыты куды больш эфектыўна, чым гэта ёсць цяпер. Для гэтага ў нас створаны ўсе ўмовы. Нашым інстытутам прапануецца шэраг важных крокаў на шляху да аздараўлення сельскай гаспадаркі. Адной з найбольш дзейсных мер стала б істотная дзяржаўная падтрымка з улікам патэнцыйных магчымасцяў бюджэту, а таксама абавязацельстваў па зніжэнні гэтай падтрымкі пры ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Што датычыцца рэальнай дзяржаўнай падтрымкі суб'ектаў нашай аграрнай галіны, то яна на парадак саступае той, якую атрымліваюць заходні фермер, і ў значнай ступені можа быць паявлічана за кошт пазабюджэтных сродкаў, што з'яўляецца вельмі неабходным зараз. Гаворка ідзе аб стварэнні рэспубліканскага фонду падтрымкі сельскагаспадарчых таваравытворцаў, у фарміраванні якога, мы мяркуем, павінны ўдзельнічаць не толькі асноўныя партнёры аграрнай галіны, але і прадпрыемствы іншых галін эканомікі.

***— Што менавіта будзе фінансаваць гэты фонд?***

— Мы разлічваем, што ён дазволіць пераразмеркаваць фінансавыя патокі на карысць сельскай гаспадаркі — частку з іх неабходна накіроўваць на пагашэнне назапашаных абавязкаў у максімальна кароткія тэрміны. Гэта ў спалучэнні з актыўным прымяненнем на практыцы палажэнняў Указа Прэзідэнта № 253 «Аб мерах па фінансавым аздараўленні сельскагаспадарчых арганізацый» будзе спрыяць пераломy ў лепшы бок існуючай сітуацыі. Нягледзячы на тое, што па выніках 2016 года колькасць стратных сельскагаспадарчых арганізацый скарацілася, тэндэнцыя павелічэння даўгоў не пераадолена, хоць тэмпы іх нарошчвання знізіліся. Важна адзначыць, што аказанне падтрымкі нашай сельскай гаспадарцы са сродкаў згаданага фонду не будзе супярэчыць патрабаванням ЕАЭС і Сусветнай гандлёвай арганізацыі, паколькі яна можа ажыццяўляцца шляхам прамога фінансавання вытворцаў сельгаспрадукцыі з выкарыстаннем мер, якія па міжнародных правілах могуць прымяняцца без абмежаванняў, што немалаважна для такой фонда- і энергаёмістай галіны, як сельская гаспадарка. Акрамя таго, рэсурсы фонду можна выкарыстоўваць для таго, каб аднаўляць сельскагаспадарчую тэхніку, якая мае высокую ступень зносу.

***— Кажучы аб тэхнічным парку, як вы лічыце, на якім узроўні забяспечана галіна?***

— У апошнія гады назіраецца пагаршэнне сітуацыі з забяспечанасцю асноўнымі відамі сельскагаспадарчых машын і абсталявання. Асабліва насцярожвае сітуацыя, якая склалася ў 2016 годзе, калі каэфіцыент выбыцця тэхнікі перавысіў каэфіцыент абнаўлення ад 2 да 4 разоў, а па бураакўборачных камбайнах — у 16 разоў.

> «За апошнія 5 гадоў парк трактароў скараціўся на 9,1 %, грузавых аўтамабіляў і збожжаўборачных камбайнаў — больш чым на 17 %. Вядома, узамен старых машын сельскагаспадарчыя арганізацыі атрымліваюць новыя, энерганасычаныя. Аднак гэта не з'яўляецца паўнавартаснай кампенсацыяй».

Выходам з такога становішча я бачу нарошчванне паставак тэхнікі праз лізінгавыя схемы і развіццё другаснага рынку сельскагаспадарчых машын. Мэтазгодна таксама

# САМЫ ЛЕПШЫ МОМАНТ

## Глабальная дакументалістыка Настассі Мірашнічэнкі

**Часам, каб пра беларускае кіно гаварылі і глядзелі на радзіме, яму даводзіцца падарожнічаць па свеце. Дакументальныя фільмы Настассі МІРАШНІЧЭНКІ — прыклад менавіта такой гісторыі: яны дэбютуюць на прэстыжных замежных фестывалях, знаходзяць фінансаванне ў Еўропе, нават ператвараюцца ў сацыяльныя праекты. Рэжысёр расказала, дзе знайсці білет на «Каны дакументалістыкі» і як забяспечыць бліскучай будучыняй дакументальнае кіно.**


Фота 34mag.net.

***— Дакументалістыка лічыцца справай нежаночай, чаму вырашылі працаваць менавіта з неігравым кіно?***

— Маім першым фільмам было «Скрыжаванне», і я зняла яго ў нейкім сэнсе насуперак. Таму што праца на тэлебачанні — адмысловы фармат, стылістыка, хранаметраж, і гэта, бясспрэчна, не дакументалістыка, хоць у нас многія лічаць, што гэтыя паняцці тоесныя. Таму мне вельмі хацелася зрабіць СВАЁ дакументальнае кіно: па-за фарматам і іншымі абмежаваннямі, словам, уласнае выказванне. Ужо тады ў мяне была ўпэўненасць, што дакументалістыка — гэта не проста аповед пра героя, але і спроба зразумець сябе, пазмагацца з сабой і, магчыма, нават змяніць погляд на нейкія рэчы.

***— Рэжысура для вас не толькі праца, але і спецыяльнасць. Як лічыце, ці быў каштоўным час, які правялі ў Акадэміі мастацтваў?***

— У Акадэміі мастацтваў я вучылася на курсе Гаравога, і гэта не першая мая адукацыя, таму ішла ў рэжысуру свядома: дагэтуль працавала ў прыватных кампаніях і на тэлеканале «МІР» (дзе працую і цяпер) рэжысёрам тэлебачання. Я б нават назвала рэжысуру наканаваннем: яшчэ ў дзяцінстве маці казала, што мне трэба быць рэжысёрам, бо я любіла творчасць, іграла ў тэатральнай студыі, але мне лягчэй было з арганізацыйнай яе часткай. У акадэмію я пайшла, таму што ўпэўнена: калі ты знайшоў сваю прафесію, трэба авалодаць не толькі практычнымі навыкамі, але і тэарэтычнай базай. Складана сказаць, ці адчуваецца карысць дыплома Акадэміі мастацтваў, бо ў мяне яшчэ да яго атрымання быў працоўны досвед. Але дакладна магу сказаць, што практыка ўсё ж каштоўнейшая за любую тэорыю: трэба набіваць руку, папрацаваць з прафесіяналамі, і гэта нашмат больш эфектыўны спосаб наблізіцца да прафесіі. Тым не менш у акадэміі я пазнаёмілася з выкладчыкамі і калегамі, якія зрабілі пэўны ўнёсак у маё развіццё як рэжысёра.

***— Мяркуючы па героях фільмаў, вас цікавяць «маленькія людзі». Чаму?***

— Так, «маленькі чалавек» у фокусе, але ён заўсёды ў няпростых жыццёвых абставінах. Мне гэта цікава, бо менавіта такія людзі нагадваюць пра тое, што невядома, як кожны з нас праявіць сябе ў крызіснай сітуацыі. Гэта актуальна, таму што такія сітуацыі здараліся раней і здараюцца зараз, прычым паўсюль! Варта ўспомніць войны: падчас іх людзі таксама знаходзяцца на шляхах складанага маральнага выбару. Калі рэжысёры бяруць у якасці герояў вядомых людзей — гэта прасцей, бо за імі ёсць бэкграўнд, пэўныя дасягненні, а калі чалавек невядомы, яшчэ і ў складанай сітуацыі, то гэтую прыватную гісторыю можна ўзняць да глабальнага ўзроўню, каб кожны глядач штосьці для сябе з фільма вынес.

***— Вашы героі, можна сказаць, з «андэграўнду». Як вы іх знаходзіце?***

— Я сустракаю іх выпадкова! Памятаю, што пра Валерыя Ляшкевіча (бяздомны мастак, герой стужкі «Скрыжаванне». — **Аўт.**) даведалася ў 2008 годзе — прачытала пра яго ў газеце, тэму для фільма «Дэбют» знайшла таксама ў газетным артыкуле. Вярнулася да гэтых тэм толькі праз пяць гадоў, і цікава, што за гэты час ніхто так і не зняў кіно пра іх! Адметна, што гэтыя тэмы не давалі спакою мне ўвесь час: хтосьці распавядаў, ці бачыла я рэпартажы пра іх на тэлебачанні і ў інтэрнэце, аднагрупнік з Гомеля расказаў пра бяздомнага мастака і тэатр у жаночай калоніі. Але гісторыя не такая радасная: мае героі складана пагаджаліся на здымкі. Напрыклад, Ляшкевіч катэгарычна адмовіўся здымацца ў фільме, але праз некалькі дзён я змагла яго пераканаць: паказала праект дакументальнага фільма, зроблены ў выглядзе буклета з фатаграфіямі і карцінамі мастака. Для яго гэта было ўжо свайго роду прызнаннем, і гэты буклет стаў выратаваннем фільма — мастак убачыў, што здымачную групу цікавіць менавіта ён, а не тыя жыццёвыя абставіны, у якіх ён апынуўся.

***— «Скрыжаванне» стала сацыяльным праектам, людзі пасля паказаў пералічвалі на рахунак мастака грошы... Як зрабіць, каб кіно ўплывала на свядомасць гледача і станавілася сапраўдным учынкам?***

— Мы не рабілі наўмысна сацыяльны праект. Фільм стаў рэзанансным, бо ў ім закранулі праблему, да якой немагчыма быць абыякавымі. Я таксама не магла застацца ўбаку: калі ёсць магчымасць дапамагчы героям, я гэта раблю, бо яны за час здымак становяцца маімі сябрамі. За той год, калі «Скрыжаванне» ездзіла па фестывалях, мы арганізавалі выстаўку героя ў Нацыянальным мастацкім музеі, і трэба разумець, што гэтай выстаўкі не было б, каб Ляшкевіч сапраўды не быў выдатным мастаком, музей нават узяў тры яго карціны ў сваю калекцыю! Падчас паказаў людзі таксама не заставаліся абыякавымі, пералічвалі грошы, давалі мне жмені манет у розных краінах пасля паказаў, а мы ў сваю чаргу дарылі рэпрадукцыі карцін тым, хто дапамагаў мастаку. За паўтара года мы сабралі звыш $10 тысяч. Выдатна, што гісторыя гэтага чалавека знайшла такі водгук, цяпер ён можа адчуць стабільнасць, мае апірышча.

***— Рэжысёр-дакументаліст павінен заўсёды шукаць падыход да герояў. Як вы наладжваеце кантакт з «акцёрамі»?***

— Знайсці кантакт з героямі дапамагае час, і толькі. Дакументальнае кіно павінна фіксаваць рэальнасць, таму ненатуральнасць тут недапушчальная. Я прывучаю іх да сябе першыя некалькі месяцаў здымак: заўсёды гатовая да таго, што для фільма я адтуль не вазьму амаль нічога. Стараюся знаходзіць не проста кантакт, але і сяброўства — такія адносіны не бываюць аднабаковыя і хуткія, для гэтага трэба адкрывацца адзін перад адным, «адчуваць» эмацыянальна. Спачатку з героямі размаўляю без камеры, таму што павінна зразумець, наколькі людзі мне блізкія. І калі станецца так, што чалавек не мой, кіно не атрымаецца, таму гэта яшчэ і спосаб пазбегнуць памылкі. Здымаць дакументалістыку — працэс наогул не хуткі і не лёгкі, напрыклад, над фільмам «Надыдзе лепшы час» Ханна Полак працавала 14 гадоў! Таму менавіта час выбудоўвае ў дакументалістыцы гісторыю і жыццё ў развіцці, робіць людзей блізкімі, а кіно — глыбокім.

***— Галіна Адамовіч расказвала, што пакутуе разам са сваімі героямі... Ці атрымліваецца абстрагавацца ад гісторый вашых герояў?***

— У мяне гэта не атрымліваецца наогул! Памятаю свае цяжкія пачуцці пасля здымак «Скрыжавання»: група едзе дамоў, дзе чакаюць сям'я, падушка ды коўдра, дах над галавой, а мой герой застаецца на вакзале ў лепшым выпадку. Магу адзначыць, што «Дэбют» быў яшчэ больш складаны ў маральным плане: скажу шчыра, цяпер я наўрад ці ўзялася б за здымкі такой стужкі. Да гэтых здымак не ведала, што можна плакаць без слёз. Можа, прымала ўсё блізка да сэрца, таму што я сама — маці, дачка і жанчына. Тут я суперажывала не аднаму герою, а адзінаццаці жанчынам, у кожнай з якіх — свая драматычная гісторыя. Але казаць пра складанасці дакументальнага кіно як мінімум непрафесійна...

**«Памятаю свае цяжкія пачуцці пасля здымак «Скрыжавання»: група едзе дамоў, дзе чакаюць сям'я, падушка ды коўдра, дах над галавой, а мой герой застаецца на вакзале ў лепшым выпадку».**

***— Вы бралі ўдзел у многіх фестывалях, прэм'ера «Дэбюту» наогул адбылася на фестывалі IDFA у Амстэрдаме, які называюць «Канамі дакументалістыкі». Чаму фестывалі для рэжысёра — неабходнасць?***

— IDFA — мара кожнага рэжысёра-дакументаліста, і калі я ў думках задавала сабе пытанне: «Ці атрымаецца ў мяне туды трапіць?», адказ быў: «Напэўна, не!» Наогул, фестываль я разглядаю ў першую чаргу як магчымасць паказаць сваё кіно. Гэта надзённая праблема для дакументалістаў у нашай краіне. У нашых кінатэатрах знайсці паказы неігравога кіно амаль немагчыма, у Еўропе — шырокі пракат і поўныя залы. Праблема ў тым, што ў нас пакуль не зразумелі, наколькі дакументалістыка — глабальная з'ява. Менавіта таму хочацца, каб мы расцілі сваю аўдыторыю. Для беларускіх дакументалістаў заходнія пляцоўкі — магчымасць дыялогу з гледачом, а не толькі ўзнагароды ды прызнанне. Да таго ж вельмі цікава, як людзі з іншым менталітэтам разумеюць тваё кіно і рэагуюць на яго! Фестывалі важныя яшчэ і тым, што гэта найлепшы спосаб знайсці падтрымку для наступнага праекта, сувязі для далейшага супрацоўніцтва, абмяняцца досведам з калегамі. На жаль, у Беларусі нідзе не выкладаюць фестывальную стратэгію, таму маладыя кінематографісты не вельмі актыўныя ў гэтым плане, яны не ведаюць, як падаць сваё кіно, а галоўнае — куды. Я дам карысную параду: падаваць сваё кіно трэба спачатку на самыя буйныя фестывалі, і нічога, калі не атрымаецца трапіць туды адразу — трэба заўсёды разлічваць на лепшае, а апусціцца ніжэй можна заўсёды.

З наступнымі праектамі я збіраюся падавацца на сусветныя кінафонды: для беларусаў тут няма ніякіх абмежаванняў, але рэжысёры павінны ведаць хоць бы па ўдзеле ў фестывалях — такая інвестыцыя ў будучыню, менавіта таму фестывалі абавязковыя для кожнага кінематаграфіста.

***— «Дэбют» — адна з самых гучных дакументальных стужак Беларусі, і ёсць шмат меркаванняў аб тым, пра што гэтае кіно...***

— Калі я трапіла ў калонію, зразумела, што гэта звычайнае жаночае асяроддзе: у маіх герань ёсць сем'і, яны не закаранелыя злачынцы, а вельмі тонкія асобы, і ёсць патрэба ў ведах, мастацтве, у чымсьці новым, інакш яны б не сталі іграць у тэатры. Ужо тады я ведала, што кіно павінна скончыцца прэм'ерай іх спектакля. Але і калонія, і тэатр былі толькі фонам — кіно «намалявала» калектыўны партрэт жанчыны, яе каштоўнасці, якія мы лічым вельмі банальнымі ў паўсядзённым жыцці, яе думкі пасля таго, калі памылка ўжо здарылася.

Спадзяюся, што «Дэбют» прымусіў маіх герань задумацца як мінімум пра цану памылкі, свабоды і сям'і. Мне не хацелася ў гэтым кіно быць маралізатарам ці наглядчыкам, адзінае маё жаданне — каб кіно не прайшло для герань і гледачоў бясследна.

***— Ці ёсць у нашым кінематаграфічным жыцці рух наперад?***

— Рух ёсць, я сказала б, што ў нас пачынаецца «новая хваля». Ведаю некалькіх рэжысёраў, якія ўдзельнічалі ў пітчынгах і атрымалі фінансавую падтрымку ад сур'ёзных фондаў, на «Лістападзе» працуе індустрыяльная пляцоўка, у нас паказваюць міжнароднае дакументальнае кіно, з'яўляюцца новыя фестывалі, людзі падтрымліваюць кінематограф на краўдфандынгавых платформах. Хацелася б, каб дакументальнае кіно больш паказвалі ў кінатэатрах. Яшчэ большае жаданне — каб яго было каму глядзець. Зараз, нават калі выдаткаваць грошы на рэкламу, неверагоднага выніку чакаць не варта. Дарэчы, поспех дакументалістыкі, падобны да еўрапейскага, я бачыла толькі ў Екацярынбургу — там гледачы сочаць за кожным фільмам, у сшытках гэтых людзей можна знайсці аўтографы Аслюка і Адамовіч, ад іх можна пачуць нечаканыя пытанні. Для мяне гэта было анамальнай зонай, якую вельмі хацелася б бачыць у Беларусі.

***Цалкам інтэрв'ю чытайце ў газеце «Літаратура і мастацтва» (№ 3 за 2018 г.)***

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**

■ Сядзі і глядзі

# ПАЧАЦЬ І... ЗДОЛЕЦЬ

**«ПЯЦЁРА НА АДНАГО»**
**«РТР-Беларусь», па суботах**



Забаўляльна-інтэлектуальнае шоу, як падкрэслівае яго вядучы, папулярны акцёр серыялаў Віктар Логінаў, гэта «самае вясёлае з інтэлектуальных і самае інтэлектуальнае з вясёлых шоу». Сутнасць яго ў тым, што каманда з пяці «зорных» удзельнікаў, сярод якіх — тэлевядучыя, акцёры, шоўмены, танцоры, спевакі, інтэлектуалы, спартсмены, адказвае на пытанні, якія даслалі на адрас рэдакцыі тэлегледачы.

Тэматыка пытанняў неабмежаваная: гісторыя, літаратура, астраномія, масавая культура, спорт, цікавыя факты з паўсядзённага жыцця. Часу на пошук правільнага адказу «зорным» гульцам адводзіцца вельмі мала, але тым большы азарт і цікавейшы вынік. Калі каманда памыляецца, прыз (немаленькая сума ў памеры 20 тысяч расійскіх рублёў) дастаецца гледачу — аўтару мазгаломнага пытання.

**«ЧУЖАЯ ДАЧКА»**
**АНТ, з 7 лютага**



Галоўны герой свежай 8-серыйнай меладрамы з крымінальным ухілам — знакаміты некалі аўтагоншчык Максім Аўдзееў, які трапіў у турму па непраўдзівым абвінавачанні. І ён страціў не толькі бліскучую кар'еру — усё яго жыццё ляціць пад адхіл: жонка загінула пры трагічных абставінах, а дачку Сашу ўдачарылі чужыя людзі.

Але праз 12 гадоў Максім выходзіць з-за кратаў і прагне — не, зусім не адпомсціць і не вывесці на чыстую ваду крыўдзіцеляў, а ўбачыць сваю ўжо амаль дарослую дачку. Аднак знайсці яе аказваецца вельмі няпроста нават з дапамогай вернага сябра. А калі бацька нарэшце сустракаецца з дзяўчынай (але вырашае не прызнавацца ў сваяцтве і проста знаходзіцца побач, як анёл-ахоўнік), раптам высвятляецца, што ўжо яе новай сям'і пагражае небяспека.

**«ДАПУШЧАЛЬНЫЯ АХВЯРЫ»**
**МІР, 7 і 8 лютага**



На што вы гатовы дзеля сапраўды выгаднай прапановы — з тых, што здараюцца раз у жыцці? Не спяшайцеся з адказам, пакуль не паглядзіце гэту меладраму. Маладая прыгажуня Кацярына, якая працуе архітэктарам у правінцыйным гарадку, атрымліваючы запрашэнне паехаць працаваць у буйную маскоўскую кампанію, выдатна разумее: гэта больш высокі статус, большыя грошы і неабсяжныя перспектывы.

Здавалася б, што тут думаць, калі трэба ехаць. Але... Рашацца неабходна тэрмінова, а ў Каці — ужо амаль згулянае вяселле і каханы жаніх Максім, вядомы ў горадзе журналіст. І вось ён адмаўляецца разбурыць усе свае планы і рвануць у сталічную невядомасць следам за нявестай. І цяжка прадказаць, ці вытрымаюць пачуцці маладой пары выпрабаванне адлегласцю і расстаннем або гэта будзе білет у адзін канец...

## Панядзелак, 5 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.55** «Зона Х». (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Двайная суцэльная». (16+).**
**12.45, 14.35, 15.25 Меладрама «Слабая жанчына». (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Нашы. (6+).
**22.05 Серыял «След». (16+).**
**23.35** Арэна.
**0.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.05, 20.50** Тэлебарометр.
**9.30** Капейка ў капейку. (12+).
**10.10** «Калі мы дома». Скетчкам. (16+).
**10.40** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**11.20** «Свет навыварат». (16+).
**12.15** «Спатканне з будучыняй». (16+).
**13.10** М/с «Качыныя гісторыі». (0+).
**14.25** Анімацыйны фільм «Уверх». (12+).
**16.00 Фантастыка «Зорны пыл». (12+).**
**18.05 «Зразумець. Даравацъ». Драма. (16+).**
**19.15** Суперлато.
**20.00** «Спатканне з будучыняй». (16+).
**21.25** Два рублі. (12+).
**21.45, 22.10** «ЛавЛавСar». (16+).
**22.05** КЕНО.
**22.40** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).
**23.15** Ідзі сюды і танцуй.
**23.20 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Шамшурыкі.
**8.05, 12.00, 19.55** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 17.25** «Каралі эпізоду». Сяргей Філіпаў (12+).
**10.05 «Сын за бацьку...» Маст. фільм (12+).**
**11.30** «Навукаманія» (6+).
**12.20, 23.20** «Легенды музыкі». Максім Дунаеўскі (12+).
**12.45** «Славянскі базар у Віцебску — 2001».
**13.40** «Наперад у мінулае».
**14.10** «Майстры і куміры». Народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі.
**15.05, 22.40** «Асабістыя ворагі Гітлера». Дак. фільм. 1-я серыя (12+).
**15.50, 21.05 «Ляцяць жураўлі». Маст. фільм (12+).**
**18.05 «Хто ёсць хто?» Маст. фільм (16+).**
**20.10** «Тэатр у дэталях». Спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Сіндром Медэі».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. БГК імя Мяшкова — СКА-Мінск.
**9.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Суонсі».
**11.15** Пра спорт. Вынікі тыдня.
**11.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. УНІКС (Казань) — «Цмокі-Мінск».
**13.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Хадэрсфілд».
**15.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Ньюкасл».
**17.30** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**19.25** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. ЦСКА (Масква) — «Хімкі» (Маскоўская вобл.) (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Спорт-цэнтр.
**21.25** Гандбол над Бугам.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Уотфард» — «Чэлсі».

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10** «Геніі і ліхадзеі» (12+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Гісторыя Беларусі. Ірландскі след» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.05** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Наша жыццё».
**22.20** «Спартклуб» (12+).
**22.50 Серыял «Слава» (16+).**
**23.50** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне» (12+).
**10.00** «Тыдзень спорту».
**10.40 Фантастыка «Трансформеры: эпоха вынішчэння». (12+).**
**13.50 Фантастыка «Ванільнае неба». (16+).**
**16.10** «Далёкія сваякі (16+).
**16.50** «Вялікі горад».
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.45 «Важняк. Гульня навылет». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**21.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05 «NEXT-3». Серыял (16+).**
**0.40 «Салдаты-12». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00 Серыял «Вікторыя» (16+).**
**6.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**7.35, 13.15 Серыял «Добрыя рукі». (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя» (16+).
**15.00, 2.05** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**19.15 Серыял «Порах і дроб». (16+).**
**22.05 Маст. фільм «Жыў-быў дзед» (16+).**
**0.00** Навіны апоўначы.
**0.10 Маст. фільм «Ас з асаў» (12+).**
**3.05 Серыял «Спрут» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пакой смеху» (16+).
**12.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**13.35** «Наша справа» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека» (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў» (12+).**
**22.10, 23.10 Серыял «Ідэальны вораг».**
**0.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы» (16+).**
**9.45** «За гранню» (16+).
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.00** «Чакай мяне» (12+).
**13.25, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**14.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**15.05** «Ты не паверыш!» (16+).
**16.35, 19.40 Серыял «Неўскі» (16+).**
**21.15 Серыял «Інспектар Купер. Нябачны вораг» (16+).**
**23.05** «НЗ.by».
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Бальзакаўскі ўзрост, або Усе мужыкі — сво...» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.50, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.15 Серыял «Чатыры танкісты і сабака» (12+).**
**9.10** Дак. фільм «Прырода. Узнікненне» (0+).
**10.00** М/с (0+).
**10.25** Дак. серыял «Кошак не любіць нельга» (0+).
**11.10 Камедыя «Фантамас» (12+).**
**13.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні» (16+).**
**14.30 Меладрама «Вам і не снілася».**
**16.00** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.05** «Мультпарад».
**17.00** «Апавяданні пра жывёл» (0+).
**17.30 Серыял «Горад прышэльцаў» (16+).**
**19.00 Серыял «Абаронца» (16+).**
**19.55 Серыял «Выратаваць боса» (16+).**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Недатыкальныя» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.10** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**7.40, 4.35** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.00, 4.55** М/ф «Маша і Мядзведзь». (6+)
**8.20, 3.30** «Ералаш». (6+)
**9.10** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**9.40** «Вакол свету падчас дэкрэту» (12+).
**10.10** Баявік «Рэд-2». (12+).
**12.10** Серыял «Сям'я 3D». (16+).
**13.10** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**14.10, 2.40** Серыял «Як я стаў рускім» (16+).
**16.50, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 22.40** «Уральскія пельмені». (16+).
**20.00** Рэаліці-шоу «Супермамачка» (16+).
**21.00** Камедыя «Вяселле па абмене». (12+).
**0.00** Серыял «Карабель». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.50** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Міхаіл Калатозаў.
**7.05** «Карамзін. Праверка часам». Дак. серыял.
**7.35** «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
**8.05** «Проста Саша». Маст. фільм.
**9.15** «Араніянбаўмскія гульні». Дак. фільм.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.35** XX стагоддзе. «Багема. Марыя Міронава». 1995 год.
**12.15** «Мы — грамацеі!»
**12.55** «Бяссмертнава». Дак. фільм.
**13.50** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**14.30** «Біблейскі сюжэт».
**15.10, 1.40** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Рыгор Сакалоў.
**16.15** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**16.40** «Агора». Ток-шоу.
**18.45** «Больш, чым каханне». Георгій Флёраў і Ганна Падгурская.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Пампеі. Жыццё, застылае ў часе». Дак. фільм. Частка 1-я.
**21.40** «Саці. Нясумная класіка...»
**22.20** «Ціхі Дон». Серыял. 1-я серыя.
**23.05** «Змова генералаў». Дак. серыял.
**0.10** «Магістр гульні». «Чайка» Чэхава і Пруста».

### Настальгія

**6.00** «Сустрэча ў канцэртнай студыі «Астанкіна» з АндрэемМіронавым. 1978 год (12+).
**7.45** «У гасцях у М. Магамаева». Элвіс Прэслі. 1991 год (16+).
**8.50, 2.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год (16+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Маст. фільм «Хто паедзе ў Трускавец». (16+).
**11.10, 13.35, 17.30, 19.00, 20.20, 21.40, 23.00, 1.00, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**11.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).
**12.00** Маст. фільм «Волга-Волга». (12+).
**15.10** Фільм-спектакль «Утаймаванне свавольнай». 1973 год (16+).
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Маладзёжная рэвалюцыя 60-х». 2005 год (18+).
**19.30** Тэлеспектакль «Гумар розных часоў. Сапраўдны мужчына складаецца з мужа і чыну». 1968 год (12+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**23.25** «Сядзі і глядзі». (16+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1969. 2-я частка. 2011 год (16+).
**1.20** Маст. фільм «Мера стрымання». (16+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

### EuroSport 1

**3.45** Снукер. German Masters. Фінал.
**5.00, 18.3, 1.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**6.00, 7.30, 13.05, 19.30, 2.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**9.00** Лыжнае двухборства. Кубак свету.
**9.30** Біятлон. Кубак свету.
**11.35** Настольны тэніс. Еўропа. Топ-16.
**14.30, 23.00** Алімпійскія гульні. «Алімпійскія рэкорды».
**15.00, 16.30** Алімпійскія гульні. «Зборы ў Патагоніі».
**17.00, 21.35** Зімовыя віды спорту. «Пункт назначэння».
**17.40, 18.00** Алімпійскія гульні. «Топ-10 найвялікшых момантаў».
**20.30, 22.00** Алімпійскія гульні. «Зала Славы».
**1.30** Watts.

### Кінакамедыя

**0.35** Меладрама «Вялікая маленькая Я». (16+).
**2.15** Камедыя «Авечка Долі была злая і рана памерла». (6+).
**5.05** Камедыя «Любоўны пераплёт». (16+).
**6.45** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета». (16+).
**8.30** Меладрама «Дзённік кар'ерысткі». (16+).
**10.15** Камедыя «Герой месяца». (16+).
**12.05** Камедыя «Мільён для чайнікаў». (16+).
**14.00** Камедыя «Дзетародныя». (16+).
**15.50** Камедыя «Неадэкватныя людзі». (16+).
**17.50** Камедыя «Гіпапатам». (18+).
**19.30** Баявік «Яго сабачая справа». (18+).
**21.15** Камедыя «Касякі». (16+).
**22.55** Камедыя «Каханне ўразнос». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.05** «10 самых» (16+).
**8.35** «Доктар І...» (16+).
**9.05** «Дзве гісторыі пра каханне». Меладрама (16+).
**10.50, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.30** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**13.00** «Без падману» (16+).
**13.50** «Івановы». Маст. фільм (12+).
**15.30** «Нераскрытыя тайны» (16+).
**16.25** «Мой герой» (12+).
**17.15** «Развітанне» (16+).
**18.05** «Помста цёмных сіл». Дак. фільм (16+).
**18.55, 2.05** «Асколкі». Серыял (16+).
**20.55** «Цень стракозы». Серыял (16+).
**21.55** «Пагоня за смакам» (16+).
**22.55** «Вокладка» (16+).
**23.25** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**0.10** «Эні». Маст. фільм (12+).
**5.10** «Часова даступны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 16.10** Не здавайся (16+).
**8.00** Воўк (16+).
**10.25** Аферысты Дзік і Джэйн (16+).
**12.10** Ева: штучны розум (12+).
**14.00** Крысціна (16+).
**17.55** Баец (16+).
**20.10** Апошні самурай (16+).
**23.10** Чалавек, які змяніў усё (16+).
**1.50** Прыгажосць па-англійску (18+).
**4.00** Чалавек, якога не было (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Паляванне на піранню (16+).
**8.40** Чыстае мастацтва (16+).
**10.35** Зоймемся любоўю (16+).
**12.20** Старое добрае кіно. Вясёлая моладзь (0+).
**14.20** Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
**16.20, 4.20** Паездка за шчасцем. 1—2 серыі (12+).
**18.20** Тата (12+).
**20.20** Адарванне (16+).
**22.10** Залатая рыбка (12+).
**23.55** Рускі трохвугольнік (16+).
**2.15** Нягоднік (16+).
**3.45** Спакойны дзень у канцы вайны (6+).

### National Geographic

**6.00, 5.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**6.50, 13.25** Займальная навука. (12+).
**7.10** Інжынерныя ідэі. (12+).
**8.00** Сапраўдны суперкар. (12+).
**8.50, 11.50, 17.15, 20.25** Аўта-SOS. (12+).
**9.35** Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны. (12+).
**10.20** Цуды інжынерыі. (12+).
**11.10** Шаша праз пекла. (16+).
**12.40** Навука будучыні. (12+).
**14.10** Гульні розуму. (12+).
**14.55, 18.50, 22.45, 1.25** Непаражальныя канструкцыі. (12+).
**15.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (16+).
**16.25, 19.35, 23.55, 2.10** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.00, 22.00, 0.40, 3.45** У пошуках Атлантыды. (12+).
**23.30** Тайныя гісторыі. (16+).
**4.30** Паранармальнае. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Голыя і напалоханыя.
**14.00, 7.10** Выжыць любой цаной.
**18.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**20.00, 1.00** Залатая ліхаманка.
**0.00** Тэсла: рассакрэчаныя архівы.
**2.00** На краі Аляскі.
**2.55** Катастрофа на колах.

ЁСЦЬ ІДЭЯ

# ВІШНЮ — НА МАРОЗ, ЯБЛЫК — НА СУШКУ

**Першы ў Беларусі аграпрамысловы парк з міні-заводам па перапрацоўцы ягад, садавіны і агародніны будзе дзейнічаць у Гродзенскай вобласці**

**МНОГІЯ ведаюць: каб захаваць сабраны з агарода і саду ўраджай, — трэба яго перапрацаваць. Хтосьці кансервуе, хтосьці кладзе ў маразільнік, а нехта — у сушыльную камеру. Здаецца, справа няхітрая. І ўсё ж для таго, каб яе засвоіць, у Гродне створаны цэлы аграпарк.**

Работа парка будзе падпарадкавана навуцы. Таму і базай абрана галоўная навучальная ўстанова дадзенага профілю ў рэгіёне — Гродзенскі аграрны ўніверсітэт. Тут будуць праходзіць семінары, кансультацыі, але не толькі. Вытворцы змогуць убачыць працэс сушкі і замарозкі на сучасным тэхналагічным абсталяванні.

Сёння фермеры актыўна пераходзяць на садова-ягадныя культуры, паведамілі ў Гродзенскай абласной асацыяцыі фермераў. Новы кірунак можа стаць прыбытковым для рэгіёна, калі наладзіць тут перапрацоўку. У прыватнасці, выкарыстаць метад шокавай замарозкі. Такія ягады карыстаюцца попытам, таму што не губляюць сваіх пажыўных рэчываў.

— Тут поле дзейнасці вялікае, — адзначае **дацэнт кафедры агульнага земляробства Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта, кіраўнік праекта Андрэй РЭГІЛЕВІЧ.** — Напрыклад, вытворцам трэба ведаць, пры якой тэмпературы захоўваюцца карысныя рэчывы, а пры якой ужо не. Тая ж чорная парэчка, у якой безліч вітамінаў, пры звычайным відзе замарозкі губляе 30 працэнтаў гэтых вітамінаў, а пры шокавай — усяго 5—7 працэнтаў.

> Праект у першую чаргу будзе скіраваны на вытворчасць агародніны і садавіны. Пакуль фермерскі патэнцыял у гэтай справе невысокі. Бо многія задумваюцца: а куды потым падзець свой ураджай?

Адзін з найбуйнейшых вытворцаў сельгаспрадукцыі Гродзеншчыны Генрых Мыслівец таксама паскардзіўся, што не ўся аграпрадукцыя рэалізуецца. Ён таксама пачынае наладжваць у сябе перапрацоўку, таму праяўляе інтарэс да новага праекта.

— Мы бачым зацікаўленасць фермераў, асабліва ў пытаннях вырошчвання прадукцыі, гэта і новыя гатункі і новыя тэхналогіі, — расказвае **экспертны менеджар і каардынатар праекта па стварэнні Гродзенскага аграпрамысловага парка Павел ПЕСЦІС.** — Для вучобы будзем прыцягваць не толькі беларускіх спецыялістаў, але і замежных, у прыватнасці з Польшчы. Праект накіраваны на развіццё перапрацоўкі — замарозкі, сушкі, вытворчасць сокаў. Мы імкнёмся прыцягнуць да гэтага прыватны сектар. У рамках праекта плануем правесці сертыфікацыю прадукцыі фермера Генрыха Мысліўца з Мастоўскага раёна, а таксама адной з гаспадарак Гродзенскага раёна. Усяго 3-4 вытворцы атрымаюць сертыфікаты якасці.

> Сёння фермеры актыўна пераходзяць на садова-ягадныя культуры. Новы кірунак можа стаць прыбытковым для рэгіёна, калі наладзіць тут перапрацоўку.



Па словах навукоўцаў, фермеры маюць патрэбу ў кансультацыях. Таму база ВНУ стане яшчэ і цэнтрам прадпрымальніцтва аграрнага сектара рэгіёна. Тут будзе аказвацца падтрымка ў напісанні бізнес-планаў, вядзенні бухгалтарскай і фінансавай дзейнасці. Можна будзе скарыстацца вучэбнымі праграмамі з методыкай і тэхналогіяй перапрацоўкі і захавання сельгаспрадукцыі, што павінна садзейнічаць устойліваму развіццю. Плануецца набыць мабільныя міні-лабараторыі для глебава-раслліннай дыягнастыкі, якія будуць працаваць у палявых умовах. Набудуць высокаэфектыўны храматограф, які вызначае змест амінакіслот, вітамінаў, мікатаксінаў у агародніне. Ёсць патрэба і ў інфраскане — прыборы для вызначэння клятчаткі, тлушчаў, бялкоў, маслаў у збожжавых, бабовых, алейных культурах.

— Мы будзем адсочваць увесь шлях агародніны ад насення да перапрацоўкі, — кажа Андрэй Рэгілевіч, — дапаможам знайсці спецыяліста любога ўзроўню, прыцягнуць кампетэнтнага садавода, агранома. Напрыклад, фермера непакоіць праблема — чаму ў яго не расце агурок? Мы з аграномам едзем да яго на поле, робім якасны аналіз глебы і бачым, чаго ў ёй не хапае. Кансультуем па тэхналогіі апрацоўкі глебы. Абгрунтоўваем, якія патрэбны затраты, каб агурок вырас у адпаведнасці са стандартам. Тады будзе эканамічны эфект. Бо калі прадукцыя адпавядае міжнародным стандартам, яна можа не толькі замяніць імпартную, але выйсці на экспартныя пастаўкі.

Гэты аспект вельмі важны для рэгіёна, лічаць спецыялісты абласнога Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні. Сельгасвытворцы не вельмі зацікаўлены ў вырошчванні агародніны ці садавіны, не кажучы пра ягады, — праблема са збытам ураджаю. Нават фруктовыя кампаненты тых жа ёгуртаў, сыркоў ці іншай прадукцыі ў нас выкарыстоўваюць не мясцовыя, а імпартныя, у прыватнасці з Украіны і Польшчы. Напрыклад, у Гродзенскім раёне вырошчваецца да 30 тон чорных парэчак, але на ўнутраным рынку попыту чамусьці няма, вось і адпраўляюць каштоўную ягаду ў Расію. (Праўда, і гэты кірунак нельга назваць стабільным.) А вось прадаць ягады на малочны завод цяжка, бо тыя ж чорныя парэчкі ці клубніцы трапляюцца толькі з пладаножкамі. Як аказалася, ягаду можна ачысціць у працэсе глыбокай замарозкі спецыяльнымі агрэгатамі. Гэта адзін са спосабаў павысіць канкурэнтнасць прадукцыі. У аграпарку пакажуць, як гэта робіцца.

> Напрыклад, фермера непакоіць праблема — чаму ў яго не расце агурок? Мы з аграномам едзем да яго на поле, робім якасны аналіз глебы і бачым, чаго ў ёй не хапае.

— На базе аграрнага ўніверсітэта будзе дзейнічаць міні-завод па замарозцы і сушцы садавіны і агародніны, — паведаміў Павел Песціс. — Падрыхтаваны памяшканні, зараз ідзе працэс закупкі абсталявання згодна з міжнародным тэндарам. Вынікі хутка будуць вядомы. Частка абсталявання закуплена. У далейшым універсітэт будзе развіваць гэты напрамак.

У якасці нагляднага матэрыялу навукоўцы будуць выкарыстоўваць сваю прадукцыю з доследнага поля. Мяркуюць пашырыць асартымент, развіваць ягадны напрамак. Асабліваць праекта ў тым, што ён створаны для дэманстрацыі магчымасцяў перапрацоўкі. Да таго ж гэта выдатная база для студэнтаў-аграрыяў. Будучых спецыялістаў рыхтуюць на інжынерна-тэхналагічным факультэце. Студэнты змогуць праходзіць практыку на міні-заводзе. Таксама тут можна павысіць кваліфікацыю, набыць новыя веды, каб пасля пачаць сваю ўласную справу.

— Гэта свайго роду лабараторыя, дзе можна вучыцца малому і сярэдняму бізнесу, — лічыць Андрэй Рэгілевіч. — Тут можна выйсці на новыя віды садова-ягаднай прадукцыі, наладзіць іх перапрацоўку.

У далейшым на базе вопытнага завода можа з'явіцца цэлы холдынг. Адзін фермер пабудуе сховішча, другі — цэх па замарозцы ці сушцы, хтосьці — лінію па вытворчасці соку. Ідэй хапае, тут няма канкурэнцыі, ніша свабодная, кажуць фермеры. Некаторыя з іх гатовы стаць членамі новага кластара. На іх думку, зараз трэба звярнуць увагу на альтэратыўныя віды — клубніцы, вішню, агрэст. Збываць іх у замарожаным выглядзе прасцей. Але пакуль што гэта прадукцыя не даводзіцца да патрэбнай кандыцыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### Наша даведка

**Гродзенскі аграпрамысловы парк створаны ў рамках праекта тэхнічнай міжнароднай дапамогі ААН па прамысловым развіцці (ЮНІДА). Тэрмін дзеяння — тры гады. Агульны бюджэт праграмы складае 980 тысяч долараў, з іх на стварэнне аграпарка выдаткавана каля 300 тысяч. Фінансавым донарам з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Чакаецца, што па заканчэнні праекта аграпарк зможа служыць у якасці мадэлі развіцця не толькі ў рэгіёнах Беларусі, але і ў іншых краінах.**

# ДЛЯ ДЗЕЙНАСЦІ

правесці аптымізацыю вытворчых праграм сельскагаспадарчых арганізацый пад існуючы парк тэхнікі. У цэлым жа тэхнічны патэнцыял сельскай гаспадаркі патрабуе больш высокіх тэмпаў яго абнаўлення.

***— Наколькі сёння можна рэалізаваць сваю ініцыятыву ў вёсцы? Якія вы бачыце перспектывы?***

— Сёння вёска — літаральна вялікае поле для дзейнасці. Акрамя сельскагаспадарчай вытворчасці, ёсць шмат іншых кірункаў для развіцця бізнесу: захоўванне, перапрацоўка і збыт сельскагаспадарчай прадукцыі, сельскі турызм, вясковы гандаль, народныя промыслы і рамёствы, бытавое і сацыяльна-культурнае абслугоўванне сельскага насельніцтва, аказанне кансультацыйных паслуг па ажыццяўленні сельскагаспадарчай дзейнасці, нарыхтоўка і перапрацоўка дзікарослых пладоў і ягад, лекавых раслін, нарыхтоўка і апрацоўка драўніны, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, будаўніцтва, транспарціроўка грузаў, пасажырскія перавозкі... І гэта яшчэ не ўвесь спектр! Адным жыццё ў вёсцы здаецца раем, іншым — не па душы. Я думаю, што галоўная матывацыя, якая пераканала б маладых людзей заставацца і працаваць у вёсцы, — гэта сямейныя традыцыі, любоў да ўласнай зямлі, роднай прыроды. Бо калі чалавеку не мілае ўсё, што вакол, ніякія матэрыяльныя спакусы яму гэтага не кампенсуюць. У адпаведнасці з нормамі Дэкрэта № 7 арганізаваць малы і сярэдні бізнес на вёсцы стала значна прасцей.

Прыбытковым можа быць выязны гандаль. А калі вы ўмела ведзяце дапаможную гаспадарку, якая дае значна больш малака, тварагу, агародніны, садавіны, яек, чым вы можаце самі выкарыстоўваць, то можна атрымліваць добрыя даходы ад продажу лішкаў на рынку або нарыхтоўчым арганізацыям. Зразумела, што не кожны псіхалагічна здольны займацца індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасцю (як сцвярджаюць сацыёлагі, толькі каля 5 % насельніцтва). Можна проста добра працаваць у буйным калектыўным бізнесе, быць уладальнікам пэўнай долі капіталу ў карпаратыўных структурах, удзельнічаць у кіраванні і размеркаванні прыбытку арганізацыі. Гэты кірунак дзейнасці ў аграрнай галіне з'яўляецца адным з вызначальных з пункту гледжання дадатковай матывацыі ўдзелу сельскіх працаўнікоў. Менавіта гэта павінна знайсці адлюстраванне ў рашэннях на будучым семінары-нарадзе з удзелам кіраўніка дзяржавы.

***— Калі казаць пра семінар-нараду, прысвечаную развіццю вёскі, — якія вашы чаканні і, быць можа, прагнозы вынікаў?***

— Заяўленая тэматыка семінара-нарады «Аб развіцці вёскі і павышэнні эфектыўнасці аграрнай галіны» актуальная. На ёй, мяркую, гаворка будзе весціся пра дасягненні сельскагаспадарчай галіны. Нягледзячы на складанасці, яны значныя і бясспрэчныя. Дасягнутыя вынікі прызнаюцца таксама сусветнай супольнасцю.

> Наша дзяржава па ключавых экспартных пазіцыях увасходзіць у топ-20 краін — экспарцёраў харчавання і па пяці асноўных відах сельскагаспадарчай прадукцыі — у першую дзясятку.

На нарадзе будуць падведзены вынікі работы аграрнай галіны за мінулы год, які ў асноўным быў паспяховы. Атрымалі нядрэнны ўраджай сельскагаспадарчых культур, павялічылася прадукцыйнасць жывёлы. Выраслі аб'ёмы сельскагаспадарчай вытворчасці, як у раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі. На семінары-нарадзе акцэнт будзе зроблены таксама на неабходнасці павышэння эфектыўнасці аграрнай галіны. Таму вельмі пажадана, каб гэты форум стаў пераломным у развіцці айчыннай аграрнай галіны з пункту гледжання павышэння яе эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці. Гаворка тут ідзе не толькі пра значнасць паўсядзённай высокапрадукцыйнай працы вяскоўцаў. Не менш важна таксама — на аснове аб'ектыўнай і непрадузятай ацэнкі сітуацыі — намеціць фінансавыя і эканамічныя мерапрыемствы, рэалізацыя якіх палепшыць сельскую гаспадарку. Лічу, што прыярытэтнымі і эфектыўнымі зараз з'яўляюцца кіраўнічыя рашэнні эканамічнага характару. Яны, перш за ўсё, павінны быць накіраваны на паскоранае фінансавае аздараўленне сельскагаспадарчых арганізацый і павышэнне матывацыі працы занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці работнікаў, кіраўніцкага персаналу.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# Стол са святлафорам і дзесяць асноўных кірункаў у рабоце

**«КАМУ патрэбны сельскія Саветы і чым яны наогул займаюцца?» — такое пытанне часам задаюць вяскоўцы, калі хочуць панаракаць на мясцовыя ўлады. Па адказ на яго мы звярнуліся да Мікалая МІСЮРЫ, які ўзначальвае Лепельскі раённы Савет дэпутатаў ужо 10 гадоў.**

***— У чым жа, Мікалай Мікалаевіч, заключаецца праца старшыні сельскага Савета?***

— Назва пасады кажа сама за сябе — клопат пра дабрабыт вясковых жыхароў. Калі ў горадзе можна звярнуцца з праблемай адразу ў некалькі службаў, то на вёсцы пытанні вырашаць больш складана. Для сябе і падначаленых я вылучаю дзесяць кірункаў працы: найперш гэта добраўпарадкаванне ў населеных пунктах і вакол іх, на могілках, на месцах воінскіх пахаванняў і гэтак далей. Сацыяльная работа скіравана на дапамогу найбольш уразлівым групам жыхароў — адсочваем, наколькі яны забяспечаныя ўмовамі, ці ёсць магчымасць карыстацца льготамі дзяржавы. Нямала часу займае трэці блок працы, звязаны з прафілактыкай правапарушэнняў і супрацьпажарнай бяспекай. Для вёскі цяпер асабліва балючая праблема алкагалізму. Ёй займаюцца спецыяльныя камісіі, але старшыня ўсё роўна павінен ведаць сітуацыю ў кожнай мясцовасці. Ён унікае і ў вядзенне падсобных гаспадарак, дапамагае вяскоўцу знайсці тэхніку для апрацоўкі прысядзібнага ўчастка, кантралюе збор малака і чыпіраванне жывёлы. Яшчэ сельскія Саветы павінны падтрымліваць і развіваць аграэкатурызм. Так, у Лепельскім раёне каля 30 аграсядзіб, па суседстве знаходзіцца Бярэзінскі біясферны запаведнік, а частку азёраў мы здаём у арэнду. Так што важна навучыцца майстэрству знаходзіць кампраміс паміж бакамі. Кантроль за работай электрасетак, паштовай, тэлефоннай сувязі, забеспячэнні вяскоўцаў таварамі — вось асноўны «букет» пытанняў, якія вырашае старшыня з году ў год як на мясцовым, так і на раённым узроўні.

***— А па якім прынцыпе размяркоўваюцца сродкі для выканання пералічаных задач?***



— Тут трэба згадаць яшчэ адну асноўную функцыю Саветаў дэпутатаў — зацвярджэнне плана сацыяльна-эканамічнага развіцця і гадавога бюджэту. Інакш кажучы, прапісваем, на якія работы і ў якім аб'ёме выдзяляць сродкі. Як толькі старшыні на месцах даведваюцца сумы, што трапяць на баланс сельсавета, яны складаюць адпаведны пералік мерапрыемстваў і падчас пасяджэння прэзідыума абараняюць праект запланаваных работ. Зразумела, што канчатковую і беспаваротную версію распрацаваць немагчыма, бо не бывае жыцця без непрадбачаных абставін — напрыклад, частка фінансаў можа пайсці на ліквідацыю стыхійных бедстваў. Наогул, я думаю, што перад тым, як патрабаваць прадукцыйнасць працы, трэба стварыць умовы, даць крыніцу фінансавання. Бо калі мы не падсілкуем планы матэрыяльна, то яны так і застануцца на паперы.

***— Хто трапляе на пасаду старшыні сельскага Савета? Ці існуе «школа маладога кіраўніка»?***

— Заўважу, што на гэту пасаду мясцовыя жыхары прасоўваць сябе не спяшаюцца, усё больш прыходзіць па прапанове. Мы падбіраем кандыдатаў па іх здольнасцях — прыглядваемся напачатку да таго, як чалавек праяўляе сябе на працы. Таму выпадковыя людзі сюды не трапляюць. Хаця ініцыятыве ніхто не перашкаджае, напрыклад, у Бароўскім сельскім Савеце жанчына, якая працавала фармацэўтам, прапанавала сваю кандыдатуру і перамагла ў тайным галасаванні. Потым яна праявіла сябе здольным кіраўніком.

Каб стаць старшынёй сельскага Савета, чалавек, згодна з заканадаўствам, павінен быць дэпутатам сельскага Савета, гэта значыць, людзі яго ўжо абралі як прадстаўніка сваіх інтарэсаў. Работа народных абраннікаў не мае матэрыяльнай узнагароды, гэта, хутчэй, грамадскі абавязак, але ў дэпутата ёсць права першачарговага звароту да ўлад. На мой погляд, падобнай справай павінны займацца людзі з досведам кіраўніка. У такім выпадку ў іх з'явіцца больш магчымасцяў, а вырашаць яны будуць знаёмыя пытанні.

Напачатку новы старшыня сельскага Савета ездзіць на стажыроўку да калег. Потым каардынуе работу разам са старшынёй раённага Савета дэпутатаў. У нашым раёне ўведзена практыка штотыднёвай справаздачы. «Нічога не забывае і не дарує», — так жартуюць пра мяне падначаленыя, бо ўсе значныя пытанні трымаю ў табліцы на стале. Акрамя яе там ляжыць ліст са зваротамі ад жыхароў, размаляваны накшталт святлафора. Зялёныя радкі абазначаюць, што праблема вырашана, чырвоныя нагадваюць, што чалавек усё яшчэ чакае рэакцыі на свой запыт.

> Мясцовыя органы самакіравання могуць падштурхнуць улады да змен, калі будуць займацца праблемай сістэматычна.

***— Якім чынам можна папрасіць дапамогі ў старшыні раённага Савета дэпутатаў і калі чакаць адказу?***

— Старшыня ездзіць па раёне не кожны дзень, але дастаткова часта. Напрыклад, бываю на месцах, дзе ёсць скаргі ад мясцовых жыхароў на выкананне работ. Аглядаю ўчасткі, па якіх нядаўна службы давалі справаздачу, і правяраю якасць выканання. Што датычыцца мяне, то кожны месяц некалькі гадзін вяду прыём у якім-небудзь сельсавеце, выязджаю з інфармацыйнымі групамі. Кожную суботу я па званкі гарачай лініі адказваю альбо я, альбо старшыня райвыканкама, альбо адзін з намеснікаў. Пытанні бываюць самыя розныя, як і стаўленне да іх. Напрыклад, калі бабуля скардзіцца на стыхійную звалку побач з яе домам — дарučаю дырэктару ЖКГ адправіць туды машыну і прыбраць смецце бясплатна. У той жа час, калі жанчына просіць спілаваць дрэва на магіле мужа, якое яна некалі пасадзіла сама, то я, канешне, прапаную ёй спецыялістаў, але паслуга будзе платнай.

Звычайна з кожным, хто звяртаецца ў сельвыканкам, стараюся потым звязацца і спытаць, ці задаволена яго просьба, але здараецца, што выканаць патрабаванне скаржніка немагчыма. Так, памятаю, чалавек папрасіў дапамагчы з працаўладкаваннем. Я тэлефаную кіраўніку гаспадаркі і высвятляю, што мужчыну прапаноўвалі месца пастуха, а ён хацеў быць толькі вартаўніком, пры тым што патрэбы ў вартаўніках прадпрыемства не мела.

***— Наколькі рэальна старшыня сельскага Савета ўплывае на пытанні па-за мясцовым маштабам?***

— У сельскія Саветы рэгулярна прыязджаюць аглядальнікі з раёна, вобласці. Тут важна падтрымліваць добрыя стасункі і памятаць, што мы займаемся адной справай. У прынцыпе мясцовыя органы самакіравання могуць падштурхнуць улады да змен, калі будуць займацца праблемай сістэматычна. Мне прыходзіць на памяць выпадак, які датычыўся Указа Прэзідэнта № 667. Раней сродкі, якія зарабляў сельскі Савет продажам зямельных участкаў праз аукцыён, можна было скіроўваць на стварэнне інфраструктуры і толькі ў вёсцы, дзе купілі зямлю. Аднак калі там дарогі і так былі падсыпаны, а электрычнасць падведзена, мы не маглі скарыстацца дадзенай крыніцай бюджэту для іншых патрэб. Я пісаў лісты да старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах з прапановай перагледзець парадак размеркавання сродкаў, заручыўся падтрымкай, і ў выніку ўлады паставіліся да праблемы па-іншаму. Цяпер выручаныя грошы сельвыканкамы выкарыстоўваюць на патрэбы добраўпарадкавання і лепш уяўляюць, як гаспадарыць на зямлі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# ПРА ВЫРАШАНАЕ І НЯВЫРАШАНАЕ

**Хатлянская зона, так склалася, на працягу многіх гадоў была крыху больш праблемнай для раённых улад, чым іншыя тэрыторыі Уздзеншчыны. Магчыма, таму, што гэта аддаленыя ад райцэнтра вёскі (а іх вакол Хатлян і Таўкачэвіч некалькі дзясяткаў) і, у адрозненне ад азерска-дзешчанскага краю, тут куды горшыя транспартныя зносіны і з Уздой, і са сталіцай. Па-другое, аграгарадок Хатляны, куды ўключаны адміністрацыйныя цэнтры аднайменнага ААТ і агракамбіната «Белая Русь», самы буйны пасля горада населены пункт у раёне: тут жыве звыш тысячы афіцыйна зарэгістраваных жыхароў, а ў цэлым па сельскім Савеце — без малога дзве тысячы. Зыходзячы з дзвюх першых прычын, гэтымі праблемамі ў свой час умела маніпулявалі прадстаўнікі розных партый і рухаў.**

Калі чатыры гады таму на пасаду дырэктара агракамбіната прызначылі Уладзіміра Сяброўскага, а пасля прапанавалі стаць і дэпутатам сельскага Савета, яму такая «спадчына» была вядома. Але кіраўніка любога ўзроўню не павінны палохаць падобныя цяжкасці: калі табе давяралі калектыў і прадпрыемства, значыць, трэба адказваць за ўсё, што там адбываецца.

— Нехак да нас у пасёлак завітаў адзін з былых дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Ён быў здзіўлены: на афіцыйна прызначаны час прыёму прыйшло зусім няшмат людзей, хоць і праблемы пэўныя існавалі. У такіх выпадках, кажуць, адно з двух: або цяжкасцяў няма, або выбаршчыкі перасталі верыць кіраўніку, дэпутату, таму і не прыходзяць. А я растлумачыў так. Для мяне не існуе дзяжурных — раз на месяц — сустрэч, і на дзвярах майго рабочага кабінета хоць і напісана, што прыём грамадзян вядзецца двойчы на тыдзень, але ўсе ў акрузе ведаюць: Сяброўскага можна кожны дзень застаць у кабінеце з сямі гадзін раніцы і, пакуль не закруцілася руціна неадкладных службовых спраў, вырашыць тое ці іншае пытанне. І на працягу дня мой тэлефон даступны для кожнага. Для мяне важна спрагназаваць, прадухіліць непажаданыя вынікі, каб пасля не траціць куды больш часу і сродкаў на ліквідацыю ўпушчанага.



І вытворчыя, і дэпутацкія справы Уладзіміру СЯБРОЎСКАМУ нярэдка даводзіцца вырашаць разам з начальнікам жывёлагадоўчага комплексу Таццянай СЕЛІВОНЧЫК.

Чым былі запоўнены дэпутацкія будні Уладзіміра Сяброўскага? Звычайнымі справамі. Хтосьці просіць пасадзейнічаць у рамонце жылля. Іншыя сігналізуюць, што трэба расчысціць дарогу ад снегу (па дамоўленасці з сельскім Саветам гэта работа выконваецца транспартам агракамбіната ў розных населеных пунктах). Камусьці спатрэбілася зала для сямейнай урачыстасці ці жалобнага стала. Звярнулася адміністрацыя школы — папрасіла дапамагчы ў набыцці сталоў, іншай мэблі. Цяпер трэба думаць, за кошт якіх сродкаў набыць кухоннае абсталяванне для дзіцячага садка...

На працягу некалькіх гадоў людзі прасілі пракласці тратуар ад школы ў старым цэнтры Хатлян да павароту на комплекс. А гэта амаль 700 метраў. Для выканання наказу спатрэбіліся немалыя сродкі, але нарэшце мінулай веснавой справу давялі да канца, і цяпер вяскоўцы і ў цёмны час сутак могуць хадзіць без апаскі трапіць пад колы машыны...

— Але, на жаль, часам нават наяўнасць фінансаў не дазваляе перамагчы ведамасную няўзгодненасць. Не раз выбаршчыкі скардзіліся на нязручны графік работы паштовага аддзялення: працуюць там якраз у тыя гадзіны, калі значная частка насельніцтва таксама знаходзіцца на працы. Але змяніць сітуацыю не ўдаецца, — кажа дэпутат.

Яшчэ адна даўняя праблемная сітуацыя — транспартныя зносіны. З Узды ў Хатляны аўтобус прыходзіць двойчы на дзень, раніцай і вечарам. Яшчэ школьны аўтобус дзяцей развозіць. Але вяскоўцам нязручна, прыехаўшы ў райцэнтр па дробязнай справе раніцай, вяртацца дамоў позна вечарам. І ў Мінск ды назад прыехаць — праблема. Зайздросцяць мясцовыя людзі тым, хто жыве ўздоўж Слуцкай трасы, дзе маршруткі амаль праз паўгадзіны ходзяць. Дэпутаты неаднаразова падключаліся да вывучэння сітуацыі, а старшыня Мінскага абласнога Савета Іван Ліпніцкі пасадзейнічаў, каб маршруткі прыватнікаў заходзілі ў Хатляны. Праўда, з часам высветлілася, што тыя некалькі рэйсаў у дзень не заўсёды запатрабаваныя. Таму неўзабаве... зноў скасавалі такія заезды. Але Уладзімір Сцяпанавіч лічыць, што яшчэ не раз давядзецца і розным інстанцыям, і дэпутатам наступнага склікання вяртацца да гэтага пытання.

— А яшчэ хочацца спадзявацца, што будзе ажыццёўлена прыгожая мара многіх хатлянцаў: у цэнтры вёскі з'явіцца прыгожае месца адпачынку. Для гэтага неабходна пачысціць азярцо, крыху пашырыць яго, устанавіць лаўкі, месца для пераадзявання, альтанку... Канешне, эканамічная сітуацыя цяпер непростая, ёсць шмат больш актуальных праблем. Але ж не хлебам адзіным...

**Віктар САБАЛЕЎСКІ.**

СІТУАЦЫЯ

# НЕ ШУКАЙ ПРЫЧЫНУ, ШУКАЙ РАБОТУ

## Некалькі варыянтаў працаўладкавання прапаноўваюць у Любані. Дарэчы, у раёне самы нізкі ўзровень беспрацоўя на Міншчыне

**Невялікаму раённаму цэнтру Любань, што ў Мінскай вобласці, пашанцавала: ён стаіць на радовішчы калійных солей. Гэтыя абставіны і вызначылі далейшы лёс горада і раёна. Кампанія «Слаўкалій» расійскага бізнесмена Міхаіла Гуцэрыева будуе тут Нежынскі горна–абагачальны камбінат. А гэта значыць, што ў рэгіёне створаць новыя працоўныя месцы. Толькі на названым прадпрыемстве іх будзе дзве тысячы. Акрамя таго, яны з'явяцца і ў абслуговай, сацыяльнай сферах, гандлі.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ды і цяпер не скажаш, што ў райцэнтры няма дзе працаваць. Знайсці работу могуць усе, хто гэтага жадае. Летась 88 чалавек працаўладкавана менавіта за кошт стварэння новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў. Найбольшую колькасць месцаў прадаставілі закрытае акцыянернае таварыства «Дабраном» — 21, замежнае прыватнае прадпрыемства «Любанская фабрыка», дзе адкрылі новы цэх па пашыве адзення, — 15. Адкрытае акцыянернае таварыства «Рыбазавод «Любань» устанавіў новую лінію па выпуску рыбных кансерваў. Гэта зноў жа дадатковыя рабочыя месцы. З пускам другой чаргі канвеера прадпрыемства дадаткова прыме яшчэ 16 чалавек.

> Сітуацыя з работай паляпшаецца з кожным годам. Па мінулагодніх выніках Любанскі раён увайшоў у «топ» рэгіёнаў Беларусі, дзе знізіўся ўзровень беспрацоўя. На 1 студзеня 2017-га ён складаў 0,89 %, цяпер — 0,38 %.

— Па садзейнічанне ў працаўладкаванні летась да нас звярнулася 1033 чалавекі. Уладкавалі 916, — адзначае **намеснік начальніка аддзела занятасці і працоўных адносін упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Любанскага райвыканкама Галіна КУКРАШ.** — Сёння розныя суб'ектамі гаспадарання заяўлена 446 вакансій, у тым ліку і для будаўніцтва Нежынскага горна-абагачальнага камбіната. Сюды патрабуюцца ў тым ліку і спецыялісты з веданнем замежных моў: 10 — кітайскай і 22 — нямецкай.

Сярод рабочых прафесій запатрабаваныя слесар па рамонце аўтамашын, вадзіцель пагрузчыка, аўтамабіля, электрагазазваршчык, абліцоўшчык-плітачнік, маляр, спецыялісты — урачы, медыцынскія сёстры. У сельскай мясцовасці адчуваецца недахоп работнікаў жывёлагадоўлі, аператараў машыннага даення, заатэхнікаў, ветфельчараў, ветурачоў і аграномаў.

— Калі чалавек, які звярнуўся да нас, не мае кваліфікацыі, прапаноўваем накіраваць яго на прафесійнае навучанне ў Слуцк або Мінск. Летась прайшлі адпаведную падрыхтоўку 36 беспрацоўных — усе яны ўладкаваліся на прадпрыемствы горада. Акрамя гэтага, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных могуць атрымаць субсідыю на адкрыццё сваёй справы. У мінулым годзе субсідыі выдалі васьмі грамадзянам, — кажа Галіна Кукраш. — Сёлета таксама плануем выдзеліць восем. Адзін чалавек, зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага, ужо працуе над бізнес-планам. Часцей за ўсё людзі імкнуцца займацца бізнесам у сферы аказання бытавых, рамонтных паслуг, а таксама ў гандлі.

Сёння мясцовым уладам даручана дайсці да кожнага беспрацоўнага, аказаць яму неабходнае садзейнічанне ў працаўладкаванні.

***— Як у Любанскім раёне шукаюць, выяўляюць такую катэгорыю грамадзян?***

— Рознымі шляхамі. Летась, напрыклад, у раёне працавала камісія па аказанні садзейнічання ў працаўладкаванні, — тлумачыць Галіна Кукраш. — Туды звярнулася 656 чалавек, 443-м з іх выдалі накіраванне на прадпрыемствы і ў арганізацыі. Двух адправілі на прафесійныя курсы, яшчэ 11 прынялі ўдзел у аплачваемых грамадскіх работах. Праводзім таксама кірмашы вакансій на базе сельсаветаў. Яны нам шмат дапамагаюць, бо на месцах добра ведаюць людзей, іх запатрабаванні, вядуць спісы незанятых. Адпаведна з графікам выязджаем у кожны з дзевяці сельсаветаў раёна. На сустрэчы запрашаюцца інспектары па кадрах суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці. Яны расказваюць аб вакансіях, тлумачаць, што патрабуецца ад будучага работніка.

Падчас кірмашу ахвотным прапануюць прафесійныя курсы, асабліва моладзі. У прыватнасці, хлопцы, якія вярнуліся летась з арміі, былі накіраваныя на перанавучанне. Цяпер паспяхова працуюць газаэлектразваршчыкамі. У раёне займаюцца і такім кірункам, як перасяленне ў сельскую мясцовасць з забеспячэннем работай і жыллём. У мінулым годзе дапамаглі пераехаць у вёску сям'і з Віцебскай вобласці. Не абыходзяць увагай і абавязаных асоб. Такіх тут 43, у тым ліку 12 пражываюць у горадзе. Ні адзін з наймальнікаў не адмовіў у прыняцці іх на работу.

Дадам, што ўпраўленне шмат займаецца рэкламай па працаўладкаванні: аб'явы, буклеты, памяткі, інфармацыя ў мясцовых СМІ. Раз у квартал праводзіцца дзень службы занятасці, куды можа прыйсці любы ахвотны. Яму абавязкова прапануюць некалькі варыянтаў рашэння праблемы.

Словам, хто хоча працаваць — шукае работу, хто не хоча працаваць — шукае прычыну.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «НЕРУДПРОМ», г. Минск, ул. Асаналиева, 72 |

Предмет аукциона

| № лота | Наименование | Инв. номер по бухучету |
|---|---|---|
| 1 | **Трактор МТЗ-82Л, гос. номер 7485 ОА, 1979 г. в.** | 3585 |
| Начальная цена лота № 1 с НДС – **3 248,11 бел. руб.** (снижена на 50 %) | | |
| 2 | **Трактор МТЗ-82 1, гос. номер КА-7 0409, 2002 г. в.** | 3993 |
| Начальная цена лота № 2 с НДС – **6 769,89 бел. руб.** (снижена на 50 %) | | |
| Месторасположение спецтехники – г. Минск, ул. Асаналиева, 72 | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 01.06.2017

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 22.02.2018 в 14 .00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 20.02.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Открытое акционерное общество «Стекольный завод «Залесье» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

1. Недвижимого имущества и оборудования, расположенного по адресу: Минская область, Вилейский район, п. Партизанский, ул. Ломоносова, 10, в составе:

оборудование в количестве 29 ед. (лотов).

Недвижимое имущество:

лот № 30. Административно-бытовой корпус – 1827,5 м².
Лот № 31. Склад огнеупоров – 348,5 м².
Лот № 32. Склад огнеупоров – 502,7 м².
Лот № 33. Гончарный цех – 88,6 м².
Лот № 34. Склад материалов – 503 м².
Лот № 35. Склад материалов общей площадью 251,3 м².

2. Недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, д. Красное, ул. Привокзальная 42, в составе:

лот № 36. Котельная – 106,3 м².
Лот № 37. Насосная – 20,1 м².
Лот № 38. Мазутная – 48,1 м².
Лот № 39. Склад-модуль 926,3 м².
Лот № 40. Склад готовой продукции – 666,4 м².
Лот № 41. Железнодорожная ветка. Повышенный путь.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, а также подробная информация об имуществе оговорены в условиях его проведения, размещенных на сайтах:

1) www.minsk-region.gov.by в разделе Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5. Аукционы по продаже недвижимости).
2) www.molodechno.minsk-region.by/ru/economy/aukcion в разделе «Аукцион».
3) www.vileyka.minsk-region.by.
4) www.peramoga.by.

Аукцион состоится **15.02.2018 в 11.00** по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. 17 Сентября, д. 32. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.02.2018 в рабочие дни до 15.00 по указанному адресу.
Тел. +375 29 6853677 УНП 600010636



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «НЕРУДПРОМ», г. Минск, ул. Асаналиева, 72 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение**: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, 10, район д. Захаричи

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Блок вспомогательных цехов** | Здание специализированное иного назначения | 2211,5 кв. м | 600/С-59845 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 448 944,48 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **12.03.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Дата и время окончания приема документов | **07.03.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО Белсвязьстрой» (продавец), проводит открытый аукцион **по продаже права заключения договора аренды:**

| | Лот № 1 | Характеристика |
|---|---|---|
| **Наименование объекта** | **Изолированное помещение в здании общежития на 1-м этаже (инв. № 500/986-571)** | **Изолированное помещение состоит из:** – 2 коридоров (17,29 и 7,78 кв. м), 3 кабинетов (офисов) (13,87, 13,62 и 14,18 кв. м), кладовой (2,76 кв. м), туалета, тамбура (1,77 кв. м). Площади находятся на 1-м этаже пятиэтажного здания, имеется отдельный вход. В здании имеется отопление, водоснабжение, канализация. Площади в удовлетворительном состоянии |
| **Местонахождение объекта** | г. Минск, ул. Широкая, д. 18 | |
| **Общая площадь, кв. м** | 72,33 | |
| **Срок договора аренды** | 3 года | |
| **Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб.** | 274,85 | |
| **Сумма задатка, бел. руб.** | 27,48 | |
| **Коэффициент спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды** | 3,0 | |
| **Целевое использование имущества** | Для размещения офисов, складских помещений, оказание услуг | |

Базовая арендная величина с 01.04.2017 составляет 15,20 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **05.03.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.03.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## ЧАС ШКОЛЬНАГА

### Неабходна скласці план добраўпарадкавання

Кіраўніцтва Лёзненскага раёна разам з кандыдатамі ў дэпутаты сустрэлася з жыхарамі мікрараёна Школьны. Іван Лаўрыновіч, старшыня райвыканкама, адзначыў, што на гэтай тэрыторыі жыве шмат моладзі, таму пытанні пошуку працы, будаўніцтва жылля, рамонту дамоў і абсталявання дзіцячых пляцовак вельмі актуальныя.

**Газета «Сцяг перамогі»** паведамляе, што маштабных змен у добраўпарадкаванні рабіць не плануецца, але пэўная работа будзе зроблена на суботніках і за кошт уласных намаганняў грамадзян. Старшыня райвыканкама заўважыў: «Трэба скласці план добраўпарадкавання, пакласці яго на паперу і выканаць задуманае. Вельмі важная ініцыятыва дэпутатаў, іншых грамадзян, якую потым варта настойліва ўвасабляць у рэальныя справы. Наогул, на мой погляд, вельмі важна ставіць перад сабой мэты, інакш жыццё ператворыцца ў звычайную цякучку».

## ВЫБІРАЕМ ЭКАЛОГІЮ

### Як у Браславе раздзяляюць смецце

Амаль палова насельніцтва раёна збірае адходы асобна, паведамляе **«Браслаўская звязда».** Напярэдадні мінулага года ў г. п. Відзы і аграгарадку Друя КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік» адкрыла комплексна-прыёмныя пункты сыравіны на перапрацоўку. У рамках аднаго з праектаў еўрарэгіёна «Азёрны край» за кошт Еўрасаюза былі закуплены 100 кантэйнераў і будматэрыялы для абсталявання 25 новых пляцовак для збору смецця. Усе яны пабудаваны ў Ахрэмавіцкім сельскім Савеце ў якасці эксперымента, каб ахапіць 100 % тэрыторыі.

На прадпрыемстве «Браслаў-камунальнік» адзначаюць, што жыхары населеных пунктаў, дзе з'явіліся новыя кантэйнерныя пляцоўкі, больш ахвотна ішлі на заключэнне дагавораў, паколькі перасталі быць прывязанымі да часу прыбыцця трактара для збору адходаў. А гэта значыць, што значна менш бытавога шкла ці пластыку трапіць на несанкцыянаваныя звалкі. Дарэчы, у выніку завяршэння мясцовай ініцыятывы «Жыць у экагарадзе» быў створаны і сайт «Браслаў-камунальнік» з інтэрактыўнай картай, дзе кожны можа праінфармаваць камунальную службу аб непрывабнай і шкоднай для экалогіі звалцы і пакінуць свой электронны зварот.

## КАЛІ ЧАКАЦЬ НЕМАГЧЫМА

### Як не застацца без хуткай дапамогі?

Старшы фельчар аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі Жыткавіцкага раёна Леанід Жогаль расказаў карэспандэнту **газеты «Новае Палессе»** пра асаблівасці работы.

У снежні трэснуў мост цераз Прыпяць, які звязвае Тураў з «вялікай зямлёй». А ў студзені сплыў і пантонны мост, які часова пабудавалі. Як гэтыя праблемы адбіліся на рабоце хуткай дапамогі? «Вядома, ніхто не застаўся без медыцынскай дапамогі, — тлумачыць Леанід Жогаль. — У Тураве для абслугоўвання зарэчнай зоны ў нас працуе брыгада «хуткай», укамплектаваная ўсім неабходным абсталяваннем і лекамі. Пры неабходнасці, і такія выпадкі былі, хворых, якія маюць патрэбу ў шпіталізацыі, перапраўляем катарам на другі бок, дзе іх забірае жыткавіцкая брыгада. Акрамя таго, заключана партнёрская дамова з бальніцамі суседніх — Столінскага, Мазырскага і Лельчыцкага — раёнаў».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# Капітальны рамонт ці мадэрнізацыя?

### Мадэрнізацыя? Прыйдзецца раскашэліцца

Да нядаўняга часу цеплаізаляцыя ўваходзіла ў склад капітальнага рамонту. Гэтыя два паняцці не адразу былі размежаваны, тлумачыць **генеральны дырэктар аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гродзенскай вобласці» Алег ШАФРАНСКІ.** Мадэрнізацыю маглі ўключыць у звыклы капрамонт, калі жыхары скардзіліся на тое, што дом стары і спажывае вельмі шмат цяпла. Але потым камунальнікі разабраліся, што гэта не зусім справядліва. Сродкі на такія работы жыхары не адлічваюць, а затраты высокія. І гэту практыку спынілі, спасылаючыся на заканадаўства.

Праўда, за сродкі капітальнага рамонту дазваляецца правесці лакальнае ўцяпленне там, дзе ёсць факты прамярзання, напрыклад, тарцовых сцен ці вуглоў. Толькі гэта не зусёды вырашае праблему, бо жыхары па большай частцы патрабуюць менавіта цеплаізаляцыю. Маўляў, мы ж плацім за рамонт жылога фонду!

— Але ў нашых «жыроўках» няма такога артыкула, як мадэрнізацыя, а ёсць толькі адлічэнні на капітальны рамонт, а ён прадугледжвае аднаўленне страчаных характарыстык дома, — адзначае кіраўнік абласной камунальнай службы. — Мадэрнізацыя — гэта якасна іншы ўзровень дома. Гэты від работ павінен праводзіцца за сродкі жыхароў. Механізм такога ўдзелу распрацоўваецца.

### Адновяць комплексна

А вось на капітальны рамонт па-ранейшаму можна спадзявацца, запэўніў Алег Шафранскі. Жыллёвы фонд, які знаходзіцца на абслугоўванні менавіта ЖЭСаў, мае ўсе падставы атрымаць комплексны рамонт — гэта значыць, даволі грунтоўны. Сюды ўваходзяць і дах, і сцены, і цеплавузлы, і інжынерныя сеткі... Да аднаўлення жыллёвага фонду далучыліся мясцовыя ўлады. Калі раней спісы дамоў складалі самі камунальнікі,




цяпер гэты пералік зацвярджаецца рашэннем рай-, гарвыканкамаў. Гэта дазваляе больш аб'ектыўна падыйсці да справы і ажыццяўляць кантроль за ходам рамонтных работ.

— Увогуле, мы павінны ўкладваць не менш за 140 рублёў на кв. м. Гэта нямала. На сённяшні дзень дасягнулі ўзроўню ў 812 рублёў у сярэднім па вобласці. Калі дзесьці ідзе рамонт за малыя грошы, мы аналізуем: а чаму дом паставілі на комплексны рамонт? Чаму такі малы аб'ём работ? — задаецца пытаннем Алег Шафранскі. — Калі ўжо пачалі комплексны рамонт, трэба зрабіць яго поўнасцю. Бо чалавек плаціць за гэту паслугу. У цэлым фінансаванне капітальнага рамонту складаецца напалову з адлічэнняў жыхароў і бюджэтных сродкаў.

> Пакуль работы па аднаўленні жылога фонду вядуцца з адставаннем. Людзі на працягу доўгіх гадоў чакаюць рамонту, але так яго і не атрымліваюць. У ЖКГ мяркуюць выправіць сітуацыю і сваё абавязацельствы выканаць.

### Рамонт па факце

Таварыствы ўласнікаў — прыклад таго, што жыхары самі могуць паклапаціцца аб стане свайго дома і правесці рамонт самастойна. Бо сродкі на капітальны рамонт паступаюць на разліковы рахунак таварыства. Напрыклад, нарматыўны тэрмін ужо дазваляе зрабіць рамонт даху, але ён знаходзіцца ў добрым стане. Затое тынкоўка адвалілася. Уласнікі вырашаюць аднавіць сцены. Рашэнні прымае агульны сход таварыства, згодна з якім шукаюць падрадчыкаў і самі аплачваюць работу.

— Мы можам праводзіць капітальны рамонт самастойна, — адзначае старшыня жыллёва-будаўнічага кааператыва Сяргей Марцінчык. — Пакуль такой патрэбы няма, бо дом адносна новы, пабудаваны 15 гадоў таму. Але на нашым рахунку дастаткова сродкаў для рамонту. Грошы ляжаць на дэпазіце, і працэнты таксама выкарыстаем у гэтых мэтах. У нас усё празрыста, і на рашэнне сходу можа паўплываць кожны член таварыства.

Па словах Сяргея Марцінчыка, такі падыход выгадны для мясцовых улад, бо рамонт вядзецца толькі на сродкі членаў таварыства, а не з прыцягненнем бюджэтнага фінансавання. Ён лічыць, што сістэма адлічэнняў на капітальны рамонт наогул не зусім адпавядае часу.

> Усё павінна аплачвацца па факце. Напрыклад, дзяржава дае пазыку, і кожны жыхар аднаўленага дома паступова, за 3—5 гадоў, разлічваецца за рамонт. Тое, што маем зараз — не зусім справядліва, бо плаціць усе, а рамонту так і не могуць дачакацца.

У сваю чаргу, самі камунальнікі таксама здымаюць з сябе паўнамоцтвы. Як адзначыў Алег Шафранскі, у ЖКГ няма на балансе дамоў, бо амаль увесь жыллёвы фонд прыватызаваны. Таму цяпер гэта калектыўная ўласнасць, і жыхары могуць самі вырашаць лёс свайго дома. Вось толькі навошта, калі ў «жыроўкі» па-ранейшаму ўваходзіць плата за капітальны рамонт?

### Пад'езды — на жыхарах, двор — на ЖЭСе

Згодна з Жыллёвым кодэксам, пад'езды дамоў выведзены з бягучага рамонту і аднаўляюцца толькі за кошт жыхароў. Гэта станоўчы фактар, лічыць кіраўнік абласной ЖКГ, бо стала менш праяўленняў вандалізму. Хоць жыхары часам скардзяцца на якасць рамонту.

— Нішто не перашкаджае ім самім наняць спецыялістаў, напрыклад, прыватныя фірмы, — кажа Алег Шафранскі. — Жыхары таксама могуць звярнуцца ў ЖЭСы, дзе ім падлічаць расходы і выканаюць работу.

Ініцыятывы ад камунальных службаў чакаць не прыходзіцца. ЖЭС не прыйдзе і не зробіць рамонт у пад'ездзе, як гэта было ў савецкія часы. За ім захавалася тэхнічнае абслугоўванне — падрыхтоўка да зімы, ізаляцыя, замена сальнікаў, ліквідацыя цечы, іншыя дробныя работы. На кожны дом ёсць свая тэхналагічная карта.

Падлічана, што рамонту патрабуюць каля 1 тысячы пад'ездаў. Усе яны будуць аднаўляцца за кошт жыхароў. Стаіць задача прывесці ўсе пад'езды ў парадак. Работа вядзецца згодна з планам. Плата за рамонт упісваецца ў «жыроўку».

Што датычыць прыдамавых тэрыторый, тут падыход іншы. Раней гэта тэрыторыя ўваходзіла ў склад тэхнічнага абслугоўвання і агульную кватплату, але цяпер уборка двара, размяшчэнне дзіцячых пляцовак поўнасцю вядзецца за кошт бюджэту. Гэта абавязак мясцовых улад.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).*



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 1 лютага 2018 года.**